Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

27 МАЯ 2008 г.
АЎТОРАК
№ 96
(26209)

Кошт 490 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.

Нарматыўна-прававы акт па пашырэнні паўнамоцтваў КС павінен быць прадстаўлены Прэзідэнту Беларусі ў чэрвені

Канстытуцыйны суд Беларусі неабходна надзяліць дадатковымі паўнамоцтвамі, каб максімальна эфектыўна задзейнічаць яго патэнцыял. Такую думку 26 мая выказаў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка на нарадзе па пытанні ўдасканалення дзейнасці Канстытуцыйнага суда.

«Мая пазіцыя застаецца нязменнай: нам неабходна больш шырока выкарыстаць патэнцыял Канстытуцыйнага суда, высокі прафесіяналізм яго суддзяў», — заявіў Аляксандр Лукашэнка.

На думку кіраўніка дзяржавы, пашырэнне паўнамоцтваў Канстытуцыйнага суда пойдзе толькі на карысць краіне, дасць магчымасць вырашаць самыя складаныя юрыдычныя пытанні, непасрэдна звязаныя з забеспячэннем правоў і свабод грамадзян, работай дзяржаўных органаў.

У час абмеркавання прагучалі розныя пункты гледжання наконт мэтазгоднасці пашырэння паўнамоцтваў КС. Прапаноўвалася актывізаваць удзел Канстытуцыйнага суда ў нарматворчай дзейнасці, асабліва на стадыі распрацоўкі законапраектаў, праверцы іх канстытуцыйнасці да падпісання кіраўніком дзяржавы. Канстытуцыйны суд таксама выступіў з ініцыятывай праверкі па прапанове Савета Рэспублікі фактаў сістэматычнага або грубага парушэння мясцовымі Саветамі дэпутатаў патрабаванняў заканадаўства. Разглядалася таксама магчымасць змянення структуры Канстытуцыйнага суда і іншыя прапановы.

Удзельнікі нарады выказалі апаску, што ў выніку надзялення Канстытуцыйнага суда дадатковымі функцыямі адбудзецца перасячэнне паўнамоцтваў і будзе закранута кампетэнцыя іншых структур. Прэзідэнт падкрэсліў, што гэтага ні ў якім выпадку нельга дапусціць.

Кіраўнік дзяржавы звярнуў асаблівую ўвагу на тое, што пры пашырэнні паўнамоцтваў Канстытуцыйнага суда не павінен парушацца ўстаноўлены ў краіне баланс не толькі ўнутры судовай сістэмы, але і дзяржаўнай улады ў цэлым. «Безумоўна, пашырэнне паўнамоцтваў Канстытуцыйнага суда неабходна. Але рабіць гэта трэба далікатна: такім чынам, каб выключыць умяшанне суда ў дзейнасць іншых дзяржаўных органаў, не дапусціць умяшання ў Канстытуцыю і парушэння прынцыпу раздзялення ўладаў», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Кіраўнік дзяржавы таксама засяродзіў увагу ад магчымага ўзнікнення сітуацыі, калі КС будзе займацца разглядам вялікага патоку дробных пытанняў.

Адной з важных задач КС Аляксандр Лукашэнка бачыць кантроль за дзейнасцю праваахоўнай сістэмы Беларусі. КС таксама павінен больш актыўна прымаць удзел у нарматворчай дзейнасці. На думку Прэзідэнта, толькі калі на практыцы будуць рэалізаваны абодва гэтыя напрамкі дзейнасці Канстытуцыйнага суда, тады можна будзе гаварыць і аб іншых дадатковых яго паўнамоцтвах.

Паводле слоў Аляксандра Лукашэнкі, усе прапанаваныя ініцыятывы павінны быць дакладна вывераны, узважаны і гарманічна ўпісвацца ў існуючы дзяржаўны механізм. «Ніхто не павінен нас потым папракнуць у тым, што Канстытуцыйны суд выйшаў за рамкі свайго прававога поля», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Прэзідэнт адзначыў, што ў абноўленым складзе Канстытуцыйнага суда дзейнічаюць вопытныя юрысты, і няма сумненняў у тым, што яны могуць вырашаць і больш складаныя задачы. КС неабходна «дагрузіць», але трэба прадумаць, якімі менавіта пытаннямі, дадаў Прэзідэнт. У той жа час, паводле яго слоў, ёсць напрамкі ў дзейнасці КС, па якіх работа гэтага дзяржоргана магла б быць больш эфектыўнай.

Пры гэтым кіраўнік дзяржавы лічыць, што мэтазгодна пачаць рэалізоўваць новыя напрамкі дзейнасці Канстытуцыйнага суда на практыцы паступова, праз асобныя нарматыўна-прававыя акты Прэзідэнта, а не агульна праз прыняцце новых законаў. «Давайце адпрацуем на працягу года-двух патрэбныя нам нормы на практыцы, паглядзім, як яны працуюць, а затым, улічваючы існуючы вопыт, прымем адпаведныя законы», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт даручыў падрыхтаваць і ў чэрвені прадставіць яму на разгляд нарматыўна-прававы акт, у якім будзе адлюстравана пашырэнне паўнамоцтваў і сферы дзейнасці Канстытуцыйнага суда.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

АПОШНІ ЗВАНОК — ПЕРШЫЯ ІСПЫТЫ

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Кульмінацыяй развітання з ліцэем у дзень апошняга званка 217 выпускнікоў другога Мінскага ліцэя выпусцілі ў неба паветраныя шары.

Першы выпускны экзамен па матэматыцы ў Зялёнкаўскай сярэдняй школе Полацкага раёна здаюць вучні дзесятага класа. На першым плане Таццяна ІВАНОВА.

Конкурсныя іспыты ў гімназіях для паступаючых у 5-я класы пройдуць 27—31 мая

Конкурсныя іспыты ў беларускіх гімназіях для паступаючых у 5-я класы пройдуць з 27 па 31 мая, паведаміла карэспандэнту БЕЛТА намеснік начальніка ўпраўлення агульнай і сярэдняй адукацыі Міністэрства адукацыі Валянціна Маеўская.

У першы дзень вучням трэба будзе напісаць дыктант па беларускай мове, 29 мая — рашыць кантрольную работу па матэматыцы, а 31 мая — дыктант па рускай мове. Валянціна Маеўская адзначыла, што ўсе заданні складзены на падставе пройдзенага матэрыялу ў пачатковай школе. У кантрольнай рабоце па матэматыцы ёсць пытанні не толькі на падлік, але і на кемлівасць, якія сустракаліся ў чацвёртым класе, а дыктант — гэта самая звычайная форма кантролю па мовах у пачатковай школе. Залічэнне гімназістаў у навучальную ўстанову праводзіцца да 5 чэрвеня.

Паступіць у гімназічны пяты клас або гімназію можа любы жадаючы пасля заканчэння пачатковай школы і пры паспяховай здачы трох іспытаў. Дзеці, якія навучаліся ў пачатковай школе пры гімназіі, ніякіх прывілей не маюць — яны здаюць іспыты нараўне з астатнімі, залічэнне праводзіцца на агульным конкурсе. Летам 2007 года для паступлення ў гімназіі Мінска трэба было набраць 23—25 балаў з 30 магчымых, у рэгіёнах — 19—23 балы.

СА «ЗВЯЗДОЙ» — У ДРУГІМ ПАЎГОДДЗІ!

Ідзе падпіска на II паўгоддзе і III квартал 2008 года

Падпісныя цэны на газету «Звязда» (у рублях)

Індэкс	на 1 месяц	на 3 месяцы	на 6 месяцаў
63850 (індывідуальны)	9200	27600	55200
63145 (індывідуальны льготны для пенсіянераў, ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны)	8700	26100	52200
63858 (ведамасны)	14700	44100	88200
63239 (ведамасны льготны для ўстаноў міністэрстваў культуры, адукацыі і аховы здароўя)	13400	40200	80400

Кампетэнтна

Канфіскацыя колаў: далікатна і без праколаў

Як пакараць безнадзейнага п'яніцу і не пакрыўдзіць невінаватага ўладальніка аўтамабіля?

Непрыемны сюрпрыз рыхтуецца для аматараў сесці за руль. Вадзіцеляў, якіх паўторна на працягу года затрымаюць нецвярозымі падчас кіравання транспартным сродкам, па ініцыятыве Міністэрства ўнутраных спраў прапануецца пазбаўляць не толькі правоў, але і колаў. Адпаведны законапраект ужо рыхтуецца. Распрацоўшчыкі плануюць як мага хутчэй унесці яго на разгляд парламента, каб астудзіць пыл выпівохаў. Зрэшты, горкае пахмелле чакае не толькі п'яных кіроўцаў. Застацца без «жалезных коней» могуць і асобы, якія неабачліва перададуць ключы ад сваіх аўтамабіляў ці матацыклаў прыхільнікам «зялёнага змія».

Больш падрабязна пра планаемыя канфіскацыйныя меры агляднік «Звязды» папрасіў распавесці начальніка ўпраўлення Дзяржаўтаінспекцыі МУС краіны Аляксандра МЕНДЗЕЛЕВА.

— Аляксандр Міхайлавіч, прайшоў толькі 1 год і 2 месяцы, як была ўведзена крымінальная адказнасць за паўторнае на працягу года кіраванне транспартным сродкам у нецвярозым стане. Чаму МУС выступіла з ініцыятывай замяніць гэтую меру пакарання на іншую, звязаную з канфіскацыяй аўтамабіля ці матацыкла?

— Увядзенне крымінальнага пакарання не стала стрымліваючым фактарам для аматараў выпіць за рулём. Больш за тое, апошнім часам назіраецца трывожная тэндэнцыя да павелічэння іх колькасці. Летась намі было выяўлена больш за тысячу вадзіцеляў, якія паўторна на працягу года кіравалі транспартным сродкам у нецвярозым стане. Столькі ж падобных парушальнікаў затрымана ўжо за 5 месяцаў гэтага года.

Летась намі было выяўлена больш за 1 тысячу вадзіцеляў, якія паўторна на працягу года кіравалі транспартным сродкам у нецвярозым стане. Столькі ж падобных парушальнікаў затрымана ўжо за 5 месяцаў гэтага года.

— Магчыма, вашы падначаленыя сталі больш актыўна змагацца з п'янствам за рулём?

— Прычына не ў тым, што Дзяржаўтаінспекцыя пачала лепш працаваць у гэтым накірунку. Мы і раней не давалі спуску такім горакіроўцам. Але, на жаль, іх колькасць не зменшылася. Многія вадзіцелі не робяць належных высноў і, вобразна кажучы, упарта наступаюць на адны і тыя ж граблі.

— Як вы лічыце, чаму ні буйныя штрафы, ні нават пагроза апынуцца за кратамі не спыняюць выпівохаў?

— Шчыра кажучы, мы спадзяваліся, што пасля ўвядзення крымінальнага пакарання многія аматары выпіць за рулём працверазеюць. Аднак гэтага не атрымалася. Выпівохі хутка адаптаваліся і да гэтых санкцый. Тым больш, што не ўсе вінаўныя за паўторнае кіраванне транспартным сродкам у нецвярозым стане трапляюць за краты, ды і штрафы падчас атрымліваюць адносна невялікія: ад 465 тысяч да 1 мільёна. Мы за менш небяспечныя парушэнні Правілаў дарожнага руху падчас караем больш сурова.

— Цікава, чым тлумачацца такія мяккія прысуды?

— Сітуацыі бываюць розныя. Напрыклад, аднаго выпівоху, які кіраваў шыкоўным джыпам, коштам не адзін дзесятак тысяч долараў, суд аштрафаваў на 900 тысяч рублёў. Паблажлівы прыгавор быў вынесены зыходзячы з таго, што кіроўца афіцыйна лічыцца... беспрацоўным і ў яго, маўляў, няма грошай на выплату большай сумы штрафу.

Дарэчы, як сведчыць сёлетняя практыка прымянення крымінальнага пакарання ў дачыненні да вадзіцеляў-выпівохаў на Брэстчыне (звесткі па астатніх рэгіёнах яшчэ не прааналізаваны), менавіта беспрацоўныя найчасцей затрымліваюцца за рулём у нецвярозым стане. Яны складаюць 49,5 працэнта ад агульнай колькасці такіх парушальнікаў, на другім месцы ў гэтым ганебным рэйтынгу работнікі дзяржаўных прадпрыемстваў — 27 працэнтаў, на трэцім — «прадстаўнікі» прыватнага сектара (12,5 працэнта), на чацвёртым — працаўнікі сельскай гаспадаркі (11 працэнтаў). Найчасцей такія парушэнні здзяйсняюць асобы ва ўзросце старэй за 21 год — 85 працэнтаў ад агульнай колькасці, вадзіцелі ад 18 да 21 года — 14 працэнтаў, кіроўцы ад 16 да 18 гадоў — 1 працэнт.

— А вы ўпэўнены, што перспектыва застацца без «жалезнага каня», больш напалохае злосных п'яніц, чым пагроза арышту ці штрафу?

— Прагнозы, як вядома, справа няўдзячная. Дакладны адказ на гэтае пытанне можна будзе даць толькі пасля абагульнення практыкі прымянення канфіскацыйнай меры. Мы спадзяёмся, што яна будзе больш эфектыўнай, чым існуючае крымінальнае пакаранне.

(Заканчэнне на 5-й стар.)

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

РАСІЯНЕ ГАТОВЫЯ ВЫКАРЫСТАЦЬ СЕВАСТОПАЛЬ ЯК НОВЫ СРОДАК ЦІСКУ НА ЎКРАІНУ

Лёс мэра Масквы Юрыя Лужкова, нядаўна абвешчанага персонай нон-грата ва Ўкраіне, могуць падзяліць 68 працэнтаў грамадзян Расіі. Як сведчаць вынікі апытання Усерасійскага цэнтра даследавання грамадскай думкі, менавіта такая колькасць расіян падзяляе меркаванне сталічнага граданачальніка адносна Севастопаля.

Нагадаем, Юрый Лужкоў заклікаў паставіць пытанне аб вяртанні гэтага горада Расіі. Паміж тым, паводле апытання, правы Ўкраіны на гэты горад прызнаюць толькі 5 працэнтаў расіян. Пры гэтым 56 працэнтаў лічаць, што «Севастопаль першапачаткова быў расійскім горадам». У той жа час цалкам на баку Юрыя Лужкова толькі 41 працэнт грамадзян Расіі. Сярод іх найбольш актыўна пазіцыю мэра падтрымалі ў абедзвюх расійскіх сталіцах (па 55 працэнтаў у Маскве і Санкт-Пецярбургу), а таксама на вёсцы (39 працэнтаў). Не вялікую патрэбу ў Севастопалі маюць толькі 5 працэнтаў расіян. Аднак яны лічаць, што пытанне аб яго дзяржаўнай прыналежнасці «варта падняць у сітуацыях, калі патрэбныя спосабы ціску на Ўкраіну ў іншых важных пытаннях, такіх, як цана на газ і таму падобнае». У выбары паміж «добрымі адносінамі Расіі і Ўкраіны» і вяртаннем Севастопаля, расіяне аддаюць перавагу апошняму.

САПЕРНІКІ СААКАШВІЛІ АДКЛАЛІ МІТЫНГІ НА ЧЭРВЕНЬ

Прадстаўнікі «Аб'яднанай апазіцыі», якія 26 мая арганізавалі шматтысячны мітынг перад будынкам парламента ў Тбілісі, вырашылі спыніць акцыю пратэсту і разысціся, паведамляе ІА «Навіны-Грузія».

Лідар апазіцыянераў, былы кандыдат у прэзідэнты Леван Гачэчыладзэ заклікаў сваіх прыхільнікаў вярнуцца на тое ж месца 10 чэрвеня, калі дэпутаты новага склікання плануюць прыступіць да працы. Паводле задумы лідара апазіцыі, у гэты дзень пратэстуючыя павінны будуць блакіраваць усе падыходы да парламента. Нагадаем, што, паводле інфармацыі цэнтрвыбаркама, «Аб'яднаная апазіцыя» прайграла нядаўнія выбары ў парламент кіруючай партыі «Адзіны нацыянальны рух», лідарам якой з'яўляецца прэзідэнт рэспублікі Міхаіл Саакашвілі. Апазіцыянеры заявілі, што афіцыйныя вынікі падтасаваныя.

Каровіная пераправа

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Пенсіянеры вёскі Харомск Столінскага раёна з-за адсутнасці пашы вымушаны перапраўляць жывёлу цераз раку на заліўныя лугі, а паколькі моста паблізу няма, пераправа адбываецца вось такім чынам. «Напэўна, апошні год я трымаю карову, — сказаў колішні калгасны трактарыст, 71-гадовы Зоцік Ігнатавіч Украінец, вяслуючы лодку на процілеглы бераг. — Хіба лёгка даецца нам гэтае малако?» Уладзімір ШПАК (на першым плане фотаздымка) адгукнуўся на просьбу аднавяскоўца дапамагчы пераправезці Лыску за Гарынь. Пераправа прайшла паспяхова.

(Працяг чытайце на 3-й стар.)

ISSN 1990 - 763X

9 771990 763008 08096 >

КУРСЫ ВАЛЮТ

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 27.05.2008 г. (для б/н разлікаў)

1 долар ЗША	2 135,00
1 еўра	3 361,98
1 латвійскі лат	4 811,81
1 літоўскі літ	973,77
1 чэшская крона	134,07
1 польскі злоты	987,81
1 расійскі рубель	90,66
1 украінская грыўня	449,95

Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў

Цэнтрабанк РФ

USD	23,5483
10 UAH	49,1029
1000 BYR	11,0200
EUR	37,1357

Курс у гандлёвых кампаніях (на 26.05.2008 г.)

USD	2135 / 2210

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

Падпішыцеся на часопіс «Главный бухгалтер. ГБ» на 2008 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.

ААТ «Агенцтва Уладзіміра Граўцова» УНП 100024047 Ліцэнзія Мінсувязі № 02140/0172806 выд. 03.05.2004 да 02.05.2009

ПАЦЯПЛЕННЕ КЛІМАТУ ТРАПЛЯЕ Ў РАЗРАД ГЛАБАЛЬНЫХ МІФАЎ?

Версіі

Глабальнае пацяпленне занесена зараз у кагорту амаль самых вызначальных тэндэнцый бягучага дзесяцігоддзя. Яно ўжо не існуе як чыста кліматычны феномен, а ператварылася ў з'яву палітычную, сацыяльную і нават культурную. Пацяпленне абмяркоўваюць палітычныя лідары на самых высокіх сустрэчах, аб ім здымаюць шырокафарматныя кінастужкі, за барацьбу з ім даюць Нобелеўскія прэміі, аднак...

Мае суседзі па дачным участку сёлетняй вясной увогуле заблыталіся што і калі садзіць. Летась у апошняй дэкадзе красавіка ў іх зеляніна буяла «па поўнай праграме» нават на адкрытай глебе, а зараз... Кожныя выхадныя яны практычна мерзнуць уначы на сваёй летняй фазэндзе. Калегі па працы ўзгадваюць, што ў іх дзяцінстве ў першай дэкадзе мая распачынаўся купальны сезон, а зараз вакол вадасховішчаў магчыма заўважыць толькі рыбакоў ці маржоў-экстрэмалаў. Што сёлета здарылася з беларускім надвор'ем?

І сапраўды, большасць дзён у маі ў Беларусі назіраўся нязвыклы для гэтай пары года тэмпературны фон, калі сярэднясутачная тэмпература паветра была на 2—5 градусаў ніжэй за норму. Разам з тым, **начальнік службы гідраметэапрагнозаў Рэспубліканскага гідраметцэнтра Дзмітрый РАБАЎ** лічыць, што халаднаватая вясна сёлета яшчэ не сведчыць аб тым, што глабальнае пацяпленне змянілася на пахаладанне. Спецыяліст нагадаў, што ў студзені і люты добрых маразоў і снегу ў Беларусі ўвогуле не было. **Начальнік аддзела клімату Рэспубліканскага гідраметцэнтра Алена КАМАРОЎСКАЯ** ўпэўнена, што мінулая зіма была самай цёплай за апошнія 30 гадоў, за выключэннем сезона 89—90-х гадоў. Па існуючым алгарытме глабальнае пацяпленне ў першую чаргу «падаграе» зімовыя месяцы, а на працягу года павялічвае колькасць анамальных і экстрэмальных з'яў. Спецыялісты лічаць, што халодная вясна ў Беларусі стала толькі чарговай анамальнай кліматычнай з'явай агульнага працэсу глабальнага пацяплення на планеце. Магчыма гэта і так, але...

Запавольванне перад чарговым рыўком?

Англійскія эксперты Нацыянальнай метэаралагічнай службы Злучанага Каралеўства падлічылі, што сярэдняя тэмпература паветра на планеце сёлета будзе ніжэй, чым у мінулыя гады, аднак, гэты сезон павінен увайсці ў дзесятку самых цёплых гадоў. Сусветныя навукоўцы лічаць, што глабальная тэмпература паветра сёлета будзе на 0,37 градуса вышэйшая за сярэднія паказчыкі. Менавіта спецыялісты Вялікабрытаніі ўпэўненыя: тое, што 2008 год хоць і чакаецца халаднейшым за мінулыя 7 гадоў, зусім не азначае, што глабальнае пацяпленне спыніцца і пачнецца глабальнае пахаладанне. На іх погляд, гэта толькі часовае запавольванне хуткасці павелічэння глабальнай тэмпературы.

Пацяпленне спынілася тры гады таму?

Між іншым, раскручаныя заходнімі інфармацыйнымі агенцтвамі прагнозы глабальнага пацяплення могуць аказацца надуманай мыльнай бурбалкай зацікаўленых у кліматычным ажыятажы структур. Днямі група вучоных з германскага Інстытута марскіх навук імя Лейбніца зрабіла сенсацыйную заяву, якую надрукаваў аўтарытэтны часопіс Nature. Нямецкія даследчыкі аб'явілі, што глабальнае пацяпленне скончылася. Спецыялісты з інстытута Лейбніца не аспрэчваюць навуковыя назіранні, якія былі зробленыя на працягу мінулых дзесяцігоддзяў, аднак выказваюць недавер да вельмі катэгарычных прагнозаў істотнага змянення клімату ў бліжэйшыя гады. Вывучаючы змяненні тэмпературы марской вады, германскія спецыялісты вызначылі, што працэс устойлівага павышэння сярэднегадавой тэмпературы зямной атмасферы спыніўся яшчэ ў 2005 годзе і ў бліжэйшыя сем гадоў не адновіцца. Навукоўцы ўпэўнены, што да 2015 года чалавецтва можа дыхаць спакойна. Што будзе надалей, зараз меркаваць яшчэ цяжка: Зямля можа зноў награвацца, а можа і не. Аднак эксперты запэўнілі, што нават калі глабальнае пацяпленне і працягнецца, то прычынай гэтага будуць не парніковыя газы заводаў і аўтамабіляў, а цыклічныя змяненні клімату планеты, якія не маюць ніякіх адносінаў да дзейнасці чалавека.

Існуюць меркаванні, што механізм Кіёцкага пратакола, які прадугледжвае абмежаванне парніковых выкідаў, быў распрацаваны не столькі для спынення наступстваў глабальнага пацяплення, а ў першую чаргу для замаруджвання эканамічнага развіцця краін, якія сёння яшчэ з'яўляюцца буйнейшымі донарамі матэрыяльных і энергетычных рэсурсаў для дзяржаў «залатога мільярда».



Фота БЕЛТА.

22 мая 2008 года...

...у Віцебску

...у Гомелі

Дажджлівы ліпень і спякотны жнівень?

Апраўданасць доўгатэрміновых сінаптычных прагнозаў на сезон зараз у свеце складае каля 60—70 працэнтаў. Разам з тым, сярэднестатыстычныя кліматычныя мадэлі з карэкціроўкай пад уздзеяннем паветраных мас, якія зараз рухаюцца праз тэрыторыю Беларусі, дазваляюць айчынным спецыялістам спадзявацца, што гэтым летам дзённая тэмпература паветра будзе назірацца ў межах ад 18 да 24 градусаў. У асобныя дні пры антыцыкланальным характары надвор'я тэмпература паветра ўдзень будзе дасягаць плюс 30 градусаў і вышэй. Прагназуецца, што за 3 месяцы лета ў нашай краіне выпадзе каля 250 міліметраў ападкаў, што стане ў два разы больш, чым узімку. Разлікі сіноптыкаў паказваюць, што самым дажджлівым месяцам лета сёлета будзе ліпень, а самым спякотным павінен стаць жнівень.

Сяргей КУРКАЧ.

На выхадныя прыгрэе да плюс 23

Аднак у сераду і чацвер уначы магчымы замаразкі да мінус 2

У першай палове тыдня надвор'е ў нашай краіне будзе вызначацца атмасфернымі франтамі з боку Балтыкі, — паведаміў рэдакцыі начальнік службы гідраметэапрагнозаў Рэспубліканскага гідраметцэнтра Дзмітрый РАБАЎ.

Менавіта таму ў аўторак на большай частцы, а ў сераду на ўсходзе краіны, пройдуць кароткачасовыя дажджы. Пахаладае. Тэмпература паветра ўначы 3—9 градусаў, па паўночным захадзе на глебе замаразкі да 0 — мінус 2 градусаў, удзень — ад 12 цяпла па поўначы, да плюс 20 градусаў па поўдні краіны.

У чацвер да нас завітае скандынаўскі антыцыклон, таму ападкі спыняцца і ўсталюецца сонечнае бязвоблачнае надвор'е. Тэмпература паветра ўначы 3—9, месцамі замаразкі да мінус 2 градусаў, удзень — 16—23 цяпла. Потым сярэднясутачная тэмпература пачне павялічвацца. На выхадныя тэмпература паветра ўначы ўсталюецца ў межах 7—13 градусаў, удзень 17—23 цяпла і без дажджоў.

Сяргей КУРКАЧ.

Тэатр оперы і балета Беларусі стане адным з галоўных цэнтраў культурнага жыцця

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка павіншаваў калектывы супрацоўнікаў Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета з 75-годдзем з дня заснавання тэатра.

Мінулыя гады, паводле слоў кіраўніка дзяржавы, сталі для майстроў оперы і балета часам мастацкіх здзяйсненняў і здабывання сусветнай славы. «У нашай краіне сфарміраваўся сапраўды нацыянальны музычны тэатр, пастаўлена мноства цудоўных спектакляў па творах кампазітараў розных краін і эпох, запаліліся яркія зоркі вакальнага і харэаграфічнага мастацтва», — гаворыцца ў віншаванні.

Сёння артысты тэатра дастойна прадаўжаюць багатыя творчыя традыцыі, пакараюць гледачоў самабытным талентам і вельмі высокім выканальніцкім майстэрствам, адзначыў Прэзідэнт. Аляксандр Лукашэнка выказаў упэўненасць, што будынак Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета Рэспублікі Беларусь, які ў хуткім часе будзе адноўлены ва ўсёй красе і велічы, раскрые перад калектывамі новыя магчымасці для творчых пошукаў і адкрыццяў, стане адным з галоўных цэнтраў культурнага жыцця.

Аляксандр Лукашэнка павіншаваў аўтара тэксту гімна Беларусі Уладзіміра Карызну з 70-годдзем

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка павіншаваў лаўрэата Дзяржаўнай прэміі Беларусі Уладзіміра Карызну, аднаго з аўтараў тэксту Дзяржаўнага гімна Беларусі, з 70-годдзем.

У віншаванні, у прыватнасці, гаворыцца: «У нашай краіне і за яе межамі сырокую папулярнасць набылі Вашы цудоўныя патрыятычныя і лірычныя вершы, сотні з якіх пакладзены на музыку і выконваюцца праслаўленымі майстрамі, гучаць на радыё і тэлебачанні».

Прэзідэнт падкрэсліў, што ў рэспубліцы высока цэніцца грамадская дзейнасць паэта, звязаная з захаваннем і ўзбагачэннем лепшых традыцый беларускай літаратуры, заснаваннем Саюза пісьменнікаў Беларусі і арганізацыяй актыўнай работы гэтага аб'яднання.

Аляксандр Лукашэнка пажадаў юбіляру, каб яго творчы шлях і ў далейшым быў плённы, напоўнены новымі паэтычнымі знаходкамі, а таксама здароўя, невычэрпнага натхнення, шчасця і дабрабыту.

Віншаванні з днём нараджэння

Кіраўнік беларускай дзяржавы Аляксандр Лукашэнка павіншаваў прэзідэнта Малдовы Уладзіміра Вароніна з днём нараджэння.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

БЧ павінна актывізаваць інавацыйную дзейнасць

Тэмпы інавацыйнага развіцця Беларускай чыгункі неабходна паскорыць, заявіў сёння прэм'ер-міністр Беларусі Сяргей Сідорскі на нарадзе ва ўпраўленні БЧ у Мінску.

Паводле яго слоў, трэба больш дынамічна нарошчваць экспартны патэнцыял чыгункі, паскорыць працэс абнаўлення яе рухомага саставу, удасканальваць сістэму кіравання перавозкамі. «Беларусь выбрала інавацыйны шлях развіцця. Беларуская чыгунка павінна развівацца не толькі за кошт нарошчвання экспартнага патэнцыялу, але таксама за кошт стварэння сучасных інавацыйных вытворчасцяў», — сказаў прэм'ер-міністр. Сяргей Сідорскі адзначыў, што ступень зносу рухомага саставу БЧ складае 72 працэнты. «У мінулым годзе парк чыгункі абнавіўся ўсяго на 1,46 працэнта, аднак гэтага недастаткова», — заявіў ён. «Многія краіны маюць патрэбнасць у грузавых вагонах і гатовы набываць іх у нас, — сказаў прэм'ер-міністр. — Сярод нашых патэнцыяльных партнёраў — прадпрыемствы Расіі і Казахстана». Асіповіцкі вагонабудаўнічы завод, які ствараецца сумесна з расійскім ЗАТ «Гранд-экспрэс», можа стаць буйным экспарцёрам танкаў-кантэйнераў і грузавых вагонаў. Паводле яго слоў, многія інавацыйныя праекты, якія прапануюцца БЧ, — доўгатэрміновыя. «Ва ўмовах развіцця ў краіне інавацыйнай эканомікі прыярытэт неабходна аддаваць кароткатэрміновым праектам, якія на працягу 1—2 гадоў дадуць высокі эканамічны эфект», — дадаў прэм'ер-міністр.

БЕЛТА.

Славянскі парламенцкі саюз прыняў мадэльныя законы

Дэлегаты сесіі Славянскага парламенцкага саюза, якая праходзіць у Мінску 26-27 мая, прынялі ў другім чытанні праекты законаў аб развіцці турызму паміж славянскімі дзяржавамі і аб недапушчальнасці гандлю людзьмі.

У першым праекце закона асабліва ўвага ўдзелена рэгістрацыі замежных турыстаў па месцы знаходжання.

На думку аўтараў закона, рэгістрацыя не з'яўляецца паслугай, якая прадастаўляецца іншаземцу, і спаганяць за яе плату недапушчальна. Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па міжнародных справах і сувязях з СНД Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі Сяргей Касцян расказаў, што для ўдзелу ў мерапрыемстве ў Мінск запрошаны прадстаўнікі такіх славянскіх дзяржаў, як Украіна, Чэхія, Славакія, Балгарыя, Боснія і Герцагавіна і іншых. Запрошаны таксама прадстаўнікі славянскіх дыяспар з краін Сярэдняй Азіі, Балтыі і з Малдовы.

БЕЛТА.

Бернд Штанге: «Нічыя з Германіяй? Выдатны вынік!»

Сёння ў Кайзерслаўтэрне беларуская зборная па футболе правядзе таварыскі матч з камандай Германіі. Галоўны трэнер нашай каманды Бернд Штанге на прэс-канферэнцыі ў Руйце заявіў, што нічыя ў гэтым матчы была б выдатным вынікам. «Мы пастараемся паказаць добрую гульню. Мы будзем добрым спарынг-партнёрам. Беларусь заўсёды выйгравала, калі рыхтавалася ў Руйце», — цытуюць Б. Штанге на сайце Нямецкага футбольнага саюза.

Да матча з беларусамі рыхтуецца 26 ігракоў зборнай Германіі. Па выніках сустрэчы галоўны трэнер каманды Йоахім Лёў назаве прозвішчы 23 футбалістаў, якія накіруюцца на чэрвеньскі чэмпіянат Еўропы. Паводле дадзеных на 25 мая, не прададзена дзве тысячы білетаў на матч (умяшчальнасць стадыёна ў Кайзерслаўтэрне 47.258 гледачоў). Сваімі меркаваннямі наконт матча напярэдадні падзяліліся нападаючы Віталь Радзівонаў і капітан каманды Аляксандр Глеб.

Віталь РАДЗІВОНАЎ:

— Цікава праверыць свае сілы на ўзроўні такой каманды. І, зразумела, што мне хацелася б паўдзельнічаць у матчы такога рангу. Магчыма, у пачатку сезона я гуляў не вельмі, але зараз паступова набіраю форму. З часам, думаю, усё наладзіцца. Зборная Германіі — адна з лепшых каманд свету. Дагэтуль гуляць супраць такіх футбалістаў, як абаронцы каманды Германіі, мне даводзілася хіба што на прыстаўцы...

Аляксандр ГЛЕБ:

— Матч з Германіяй для мяне зараз самы важны. Лічу, што такога саперніка ў нашай зборнай яшчэ не было. Я спадзяюся, што зборная пакажа сябе з лепшага боку, і надалей такія каманды, як Германія, Італія, Англія будуць запрашаць нас на таварыскія гульні. Гэта было б выдатна! Свой сезон не лічу закончаным, пакуль не згуляю гэты паядынак. І я да яго рыхтаваўся. Толькі пасля — на адпачынак.

Алена АЎЧЫННІКАВА.

Акцыі

ЭКСПЕДЫЦЫЯ... ПА ЗДАРОЎЕ!

Водная экспедыцыя «Будзь здаровай, Беларусь», прысвечаная Году здароўя, стартуе 31 мая ў вёсцы Дубоі Пінскага раёна.

Агульная працягласць маршруту, які экіпаж яхты «Газета «Рэспубліка» і судоў суправаджэння пройдуць па рэках Піна, Гарынь і Прыпяць, складае 450 кіламетраў.

— Мы праводзім нашу акцыю сумесна з Белтэлерадыёкампаніяй, міністэрствамі прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя, інфармацыі, спорту і турызму, аховы здароўя, Брэсцкім і Гомельскім аблвыканкамамі, — паведаміў на прэс-канферэнцыі ў Грамадскім прэс-цэнтры намеснік галоўнага рэдактара газеты «Рэспубліка» Сяргей Міховіч. — Адна з задач нашай экспедыцыі — папулярызацыя і прапаганда здарового ладу жыцця, таму ў гарадах і пасёлках на шляху нашага следавання будуць ладзіцца фестывалі здароўя. Удзел у спартыўна-культурнай праграме возьмуць футбольная каманда зорак беларускай эстрады «АртСтарс», дзяржаўны ансамбль «Песняры», Анатоль Ярмоленка і аркестр Гомельскай філармоніі, ансамбль народнай песні «Бяседа», арт-група «Беларусы», артысты прадзюсарскага цэнтра «Спамаш», а таксама мастацкія калектывы Брэсцкай і Гомельскай абласцей.

Яшчэ адна задача экспедыцыі — навядзенне парадку на зямлі, паляпшэнне экалагічнай абстаноўкі Палесся і папулярызацыя яго турыстычных маршрутаў. Паводле слоў першага намесніка міністра прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Аляксандра Апацкага, па папярэдніх звестках, экалагічная сітуацыя з воднымі рэсурсамі на Прыпяці, Нёмане і Заходняй Дзвіне апошнім часам прыкметна палепшылася, і ў гэтым эколагі збіраюцца яшчэ раз пераканацца падчас свайго ўдзелу ў экспедыцыі (падчас воднай вандроўкі будуць бракца для даследавання ўзоры вады).

Немалаважны пункт праграмы — работа выязных медыцынскіх прафесарскіх брыгад Беларускай медыцынскай акадэміі паслядыпломнай адукацыі. Самы прадстаўнічы прафесарскі дэсант высадзіцца 9 чэрвеня ў Тураве: у складзе медыцынскай брыгады будуць працаваць спецыялісты ўралагічнага, гінекалагічнага, эндакрыналагічнага, фізіятэрапеўтычнага профіляў, дыетолаг-гастраэнтэролаг, рэабілітолаг і ўрач-гігіеніст, які збіраецца даследаваць структуру харчавання тураўчан. Там жа, у Тураве, будуць арганізаваны два «гарачыя» тэлефоны па пытаннях прафілактыкі і лячэння мочакаменнай хваробы і праблемах залішняй вагі.

Акрамя таго, медыкі збіраюцца наведаць Нароўлю, дзе мясцовых жыхароў будуць кансультаваць урачы-анколагі, і Давыд-Гарадок, куды накіруюцца тэрапеўты і траўматолагі-артапеды.

Дабрачынную частку праграмы падтрымалі Мінтранс, Дзяржпаграніцкамітэт, Федэрацыя прафсаюзаў Беларусі, Беларускае таварыства Чырвонага Крыжа, Беларускі фонд міру і шэраг прадпрыемстваў і арганізацый усіх формаў уласнасці.

Экспедыцыя «Будзь здаровай, Беларусь» наведае Пінск, Давыд-Гарадок, Мікашэвічы, Тураў, Петрыкаў, Мазыр і 21 чэрвеня фінішуе ў Нароўлі.

Надзея НІКАЛАЕВА.

СТАЎРАПОЛЬСКІ КРАЙ УЗНАЧАЛІЎ НАШ ЗЯМЛЯК

Размова ідзе пра Валерыя Гаеўскага, які нарадзіўся ў 1958 годзе ў беларускім горадзе Петрыкаве. За яго плячыма Маскоўскі геолагаразведачны інстытут і Стаўрапольскі дзяржаўны ўніверсітэт, работа ва ўрадзе названага краю і міністэрстве рэгіянальнага развіцця Расійскай Федэрацыі. Кандыдат эканамічных навук, кавалер ордэна Пашаны.

Уладзімір ПЕРНІКАЎ.

ЗАГІНУЛІ ПАСАЖЫРЫ «ФОЛЬКСВАГЕНА»

Буйное дарожна-транспартнае здарэнне, у якім загінулі чацвёра чалавек, у мінулую суботу адбылося на дарозе паблізу гарадскога пасёлка Плешчаніцы. Каля паловы адзінаццатай раніцы вадзіцель грузавога аўтамабіля «МАН» выехаў на сустрэчную паласу руху, дзе сутыкнуўся з «Фольксвагенам», якім кіраваў 20-гадовы мінчанін. Для вадзіцеля апошняга аўтамабіля, а таксама трох яго пасажыраў — 54-гадовай маці кіроўцы, 58-гадовай пенсіянеркі і 51-гадовага мужчыны — ДТЗ скончылася трагічна. Яны загінулі на месцы.

Дзмітрый СТАНКОВІЧ.

У ГРОДНЕ «ЗАТРЫМАНЫ» НАРКОТЫКІ

Аператыўная група Камітэта дзяржбяспекі выявіла ў Гродне каля тысячы таблетак псіхатропнага рэчыва. У адносінах да затрыманых траіх жыхароў Гродна і грамадзяніна Польшчы ўзбуджана крымінальную справу. Выяўленне такіх буйных партый стала магчымым дзякуючы сістэмнай рабоце па выяўленні каналаў кантрабанды наркотыкаў. Дарэчы, спробы злачынных груповак па наладжванні каналаў кантрабандных пастаўкі сінтэтычных наркотыкаў і псіхатропных рэчываў у Беларусь з суседніх Польшчы і Літвы не спыняюцца. Толькі ў першым квартале гэтага года органамі дзяржбяспекі краіны ўзбуджана 26 крымінальных спраў.

Святлана БАРЫСЕНКА.

Абзац

■ Азербайджан зацікаўлены пастаўляць каньяк на беларускі рынак. Аб гэтым сказаў Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Азербайджана ў Беларусі Алі Тэймур аглы Нагіеў. «Думаю, гэты тавар знойдзе свой попыт у краіне», сказаў дыпламат. За апошнія тры гады тавараабарот паміж краінамі павялічыўся больш чым утрая.

■ **Штодзень паслугамі мінскага метро карыстаюцца больш 700 тыс. чалавек. Летась гэтым відам транспарту скарысталіся 262,1 млн чалавек, або 11,5 працэнта ад агульнага аб'ёму ўнутрыгарадскіх перавозак.**

■ У Беларусі завершана амністыя, якая праводзілася сёмы раз. Канчатковыя даныя будуць абнародаваны ў бліжэйшы час. Планавалася, што ў выніку амністыі ад адбывання пакарання будуць вызвалены каля 1,7 тыс. чалавек з папраўчых устаноў закрытага тыпу і амаль 850 чалавек з папраўчых устаноў адкрытага тыпу. Амністыя дасць магчымасць скараціць расходы на ўтрыманне зняволеных амаль на Br2 млрд.

■ **Больш за 40 чалавек давялося эвакуяваць мінулай ноччу супрацоўнікам Віцебскага гарадскога аддзела па надзвычайных сітуацыях з-за пажару ў размеркавальным шчыце на 4-ым паверсе пяціпавярховага дома. Моцнае задымленне складала пагрозу жыццю і здароўю людзей. Паводле папярэдняй інфармацыі, прычынай пажару стала парушэнне правілаў бяспекі пры мантажы электраабсталявання. На ўчарашнюю раніцу без электразабеспячэння засталіся каля 150 жыхароў дома.**

■ У Гомелі а палове другой ночы былі затрыманы выконваючы абавязкі начальніка службы бяспекі турыстычна-экскурсійнага прадпрыемства, двое супрацоўнікаў службы бяспекі і пакаёўка гасцініцы «Турыст». Як мяркуецца, гэтыя асобы наладзілі «бізнэс» «жывым таварам». Падазраюцца яны ў тым, што з лютага па май гэтага года з карыслівай мэтай выкарыстоўвалі для занятку прастытуцыяй гомельскіх дзяўчат.

■ **Лясны пажар утаймоўваюць выратавальнікі Эстоніі. Агнём ахоплена больш за 750 гектараў. Агонь хутка распаўсюджваецца з-за моцнага ветру і сухога надвор'я.**

■ У аэрапорце Бруселя грузавы самалёт «Боінг-747» пры ўзлёце з'ехаў з узлётна-пасадачнай паласы і разваліўся папалам. У самалёце знаходзіліся пяць чалавек, яны сур'ёзна не пацярпелі. Прычыны аварыі высвятляюцца.

■ **У Віцебскай вобласці жывуць не менш як 150 асобін бурых мядзведзяў. Яшчэ некалькі гадоў таму было 4 міні-папуляцыі — бярэзінская, бабінавіцкая, суражкая і паўночная. А зараз бурыя мядзведзі ёсць ва ўсіх лясгасах вобласці. Пашырэнне арэалу адбылося з-за павелічэння іх колькасці. Але вучоныя лічаць, што паляванне на іх не дазволяць, бо гэтыя жывёлы занесены ў Чырвоную Кнігу Беларусі. У мінулым годзе супрацоўнікі «Бярэзінскага біясфернага запаведніка» каля 100 разоў бачылі мядзведзяў.**

■ Акцыі пратэсту аўтааматараў супраць росту цэнаў на аўтамабільнае паліва прайшлі ў некалькіх гарадах Расіі — у Маскве, Санкт-Пецярбургу, Екацярынбургу, Краснаярску, Магадане, Якуцку, Нерунгры, Петрапаўлаўску-Камчацкім, Калузе, Сараташе і іншых. Па меркаванні арганізатараў, выканаўчыя ўлады павінны прыняць меры для таго, каб на ўнутраным рынку кошт аўтамабільнага паліва не наблізаўся да цаны нафты на сусветным рынку.

Поўны абзац

■ **У ноч на нядзелю на Пушкінскай плошчы Масквы конь, кіруемы п'яным вершнікам, разбіў некалькі іншамарак. Паводле слоў прадстаўніка маскоўскай міліцыі, конь пад вершнікам стаў нечакана брыкацца і ўдарыў заднімі нагамі дзве іншамаркі. Кіроўца, які быў у стане алкагольнагаап'янення, не спыняючыся, з месца здарэння знік. Затрымалі яго ў раёне Страснога бульвара, дзе ён паспеў разбіць фары яшчэ аднаго аўтамабіля. Устанаўліваецца, каму належаў конь.**

■ Фірма «Вечнасць», якая займаецца рытуальнымі паслугамі ў Трускаўцы, адкрыла бар з аднайменнай назвай у форме вялізнай труны. Яго даўжыня — 20 м, шырыня і вышыня — па 6 м, выраблена ўстанова з сасновых дошак. Замест сталоў унутры размешчаны труны. Меню ўстановы падрыхтавана для правядзення памінальных дзён.

■ **Пацыент псіхдыспансэра, пераапрануўшыся паставым паліцэйскім, паўгадзіны рэгуляваў рух на праспекце ў адным з прыгарадаў сталіцы Чарнагорыі. Гэта адбылося ў нядзелю ў другой палове дня. 36-гадовы мужчына ў форме паліцэйскага актыўна рэгуляваў рух пры дапамозе рук і жэзла. Ніхто нічога не западозрыў, усе выконвалі патрабаванні рэгуліроўшчыка. Невядома, колькі прастаяў бы «паліцэйскі» на сваім пасту, калі б на скрыжаванні не з'явілася машына паліцыі. Спалохаўшыся, мужчына скінуў фуражку, кінуўся бегчы, але тут жа быў збіты аўтамабілем, які праязджаў міма. Пацярпелага даставілі ў бальніцу са страсеннем мозгу. Там і высветлілася, што ён знаходзіцца на ўліку ў псіхіятрычнай клініцы і не першы раз бярэцца за такі занятак. Свой учынак ён тлумачыць тым, што спрабаваў ажыццявіць сваю мару стаць паліцэйскім.**

Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.

ОАО «Экспериментальный завод им. Н. Гастелло»,
220073, г. Минск, ул. Пинская, 18

Извещение о созыве внеочередного общего собрания акционеров

Собрание состоится 9 июня 2008 г. в 16.00 по адресу: г. Минск, ул. Пинская, 18, актовый зал Общества. Регистрация участников собрания производится в день и по месту проведения собрания с 14.30 до 15.45.

ПОВЕСТКА ДНЯ:

Об увеличении уставного фонда ОАО «Экспериментальный завод им. Н. Гастелло» за счет источников собственных средств.

С информацией (материалами), подлежащей представлению акционерам при подготовке к проведению собрания, акционеры могут ознакомиться ежедневно (кроме субботы и воскресенья), начиная с 4 июня 2008 г., в приемной Общества с 9.00 до 16.00, а в день проведения собрания — по месту его проведения.

Наблюдательный совет ОАО «Экспериментальный завод им. Н. Гастелло».

УНН 100010116

У САЛІГОРСКУ ПАВАЛІЎСЯ ВЕЖАВЫ КРАН

У Салігорску а палове адзінаццатай вечара ў суботу на тэрыторыі будаўнічай пляцоўкі спартыўна-відовішчнага комплексу ўпаў вежавы кран.

Як паведаміў карэспандэнту «Звязды» прэс-сакратар Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Віталь Навіцкі, аварыя здарылася ў той момант, калі кран рухаўся да месца стаянкі. Пры падзенні кран, вышыня якога 35 метраў і грузапад'ёмнасць 10 тон, зачапіў дах рымска-каталіцкага касцёла, пашкодзіўшы яго на плошчы 25 квадратных метраў.

Паводле папярэдняй інфармацыі, машыніст кіраваў кранам у нецвярозым стане. Прычым кіраваў з зямлі пультам, што, дарэчы, па інструкцыі дапускаецца толькі пры мантажы і пры выпрабаваннях. Машыніст, калі кран пад'язджаў да тупіковых упораў, не зрабіў астаноўку, і кран паваліўся. На шчасце, пацярпелых у гэтым здарэнні няма.

Ігар ГРЫШЫН.

САМІ ТРАПІЛІ «ПАД РЭЙКІ»

Трое мужыкоў з Буда-Кашалёўскага раёна, старэйшаму з якіх 34 гады, захацелі разжыцца неблагой сумай.

На пад'язных пуцях Гомельскага радыёзавода, якія праходзілі праз лясны масіў, яны падрыхтавалі для крадзяжу рэйкі і ўжо гатовы былі вывезці метал, ацэнены ў адзін мільён рублёў, ды «халява» не прайшла. Вядзецца следства.

Уладзімір ПЕРНІКАЎ.

Альтэрнатыва дэпазіту

Айчынны рынак прыцягнення часова свабодных грашовых сродкаў гаспадарання апошнім часам значна актывізаваўся. Звязана гэта найперш са змяненнямі ў заканадаўчай базе па падаткаабкладанні даходаў на некаторыя фінансавыя інструменты.

У адпаведнасці з Дэкрэтам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь № 5 ад 20 сакавіка 2008 г. («Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у Дэкрэт Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 23.12.1999 г. № 43») даходы, атрыманыя ад рэалізацыі і пагашэння **аблігацый юрыдычных асобаў**, не абкладаюцца падаткам на даходы. Гэтым жа дакументам зніжаны падатак на даходы па дэпазітных сертыфікатах з 40 працэнтаў да 24.

ААТ «Беларускі Індустрыяльны Банк» у рамках праграмы па прыцягненні часова свабодных грашовых сродкаў суб'ектаў гаспадарання ўжо прыступіў да размяшчэння 1-га выпуску карпаратыўных аблігацый для юрыдычных асобаў. Аб тым, што гэта за каштоўная папера і якія ў яе перавагі перад іншымі інструментамі ўкладання, расказвае **начальнік упраўлення каштоўных папер Юрый ПЛЯВАКА.**

— Паводле класічнага вызначэння, аблігацыя — гэта каштоўная папера, якая пацвярджае абавязацельства эмітэнта вярнуць уладальніку каштоўнай паперы яе намінальны кошт ва ўстаноўлены тэрмін з платай фіксаванага працэнта. Наш банк з мая гэтага года прыступіў да рэалізацыі дысконтных аблігацый, г.зн. аблігацый, якія прадаюцца ніжэй за намінальны кошт і пагашаюцца па намінальным кошце. Галоўнай жа перавагай гэтага фінансавага інструмента ў гэты перыяд часу з'яўляецца вызваленне кліента (інвестара) ад платы падатку на даходы. Да пераваг аблігацыі таксама можна аднесці і тое, што не патрабуецца праходзіць працэдуру адкрыцця дэпазітнага рахунку. Акрамя гэтага, аблігацыі можна датэрмінова пагасіць або перапрадаць на другасным рынку.

— Юрый Васільевіч, які ўзровень даходнасці па аблігацыях прапануе ваш банк і якія асноўныя параметры гэтага выпуску?

— Даходнасць складае 12 працэнтаў гадавых. Выплата даходу па аблігацыях ажыццяўляецца аднаразова, пры іх пагашэнні. Аб'ём эмісіі 1-га выпуску ААТ «Беларускі Індустрыяльны Банк» — сем мільярдаў беларускіх рублёў з намінальным коштам адной паперы сто тысяч беларускіх рублёў. Перыяд размяшчэння — з 19 мая па 14 жніўня 2008 года, а дата пагашэння — 14 мая 2009 года. Пры гэтым уладальнікам аблігацый могуць быць як рэзідэнты, так і нерэзідэнты РБ.

— Што служыць забеспячэннем аблігацый Беларускага Індустрыяльнага Банка?

— Забеспячэннем аблігацый з'яўляецца залог нерухомай маёмасці банка.

— Юрый Васільевіч, на прыняцце інвестарам рашэння аб укладанні свабодных грашовых сродкаў у каштоўныя паперы або іншы фінансавы інструментарый банка ўплывае тое, наколькі надзейны эмітэнт і якая яго рэпутацыя.

— Безумоўна, фінансавы стан і рэпутацыя любога банка з'яўляюцца дамінуючымі фактарамі пры прыняцці станоўчага рашэння інвестара аб укладанні грашовых сродкаў. Што датычыцца ААТ «Беларускі Індустрыяльны Банк», то мы з'яўляемся адной са старэйшых крэдытных устаноў, функцыянуем на фінансавым рынку краіны больш за 16 гадоў і займаем вядучыя пазіцыі ў групе сярэдніх і малых банкаў.

Па выніках работы за 2007 год балансавы прыбытак ААТ «Беларускі Індустрыяльны Банк» склаў 3,2 млрд руб. Размер чыстых актываў банка вырас з пачатку года больш як на 25,1 працэнта і дасягнуў 97,9 млрд руб. Рэнтабельнасць чыстых актываў склалася на ўзроўні 3,2 працэнта, што больш чым у 2 разы перавышае сярэдні паказчык па банкаўскай сістэме.

Па стане на 1 мая 2008 г. размер чыстых актываў павялічыўся да 121,5 млрд руб., а нарматыўны капітал банка склаў 34,8 млрд руб. (у тым ліку статутны фонд — 17 млрд руб.). Прыбытак за студзень—красавік гэтага года дасягнуў 1,2 млрд руб. Наш банк мае ўсе ліцэнзійныя паўнамоцтвы на работу з юрыдычнымі асобамі і індывідуальнымі прадпрымальнікамі, якія з'яўляюцца асноўнымі клієнтамі.

Алена АНІНА.

Больш падрабязная інфармацыя аб выпуску карпаратыўных аблігацый ААТ «Беларускі Індустрыяльны Банк» размешчана на сайце www.bib.by

Royal

ПРАВИЛА ПРОВЕДЕНИЯ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ «Королевские сокровища»

1. Настоящая рекламная игра называется «Королевские сокровища», проводится в соответствии с условиями настоящих правил с соблюдением требований законодательства Республики Беларусь без взимания с участников игры дополнительной платы.

Игра имеет цель — дополнительное увеличение посетителей (клиентов) казино "Royal", город Минск, проспект Независимости, 11, корп. 1.

2. Организатором Игры является ООО «Дакарай», расположенное по адресу: Республика Беларусь, 220030, г. Минск, пр. Независимости, 11/2-610. Учетный номер плательщика 190617507. Свидетельство № 614 о государственной регистрации коммерческой организации выдано Мингорисполкомом 18 апреля 2005 г. (далее по тексту – «Организатор»).

3. Игра проводится в казино «Royal» по адресу: Республика Беларусь, 220030, г. Минск, пр. Независимости, 11, корп. 1 в период **с 30 мая 2008 года по 01 августа 2008 года** (включительно).

4. Призовой фонд Игры.

Размер Призового фонда Игры составляет 115 560 000 (сто пятнадцать миллионов пятьсот шестьдесят) белорусских рублей и формируется в полном объеме за счет чистой прибыли Организатора игры – ООО «Дакарай».

Состав призового фонда:

Вид приза	Количество	Сумма, бел. руб.	Общая сумма, бел. руб.
Денежный приз	27	2 140 000	57 780 000
Денежный приз «Джек Пот»	9	6 420 000	57 780 000

5. В Игре в период ее проведения, могут принять участие совершеннолетние физические лица, в возрасте старше 18 лет (далее по тексту «Участники»), с учетом ограничений, изложенных в настоящих Правилах.

В Игре не имеют права участвовать работники и представители Организатора Игры, работники предприятий, связанных с Организатором договорными отношениями (обслуживающих Игру), а также члены семей названных работников и представителей, работники и представители любых других юридических лиц, имеющих отношение к организации и/или проведению настоящей Игры, а также члены их семей.

6. Описание Игры.

Механизм проведения Игры:

■ Для того чтобы принять участие в Игре и розыгрыше призов участнику следует в период с 30 мая 2008 года по 01 августа 2008 года посетить казино "Royal", расположенное по адресу г. Минск, пр. Независимости, 11, корп. 1 и принять участие в играх «ПОКЕР» и/или «БЛЭК ДЖЭК», и/или «РУЛЕТКА», и/или играх на игровых автоматах.

При этом участнику **игры «ПОКЕР»** независимо от игры у «дилера» выдаются игровые купоны за выпадение следующих комбинаций:

«Стрит» – 1 купон;
«Флэш» – 2 купона;
«Фулл Хауз» – 5 купонов;
«Каре» – 10 купонов;
«Стрит флэш» – 20 купонов;
«Роял флэш» – 50 купонов.

Также, участнику игры «ПОКЕР» при выплате суммы, эквивалентной 642 000 (шестьсот сорок две тысячи) белорусских рублей выдается 1 (один) игровой купон, но не более 5 (пяти) игровых купонов за единовременную выплату.

Участнику **игры «БЛЭК ДЖЭК»** выдаются игровые купоны за выпадение следующих комбинаций:

«Блэк Джэк одной масти» — 1 (один) купон;

«6», «7», «8» или «7», «7», «7» разных мастей – 2 (два) купона;

«6», «7», «8» или «7», «7», «7» одной масти – 5 (пять) купонов.

Участнику **игры «РУЛЕТКА»** при выплате суммы, эквивалентной 642 000 (шестьсот сорок две тысячи) белорусских рублей выдается 1 (один) игровой купон, но не более 5 (пяти) игровых купонов за единовременную выплату.

При **игре на игровых автоматах** купоны выдаются оператором игровых автоматов в следующих случаях:

- за выплату 200 000 белорусских рублей единовременно в результате выигрышной комбинации – 1 купон;

- за выплату 200 000 белорусских рублей в случае удвоения или бонусной игры – 1 купон.

Если выплата превышает 200 000 белорусских рублей, купоны выдаются за каждые 200 000 белорусских рублей, но не более 5 купонов за один раз.

После выпадения выигрыша, игрок, не переводя выигрыш в кредит, ОБЯЗАН пригласить оператора игровых автоматов для подтверждения выигрышной комбинации.

Купоны выдаются в период проведения рекламной игры с 00 час. 00 мин. 30 мая 2008 года до 22 час. 55 мин. 01 августа 2008 года. Выдача купонов для участия в розыгрыше заканчивается за 5 минут до начала соответствующего розыгрыша.

Каждый купон, состоит из двух частей, имеющих свой идентификационный номер.

Участник Игры, получивший купон, по линии отрыва разделяет купон на две половины, одну половину оставляет себе, вторую – возвращает сотруднику Организатора игры для дальнейшего участия переданной части купона в розыгрыше призов. Переданные Организатору игры купоны помещаются в лототрон.

Получение купона участника Игры подтверждает факт ознакомления и полное согласие участника с Правилами Игры, выражает желание участника участвовать в Игре, а также обязывает присутствовать при проведении розыгрыша призового фонда Игры.

Организатор имеет право проводить дополнительные экспертизы купонов участников Игры, в том числе с привлечением экспертов. Поддельные купоны участника Игры к участию в Игре не допускаются. Идентификация купонов участника Игры осуществляется работниками Организатора Игры.

7. В рамках Игры создается комиссия по проведению рекламной игры. Комиссия осуществляет свою деятельность в период проведения рекламной игры с 30 мая 2008 года по 01 августа 2008 года.

Регламент деятельности комиссии по проведению рекламной игры:

■ Персональный состав комиссии утверждается приказом директора ООО «ДАКАРАЙ». В состав комиссии входят 3 человека – председатель и два члена комиссии.

■ Решение комиссии признается действительным при условии присутствия большинства членов из общего состава комиссии.

■ Член комиссии ведет протокол заседаний комиссии. В протоколе отражаются время и место проведения заседания комиссии, повестка дня.

■ В протоколе розыгрыша призового фонда отражается время и место проведения розыгрыша призового фонда, сведения о составе комиссии по проведению розыгрыша, действия комиссии по проведению розыгрыша в том порядке, в каком они совершались, результаты проведения розыгрыша с указанием выигравшего купона и сведений о победителе, обладателе Приза рекламной игры.

■ Протоколы подписывают все члены комиссии, присутствующие при проведении заседания комиссии.

■ Протокол заседания комиссии по проведению розыгрыша приза рекламной игры является основанием для выдачи приза победителю.

■ Комиссия уполномочена рассматривать жалобы и предложения со стороны участников Игры.

8. **Специальным предложением** рекламной игры «Королевские сокровища» является розыгрыш «Джек Пота». Максимальная сумма «Джек Пота» составляет 57 780 000 (пятьдесят семь миллионов семьсот восемьдесят тысяч) белорусских рублей.

9. **Розыгрыши призов** Игры состоятся по адресу: г. Минск, пр. Независимости, 11, казино «Royal» в присутствии комиссии по проведению рекламной игры и участников игры в 27 (двадцать семь) этапов по следующему графику:

- 02.06.08, 04.06.08, 06.06.08, 09.06.08, 11.06.08, 13.06.08, 16.06.08, 18.06.08, 20.06.08, 23.06.08, 25.06.08, 27.06.08, 30.06.08, 02.07.08, 04.07.08, 07.07.08, 09.07.08, 11.07.08, 14.07.08, 16.07.08, 18.07.08, 21.07.08, 23.07.08, 25.07.08, 28.07.08, 30.07.08, 01.08.08 — розыгрыш денежного приза в размере 2 140 000 (два миллиона сто сорок тысяч) белорусских рублей.

Начало этапов розыгрышей в 23.00.

Розыгрыш «Джек Пот» будет проводится 06.06.08, 13.06.08, 20.06.08, 27.06.08, 04.07.08, 11.07.08, 18.07.08, 25.07.08, 01.08.08 в сумме по 6 420 000 (шесть миллионов четыреста двадцать тысяч) белорусских рублей с нарастающим итогом.

Начало розыгрыша «Джек Пот» в 23.30.

Определение победителей Игры будет проводиться посредством случайной выборки купонов участников Игры.

В каждом этапе к розыгрышу (понедельник, среда) допускаются игровые купоны, полученные в срок до момента проведения последнего розыгрыша каждого этапа. После проведения каждого этапа розыгрыша, игровые купоны, участвовавшие в этапе, в дальнейших этапах участие не принимают. Данный порядок не относится к розыгрышу в пятницу и розыгрышу «Джек Пот».

В розыгрыше в пятницу и в розыгрыше «Джек Пот» принимают участие купоны:

- принимавшие участие в проведенных розыгрышах в понедельник и среду;

- полученные после проведения розыгрыша (после 23.00) в среду.

Процедура проведения розыгрышей в понедельник и среду:

Все допущенные к участию в розыгрыше купоны участника Игры помещаются представителем Организатора в лототрон и перемешиваются. Один из членов комиссии случайным образом вытягивает купоны участника Игры из лототрона, объявляется идентификационный номер купона и фамилия его обладателя. Если в зале отсутствует владелец второй части купона с данным индентификационным номером, то из лототрона вынимается следующий купон. Данная процедура повторяется до тех пор, пока не будет вытянут купон с идентификационным номером, совпадающим с номером купона, присутствующего в зале участника Игры. На доске, напротив фамилии, соответствующей фамилии в купоне присутствующего участника, ставится отметка. Извлечение из лототрона купонов продолжается. Финалистами становятся три участника, которые первыми набирают по три отметки напротив своей фамилии на доске. По очередности участники выбирают

Каровіная пераправа

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Палова жыхароў статка вёскі Харомск не мае месца для пашы свойскай жывёлы — з аднаго боку пасевы і палеткі мясцовага сельгаскааператыва, з другога вёску падпірае рака. Гаспадары вымушаны нейкім чынам пераправіць сваіх кармілиц праз хуткаплынную Гарынь, за якой расцвітаюцца пойменныя лугі і балоты. Гэта адзіная магчымасць атрымаць добрыя надоі і жыхарам больш нічога не застаецца, як выправіцца ў небяспечнае пераадоленне ракі. Інакш трэба чакаць узвядзення пантоннага моста, якое адбываецца тут звычайна не раней сярэдзіны чэрвеня. Альтэрнатывы няма і, рызыкуючы, то адзін гаспадар, то другі цягнуць на вяроўцы сваіх каровак праз глыбокае цячэнне.

На падыходзе лета, а вада ў Гарыні сёлета вялікая, доўга не спадае. Нават тройчы на дзень пераадолець на вёслах водную стыхію, тым больш жанчыне, справа не з лёгкіх. І гэтак штодня. Уявіце сабе, што першая дойка тут ажно ў пяць раніцы. Харомскім гаспадыням, а дойка спрадвеку была іхнім клопатам, сапраўды, не пазайздросціш. На іх жа плячах і агароды, і хатнія справы, і праца. Колькі часу і высілкаў забірае толькі адна гэтая «малочная» пераправа? Бывае па чатыры чалавекі на лодцы, па пяць і нават, па шэсць. А што рабіць, калі лодак не шмат, а плысці трэба. Караўкі ж чакаюць і клічуць. Вунь і цяпер стаяць ля самай вады і гукаюць сваіх гаспадынь. «Летась у буру ледзь не перакуліліся, вось страху было», — у адзін голас прыгадваюць мінулагоднія «прыгоды» харомскія жанчыны, ўздыхаючы з-за адсутнасці больш-менш трывалай пераправы.

На супрацьлеглым беразе расцягнулася чарада летніх буданоў для начнога ўтрымання жывёлы. Частка з іх не першы год пустуе. Людзям пенсійнага ўзросту не пад сілу гэткі экстрым, ды і лодкі цяпер ёсць не ў кожнага. А маладых такая рамантыка (ці экзотыка?) не прываблівае. Галіна Іванаўна Каральчук, пакуль грабла, паспела расказаць, што гадоў сорак таму пагалоўе іхняй часткі вёскі пераўзыходзіла дзвесце кароў. А цяпер дваццаць ледзь набярэцца. У яе, як і ў большасці харомскіх гаспадынь і гаспадароў, першая мара — мост праз Гарынь. Яны яшчэ не збіраюцца выправаджваць з двара сваіх кармілиц-рагуль.

Анатоль КЛЯШЧУК.
Фота аўтара.
Столінскі раён.

Нашчадкі вогненных вёсак: з рэдакцыйнай пошты

МАРЫЯ БОГДАН З ВЁСКІ НІЎКІ

Уезджаная прасёлкавая дарога, што бярэ пачатак ад Віцебскай трасы за тры кіламетры ад Лагойска, пятляе між узгоркаў і прыводзіць у невялікую, на 18 сядзіб, вёску. Адразу кідаецца ў вочы помнік: на бетонным пастаменце ўзвіліся сімвалічныя языкі полымя.

«23 чэрвеня 1943 года ў вёсцы Ніўкі фашысцкімі карнікамі спалены жывымі 160 мірных жыхароў».

Патрэбна, дарэчы, удакладненне: лічба гэтая па невядомай прычыне заніжана. Як засведчана ў раённай кнізе «Памяць», у той дзень пакутніцкую смерць прынялі 238 з 260 тагачасных жыхароў вёскі.

У сённяшніх Ніўках жыве адзіная сведка пакутнай гібелі сваіх аднавяскоўцаў — 78-гадовая Марыя Сцяпанаўна Богдан.

...У той сонечны чэрвеньскі ранак разбудзіў яе матулін голас: «Уставай, дачушка, выгані свіней з хлеўчука, няхай папасвяцца крыху». Дзяўчынка пакінула цёплы ложак, спаласнула твар халоднай вадой, выйшла на двор і праз хвіліну зноў убегла назад у хату з крыкам «Мама, немцы, да нас ідуць, а ў тым канцы пажар!» Тым часам у хату ўваліліся двое фашысцкіх салдат з аўтаматамі. Адзін з іх наблізіўся да жанчыны, якая стаяла каля выпаленай печы і трымала на драўлянай лапаце важкі камяк цеста. Рэзка ўдарыў пад ніз лапаты ботам, цеста скінулася на падлогу. Прагучала каманда збіраць дзяцей і выходзіць на двор: маўляў, у вёсцы будзе праводзіцца праверка дакументаў.

Міхаліна разбудзіла меншага з дзяцей, пяцігадовага Сярожку, выйшла з малымі ў двор. Чужынцы рушылі праз вуліцу ў хату суседа Яна Рымшы. Гэта быў выратавальны шанц: жанчына кінулася з дзецьмі ў жытнёвы загон, што падступаў да сядзібы, загадала цішком паўзці.

І яны папаўзлі, баючыся адарвацца ад зямлі. Калі добра аддаліліся, ляглі ніцма, замёрлі. Чулі галашэнне, адчайныя крыкі людзей, якіх заганялі ў тры хаты. Зусім блізка свісталі кулі: карнікі стралялі па ўцекачах. Чуваць было, як праносіліся на конях паліцаі, падбіралі параненых, волакам цягнулі да вогненнага пекла. Не давала спакою думка, што страцілі бацьку, гаспадара: яго застрэлілі на вачах у сям'і, калі акучваў паблізу хаты бульбу.

Так і праляжалі, цудам ураталіся, у густым жыце амаль да змяркання. Пачулі, як дзіка зараўлі каровы, што прыйшлі з пашы і не засталі сваіх гаспадароў, не пазналі родных падворкаў, на месцы якіх курыліся галавешкі. Тады толькі асмелілася маці, узнялася, выйшла з жытнёвага загону. Праз момант вярнулася са словамі: «Няма ўжо, дзеткі, нашай вёскі, нашай хаткі і людзей нямашака».

І пайшлі яны, прыбітыя нечуваным горам, на сваё спаленае селішча, дзе няўцямна рыкала іхняя карміцелька-карова. Знайшла маці абгарэлую пасудзіну, абмыла ля студні, падаіла Лысуху. Папілі сыраду, неяк уладкаваліся, у чым стаялі, на градзе, паснулі. Хоць які гэта быў сон — трызненне пасля перажытага кашмару.

Назаўтра папрыходзілі ўцалелыя з паўтара дзесятка вяскоўцаў, з'явіліся і сваякі загінулых з навакольных вёсак. Пазнаходзілі абгарэлыя астанкі, пазносілі на могілкі, закапалі ў дзвюх ямах — брацкіх магілах.

Была на гэтым пахаванні і Міхаліна цётка Стэфа з недалёкага Міхалова. Прапанавала пажыць у яе: будзе, маўляў, адна карова на дзве сям'і. Цётчына прапанова падалася слушнай. Але і тут яны апынуліся на мяжы жыцця і смерці.

...У сярэдзіне восені наляцелі і на Міхалова карнікі. Масавую расправу не ўчынілі, палілі асобныя хаты. Пусцілі з агнём і Стэфчыну хату. У самы апошні момант Міхаліна паспела выпхнуць чатырох дзяцей праз акно, загадала бегчы да рэчкі, там схавацца. Сама з нядаўна народжанай дачушкай на руках затрымалася ў надзеі ўратаваць карову. Паклала немаўлятка на зямлю, кінулася да хлява, ды было ўжо позна: загарэлася ад трасіруючых куль будыніна. У бяспамяцтве і страху праляжала жанчына да глыбокай цемры, спахапілася, кінулася шукаць дзяцей. Азвяліся яны, акалелыя, з лазовага куста. Знайшлося і немаўлятка, якое ўвесь гэты час праляжала ў пялюшках на зямлі.

Стаўшы ў другі раз пагарэльцамі, пайшлі ў спаленыя Ніўкі. Па дарозе сустрэліся партызаны на падводзе. Падабралі, распыталі, параіліся і адвезлі ў Юркавічы, дзе жыў родны матчын дзядзька Міхал. Там перазімавалі, спажываючы сабраны на сваёй, ніўскай сядзібе ўраджай — бульбу і збажыну. Пад вясну дзядзька вымушаны быў сказаць: «Ведаеш, сястра, трэба табе вярнуцца ў Ніўкі, там абжывацца». Ды яна і сама разумела, што нельга вось так бадзяцца па чужых вуглах. Сабрала сякі-такі пажытак, запрог дзядзька каня, адвёз у Ніўкі. Сваякі дапамаглі зладзіць зямлянку, дзе ў цеснаце і сырасці пражылі ажно чатыры гады.

Нялёгка было ўдаве гадаваць, ставіць на ногі пяцярых дзяцей. Было, што і жабраваць па людзях выпраўляла. Рупіліся на сваіх сотках і градах. У летні час выручаў блізкі лес, багаты на грыбы і ягады. «Пойдзем, бывала, з мамай па чарніцы і знаходзім косці людзей, забітых пры расправе над вёскай. Занясём на могілкі ды закапаем...»

Ёй, Марыі, суджана было звязаць свой лёс з Францам Богданам з хутара Алешнікі, дзе карнікі ў блакаду спалілі ўсе сем сядзіб. Людзям пашчасціла ўратавацца... Пажаніліся, з дапамогай дзяржавы збудавалі на бацькоўскім дворышчы ладнаватую па тым часе хаціну. Нарадзілі, выхавалі, выправілі ў самастойнае жыццё чацвярых дзяцей.

За ўсе перанесеныя пакуты лёс падараваў Міхаліне даўгалецце, яна пражыла ў сваіх адроджаных Ніўках, ва ўласнай хаце 84 гады, прычакала болей за 20 унукаў, паспела пацешыцца праўнукамі. Таксама як і Марыя Сцяпанаўна, якая займела шматлікіх нашчадкаў. А яны маглі б проста не з'явіцца на свет, калі б разгубілася, упусціла дарованы Усявышнім шанц Міхаліна Карабан.

Віктар НЕСЦЯРОВІЧ,
Лагойскі раён.

НЯБЕСНАЕ БЛАСЛАВЕННЕ ДЛЯ... РАГУЛЬ

Незвычайны рытуал адбыўся на зялёнай лугавіне камунальнага сельскагаспадарчага ўнітарнага прадпрыемства «Капаткевічы», што ў Петрыкаўскім раёне. Туды з'явіўся мясцовы служыцель царквы са святой вадой, якой ён акрапляў пашу, даярак і рагуль. З тым, каб луг поўніўся сакавітымі травамі, даяркі былі стараннымі і здаровымі, а каровы давалі больш малака.

Адначасова тут былі ўшанаваны і перадавікі жывёлагадоўчай галіны прадпрыемства, якія атрымалі і грашовыя прэміі, і натуральную прадукцыю (парсючкоў). Прайшоў некаторы час, і святар з'явіўся ўжо сярод кормараздатчыкаў КСУПа, пажадаўшы ім ударнай работы.

Уладзімір ПЕРНІКАЎ.

ЗАВЕРЕНО
Департамент по ценным бумагам
Министерства финансов
Республики Беларусь
11 апреля 2008 года
Кулаженко В.Г.

ТЕХНОБАНК

УТВЕРЖДЕНО
Общим собранием акционеров
ОАО «Технобанк»
28 марта 2008 года (протокол № 2)

КРАТКАЯ ИНФОРМАЦИЯ
об открытой подписке на акции пятого выпуска открытого акционерного общества «Технобанк»

1. Полное и сокращенное наименование эмитента (на белорусском и русском языках):
на белорусском языке:
полное — Адкрытае акцыянернае таварыства «Тэхнабанк»,
сокращенное — ААТ «Тэхнабанк».
на русском языке:
полное — Открытое акционерное общество «Технобанк»,
сокращенное — ОАО «Технобанк».

2. Дата и номер государственной регистрации эмитента, наименование регистрирующего органа:
Эмитент зарегистрирован Национальным банком Республики Беларусь как ООО СКБ «Технобанк» 5 августа 1994 года, регистрационный номер № 47, преобразован в ОАО СКБ «Технобанк» 1 июня 1995 года, переименован в ОАО «Технобанк» 5 мая 2000 года. ОАО «Технобанк» (далее — Банк) является правопреемником всех прав и обязанностей ЗАО «Торгово-Промышленный банк».

3. Местонахождение эмитента, телефон, факс, электронный адрес (e-mail):
Местонахождение ОАО «Технобанк» (юридический адрес): Республика Беларусь, 220002, г. Минск, ул. Кропоткина, 44.
Телефон: +375 17 283 15 10
Факс: +375 17 283 15 10
E-mail: www.technobank.by

4. Сведения о счетах эмитента, на которые будут зачисляться средства, поступающие при проведении открытой подписки на акции:
Денежные средства, поступающие при проведении открытой подписки на акции пятого выпуска ОАО «Технобанк», будут аккумулироваться на временном счете, открытом по согласованию с Национальным банком Республики Беларусь в ОАО «Белгазпромбанк», БИК 742, номер счета 1713000000058 (лицевые счета открыты в следующих видах валют: белорусские рубли, доллары США, евро).
В ОАО «Технобанк», БИК 182, для отражения поступающих денежных средств персонально каждому инвестору будут открыты лицевые счета. Балансовый счет, на котором будут отражаться средства от открытой подписки на акции – 6661 «Суммы, полученные при формировании уставного фонда».

5. Сведения об уставном фонде эмитента:
Сумма зарегистрированного уставного фонда ОАО «Технобанк» составляет 19.985.332.252 (Девятнадцать миллиардов девятьсот восемьдесят пять миллионов триста тридцать две тысячи двести пятьдесят два) белорусских рубля. Уставный фонд разделен на простые (обыкновенные) и привилегированные акции номинальной стоимостью 1.682 (Одна тысяча шестьсот восемьдесят два) белорусских рубля каждая в количестве 11.881.886 (Одиннадцать миллионов восемьсот восемьдесят одна тысяча восемьсот восемьдесят шесть) штук, из них:
- простые (обыкновенные) акции 11.817.673 (Одиннадцать миллионов восемьсот семнадцать тысяч шестьсот семьдесят три) штуки;
- привилегированные акции 64.213 (Шестьдесят четыре тысячи двести тринадцать) штук.

6. Сведения о периодическом печатном издании, в котором публикуется бухгалтерская отчетность эмитента, и сроки ее публикации:
В соответствии с требованиями законодательства Республики Беларусь ОАО «Технобанк» публикует в республиканском печатном средстве массовой информации, являющемся официальным изданием – газете «Звязда» годовой отчет (бухгалтерский баланс, отчет о прибыли и убытках, отчет об изменении капитала, отчет о движении денежных средств) после подтверждения его достоверности аудиторской организацией (аудитором – индивидуальным предпринимателем) не позднее 25 апреля года, следующего за отчетным.
ОАО «Технобанк» публикует квартальный отчет (бухгалтерский баланс, отчет о прибыли и убытках) в республиканском печатном средстве массовой информации, являющемся официальным изданием – газете «Звязда» по состоянию на 01 апреля, 01 июля, 01 октября текущего года.

7. Место и время ознакомления с более подробной информацией (Проспектом эмиссии):
С более подробной информацией (Проспектом эмиссии) можно ознакомиться, начиная с даты публикации в периодическом печатном издании краткой информации об открытой подписке, по адресу: Республика Беларусь, 220002, г. Минск, ул. Кропоткина, 44, головной офис ОАО «Технобанк» ежедневно кроме выходных и праздничных дней с 9.00 до 16.00.
Контактный телефон 237 43 80.

8. Размер объявленного уставного фонда:
Размер объявленного уставного фонда ОАО «Технобанк» составляет 40.786.392.454 (Сорок миллиардов семьсот восемьдесят шесть миллионов триста девяносто две тысячи четыреста пятьдесят четыре) белорусских рубля.

9. Дата и номер протокола Общего собрания акционеров, принявшего решение о проведении открытой подписки на акции:
Решение о проведении открытой подписки на акции пятого выпуска ОАО «Технобанк» принято Общим собранием акционеров ОАО «Технобанк» 26 марта 2008 года (протокол № 1).

10. Основные цели эмиссии и направления использования средств, полученных в результате проведения открытой подписки на акции:
Открытая подписка на акции пятого выпуска ОАО «Технобанк» проводится с целью наращивания собственного (нормативного) капитала Банка во исполнение Программы развития ОАО «Технобанк» на 2001—2010 годы, Плана мероприятий, направленных на совершенствование деятельности ОАО «Технобанк» на 2007—2008 годы, утвержденного Советом Директоров ОАО «Технобанк» 23.01.2007 года (протокол № 3), с учетом изменений и дополнений, внесенных Советом Директоров ОАО «Технобанк» 11.10.2007 года (протокол № 36), а также общих задач развития банковской системы Республики Беларусь на 2001—2010 годы. Полученные в результате подписки на акции денежные средства будут направлены на увеличение уставного фонда ОАО «Технобанк».

11. Планируемый объем эмиссии, номинальная стоимость акции:
Планируемый объем эмиссии акций пятого выпуска ОАО «Технобанк» – 20.801.060.202 (Двадцать миллиардов восемьсот один миллион шестьдесят тысяч двести два) белорусских рубля.
К открытой подписке предлагаются простые (обыкновенные) акции в количестве 12.366.861 (Двенадцать миллионов триста шестьдесят шесть тысяч восемьсот шестьдесят одна) штука. Акции выпускаются в виде записей на счетах.
Номинальная стоимость акции — 1682 (Одна тысяча шестьсот восемьдесят два) белорусских рубля.
Открытая подписка на акции по цене ниже номинальной стоимости не допускается.
Преимущественное право акционерам, владеющим простыми (обыкновенными) акциями, на покупку дополнительно выпускаемых акций не предоставляется.

12. Порядок расчета и выплаты дивидендов по акциям:
Выплата дивидендов производится ОАО «Технобанк» в соответствии с законодательством Республики Беларусь, уставом ОАО «Технобанк». Решение об объявлении и выплате дивидендов, размере дивиденда, форме и сроках выплаты принимается Общим собранием акционеров. Список акционеров, имеющих право на получение дивидендов, составляется на основании данных реестра владельцев акций, на основании которого был составлен список лиц, имеющих право на участие в Общем собрании акционеров, принявшем решение о выплате дивидендов.
По решению Общего собрания акционеров дивиденды могут выплачиваться акциями, выпущенными Банком и зарегистрированными в установленном порядке, а также другим имуществом, принадлежащим Банку.
По заявлению акционера причитающиеся ему дивиденды высылаются почтовым переводом или перечисляются на его счет в банке. Расходы по пересылке (перечислению) дивидендов в пределах Республики Беларусь производятся за счет средств Банка.

13. Место и время проведения открытой подписки:
Открытая подписка на акции пятого выпуска ОАО «Технобанк» проводится по адресу: г. Минск, ул. Кропоткина, 44, головной офис ОАО «Технобанк» ежедневно кроме выходных и праздничных дней с 9.00 до 16.00. Контактный тел. 237 43 80.

14. Период проведения открытой подписки:
Открытая подписка на акции пятого выпуска ОАО «Технобанк» начинается после опубликования в печати краткой информации об условиях проведения открытой подписки на акции в соответствии с законодательством Республики Беларусь. Продолжительность проведения открытой подписки на акции не должна превышать шести месяцев.
Подписка прекращается досрочно при достижении объявленной величины уставного фонда.
Превышение объявленного уставного фонда в процессе подписки не допускается. В случае недостижения объявленной величины уставного фонда Общим собранием акционеров утверждается фактически сформированный размер уставного фонда.

15. Условия отказа от заключения договора:
В заключении договора подписки может быть отказано, если уже заключены договоры подписки на сумму объявленной эмиссии, а также при нарушении инвестором законодательства Республики Беларусь.

16. Условия и порядок возврата средств инвесторам при признании открытой подписки на акции несостоявшейся (запрете выпуска акций):
При признании открытой подписки на акции несостоявшейся, инвесторам возвращаются средства, полученные при проведении подписки, в месячный срок с даты проведения Общего собрания акционеров, на котором утверждались результаты проведения подписки. В случае вынесения органом, осуществляющим государственную регистрацию ценных бумаг, решения о запрете выпуска акций, инвесторам возвращаются их вклады в уставный фонд в месячный срок с даты получения эмитентом уведомления о запрете.

Председатель Правления **В.И. Хлопицкий**
Главный бухгалтер **Н.Л. Борсук**

Лицензия на осуществление банковской деятельности
№ 11 от 27.10.2006 г. УНП 100706562

Чуеце, усюдна
Мари жалобны
грае —
На праспекце
людным
Ландыш памірае.
Адышла да часу
Веснавая ява —
Ў лесе
быў украсай,
Гораду — забава.
Светлыя званочкі
Не абвесцяць згоды,
Кветку
майскай ночкі
Не аддасць
прырода.
Ўсіх багацціяў
горада
Варта
кветка тая...
Чуеце, няскорана
Ландыш памірае.

Royal

РЕЗУЛЬТАТЫ ПРОВЕДЕНИЯ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ
«МНОГО ДЕНЕГ НЕ БЫВАЕТ!!!»

В период **с 7 апреля 2008 года по 21 мая 2008 года** (включительно) в зале игровых автоматов в казино «Royal» по адресу: Республика Беларусь, 220030, г. Минск, пр-т Независимости, 11, корп. 1 проводилась рекламная игра «Много денег не бывает!!!».

Игра проводилась в составе комиссии рекламной игры «Много денег не бывает!!!»:
- Лесков Сергей Александрович (Место работы — ООО «Дакарай», должность — начальник смены)
Члены комиссии:
- Курленя Алексей Иванович (Место работы — ООО «Дакарай», должность — начальник смены)
- Чеславская Ольга Геннадьевна (Место работы — ООО «Дакарай», должность — заместитель начальника смены).

Призовой фонд игры в размере **14 980 000** (четырнадцать миллионов девятьсот восемьдесят тысяч) белорусских рублей разыгран полностью между следующими участниками:

В **1-ом этапе** розыгрыша, который проводился 9 апреля 2008 года, денежный приз, согласно протокола проведения 1 этапа рекламной игры, получил:
- Антонов Игорь Владимирович — денежный приз в размере 2 140 000 (два миллиона сто сорок тысяч) белорусских рублей.

Во **2-ом этапе** розыгрыша, который проводился 16 апреля 2008 года, денежный приз, согласно протокола проведения 2 этапа рекламной игры, получил:
- Кунец Сергей Владимирович — денежный приз в размере 2 140 000 (два миллиона сто сорок тысяч) белорусских рублей.

В **3-ем этапе** розыгрыша, который проводился 23 апреля 2008 года, денежный приз, согласно протокола проведения 3 этапа рекламной игры, получила:
- Даско Евгения Петровна — денежный приз в размере 2 140 000 (два миллиона сто сорок тысяч) белорусских рублей.

В **4-ом этапе** розыгрыша, который проводился 30 апреля 2008 года, денежный приз, согласно протокола проведения 4 этапа рекламной игры, получил:
- Карапетян Ара Гамлетович — денежный приз в размере 2 140 000 (два миллиона сто сорок тысяч) белорусских рублей.

В **5-ом этапе** розыгрыша, который проводился 07 мая 2008 года, денежный приз, согласно протокола проведения 5 этапа рекламной игры, получил:
- Науменко Анатолий Григорьевич — денежный приз в размере 2 140 000 (два миллиона сто сорок тысяч) белорусских рублей.

В **6-ом этапе** розыгрыша, который проводился 14 мая 2008 года, денежный приз, согласно протокола проведения 6 этапа рекламной игры, получила:
- Кочеткова Диана Дмитриевна — денежный приз в размере 2 140 000 (два миллиона сто сорок тысяч) белорусских рублей.

В **7-ом этапе** розыгрыша, который проводился 21 мая 2008 года, денежный приз, согласно протокола проведения 7 этапа рекламной игры, получил:
- Шестакович Николай Михайлович — денежный приз в размере 2 140 000 (два миллиона сто сорок тысяч) белорусских рублей.

С момента получения приза, а также любого иного дохода в рамках Игры, вышеназванные Участники несут ответственность за уплату всех применимых налогов, установленных действующим законодательством Республики Беларусь.

Свидетельство о государственной регистрации правил проведения рекламной игры выдано Министерством торговли Республики Беларусь за № 968 от 04 марта 2008 года. УНП 190617507

Краіна здароўя
Выпуск № 27 (83)

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

ХУТКАЯ ДАПАМОГА — НЕ МЕДЫЦЫНСКАЕ ТАКСІ

Кожны год брыгады службы хуткай медыцынскай дапамогі робяць да 3-х мільёнаў выездаў да пацыентаў. Прычым нагрузка на «хуткую дапамогу» пастаянна расце, што зусім не радуе галоўнага пазаштатнага спецыяліста па хуткай медыцынскай дапамозе Міністэрства аховы здароўя, галоўнага ўрача Мінскай гарадской клінічнай бальніцы хуткай медыцынскай дапамогі Віктара СІРЭНКУ.

— З аднаго боку, гэта сведчыць аб вельмі высокім даверы да нашай службы з боку насельніцтва Беларусі, — тлумачыць свой скептыцызм спецыяліст, — але з іншага боку, мы не павінны замяняць пацыентам амбулаторна-паліклінічную службу. Прызнайцеся, ці часта вы бачыце на вуліцах машыны службы па надзвычайных сітуацыях? А як часта вам сустракаюцца на дарозе нашы машыны? Справа ў тым, што служба МНС выязджае толькі ў экстраных выпадках, калі дзесьці здарыўся пажар, штосьці выбухнула і гэтак далей. Мы таксама павінны выязджаць толькі на пажары, дарожна-транспартныя здарэнні, цяжкія траўмы, атручэнні, падзенні з вышыні, сардэчныя прыступы, да парадзіх, немаўлят і некаторыя іншыя экстраныя выпадкі. А вымушаны выязджаць да хворых з прастудай, абвастрэннем хранічных захворванняў, радыкулітам, галаўным болем, г.зн. па тэрапеўтычных паказаннях, прычым у час работы паліклінік. У 65 працэнтах выпадкаў наша служба выконвае абавязкі амбулаторна-паліклінічнай службы па аказанні неадкладнай дапамогі, займаецца абязбольваннем і транспарціроўкай пацыентаў.

Хачу заўважыць, што ў залежнасці ад профілю брыгады, кваліфікацыі медработнікаў і працягласці прабегу адзін толькі выезд каштуе бюджэту ад 25 да 90 тысяч рублёў. Наша дапамога — надзвычай дарагая. Але фінансавая частка — гэта толькі адзін бок праблемы. Другі бок праблемы заключаецца ў тым, што ў экстраным выпадку брыгада хуткай медыцынскай дапамогі можа не аказацца ў патрэбным месцы, таму што будзе абслугоўваць неабгрунтаваны выклік. Крытэрыяў для выкліку хуткай медыцынскай дапамогі ў нас няма, гэта дапамога аказваецца на бясплатнай аснове, адсюль і спажывецкае стаўленне насельніцтва да службы. Адны пацыенты элементарна лянуюцца ісці ў паліклініку, у іншых няма грошай на лекі, а каб выклікаць хуткую дапамогу, дастаткова толькі падняць тэлефонную трубку. Нярэдкія, на жаль, і несапраўдныя выклікі, летась, напрыклад, было аштрафавана каля 100 такіх «жартаўнікоў».

Адзін з найважнейшых паказчыкаў работы службы хуткай медыцынскай дапамогі — тэрмін выезду машын па выкліку. Час з моманту прыёму выкліку і да выезду брыгады не павінен перавышаць 4 хвіліны. У сталіцы гэты нарматыў цалкам вытрымліваецца. А вось выклікі, якія не адносяцца да разраду экстраных, могуць абслугоўвацца на працягу гадзіны.

У Мінску на сённяшні дзень дзейнічае цэнтральная станцыя і 9 падстанцый хуткай дапамогі. Кожная падстанцыя звязаная з цэнтральнай станцыяй прамой двухбаковай тэлефоннай сувяззю, дзякуючы якой ажыццяўляецца выклік брыгад. Радыус абслугоўвання станцыі складае 5—7 кіламетраў. Між іншым, у бліжэйшы час у сталіцы плануецца пабудаваць яшчэ дзве падстанцыі. Паводле дзеючага нарматыву, у выпадку экстранага выкліку на ўвесь шлях ад падстанцыі хуткай дапамогі да пацыента адводзіцца у межах горада 15 хвілін і 30 хвілін — у сельскай мясцовасці.

Віктар Сірэнка катэгарычна адверг існаванне дыскрымінацыі ў адносінах да пацыентаў па ўзроставым прынцыпе, да якіх, як нярэдка сцвярджаюць нашы чытачы, хуткая дапамога ехаць не спяшаецца.

— Ніякіх абмежаванняў па ўзросце няма і не можа быць, — сцвярджае спецыяліст. — І калі хуткая дапамога адмаўляецца выязджаць да немаладога чалавека — гэта можна лічыць злачынствам, паколькі чалавеку адмаўляюць у медыцынскай дапамозе. Цяпер паўсюдна на службе хуткай дапамогі ўсталявана праграмнае забеспячэнне, рэгіструюцца ўсе званкі і ўсе размовы запісваюцца на лічбавыя носьбіты. У спрэчных выпадках іх можна праслухаць, каб даць ацэнку рабоце дыспетчара. У Мінску многія званкі на дыспетчарскай станцыі пераадрасуюцца ўрачу-кансультанту. І яго работу таксама можна праверыць...

Сёння служба хуткай дапамогі заклапочана каардынацыяй сваёй дзейнасці са службамі МУС і МНС. Справа ў тым, што ў свой час быў зроблены перакос у бок набыцця для брыгад хуткай дапамогі апаратаў мабільнай сувязі, але практыка паказала, што трэба развіваць таксама і радыёсувязь. Толькі так можна скаардынаваць свае дзеянні з выратавальнікамі ці работнікамі ДАІ ў выпадку ўзнікнення надзвычайных сітуацый. Магчыма, трэба выдзеліць агульны канал радыёсувязі. Адзіная радыёпрастора дапамагла б эканоміць час, асабліва ў сітуацыях, калі для выратавання жыцця чалавека важная кожная хвіліна.

Увогуле вопыт сведчыць, што жыццё пацярпелых нярэдка залежыць ад таго, якая ім будзе аказана дапамога ў першыя хвіліны. Па сусветных даных, калі пацярпелы знаходзіцца ў стане клінічнай смерці больш як 3 хвіліны, верагоднасць таго, што яго жыццё ўдасца выратаваць, складае 75 працэнтаў. Пры павелічэнні гэтага часу да 5 хвілін верагоднасць змяншаецца да 25 працэнтаў, а пасля 10 хвілін чалавека выратаваць не ўдаецца.

Аптымальным варыянтам для аказання дапамогі хворым з цяжкімі механічнымі траўмамі з'яўляецца «платынавае правіла 30 хвілін»: 10 хвілін — на прыняцце выкліку і прыезд брыгады хуткай дапамогі да хворага, 10 хвілін — на аказанне дапамогі на месцы здарэння і 10 хвілін — на транспарціроўку пацярпелага ў стацыянар. У рэальным жыцці толькі ў выключных выпадках удаецца на працягу 30 хвілін даставіць пацярпелага ў стацыянар, таму медыкі кіруюцца іншым правілам — «залатой гадзіны».

— Да аказання экстранай медыцынскай дапамогі павінны быць гатовы ўсе: аўтамабілісты, выратавальнікі, работнікі міліцыі і ДАІ, персанал аварыйна-выратавальных службаў, сцюардэсы, праваднікі цягнікоў і г.д., але, на жаль, на практыцы мы бачым, што ўсе чакаюць прыезду хуткай дапамогі, — тлумачыць Віктар Сірэнка. — Многія работнікі ДАІ і выратавальнікі тлумачаць нежаданне прымяняць свае веды страхам нашкодзіць пацярпеламу. Для таго, каб выправіць сітуацыю, былі адкрыты два навучальна-трэніровачныя цэнтры па навучанні супрацоўнікаў МУС, МНС, Міністэрства транспарту і камунікацый, педагогаў і работнікаў небяспечнай вытворчасці навыкам аказання першай медыцынскай дапамогі: у Мінску і Віцебску (на базе БелМАПО і Віцебскага медуніверсітэта). Але пакуль што нашы «сілавыя ведамствы» асабліва інтарэсу да курсаў не праяўляюць. Між іншым, у краінах СНД з-за несвоечасовага аказання медыцынскай дапамогі пры ДТЗ гінуць 23 працэнты пацярпелых.

Надзея НІКАЛАЕВА.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Надзейныя рукі

ДРЭННА СТАЛІ ЧУЦЬ? ІМГНЕННА — ДА СУРДОЛАГА!

Прамая лінія

Госць «прамой лініі» — загадчыца дапаслага сурдалагічнага аддзялення Рэспубліканскай клінічнай бальніцы паталогіі слыху, голасу і маўлення Ніна КАСЦЮК

(Заканчэнне. Пачатак у нумары за 24 мая.)

☎— Добры дзень! З Мінска тэлефаную, завуць Уладзімір. Вось ужо пяць гадоў адчуваю шум у вушах, асабліва, калі знаходжуся на вуліцы. Прайшоў абследаванне ў цэнтры на вуліцы Сухой у Мінску. Прапанавалі лячэнне, у прыватнасці, кропельніцы. Але не дапамагло. Што яшчэ можна зрабіць?

— Шум у вушах любога паходжання лечыцца не вельмі добра, тым больш, калі такі стан цягнецца доўгі час, напрыклад, пяць гадоў. Таму вам неабходна зноў абследавацца і высветліць, якія захворванні могуць выклікаць такі дыскамфорт. Пракансультуйцеся ў сурдолага. Калі доктар не знойдзе зніжэння слыху, то лячыцца трэба ў тэрапеўта або неўролага. Калі слых зніжаны, лячэнне прызначыць сурдолаг. Пры пэўных паказаннях можна паспрабаваць баракамеру. Гэта дастаткова эфектыўны метад, пры якім паляпшаецца сілкаванне ўнутранага вуха. Аднак майце на ўвазе, што са шматгадовым шумам трэба прывыкаць жыць.

☎— Уладзімір Мікалаевіч, званю са Шчучына. Мне 54 гады. У дзяцінстве вельмі моцна цяклі вушы. Потым левае вуха крыху падлячылі. Але перахварэў менінгітам. З гэтай прычыны ў 1981 годзе ў Гродне зрабілі аперацыю. Пасля яе стан то пагаршаўся, то паляпшаўся. Цяпер вушы не цякуць, але ў іх стаіць шум. На левае вуха пачаў дрэнна чуць. Дзе мне можна абследавацца?

— Зразумела, у вас хранічная праблема з вушамі. У гэтым выпадку трэба абавязкова назірацца ў сурдолага. Прыязджайце да нас у Мінск, у Рэспубліканскі цэнтр паталогіі слыху, голасу і маўлення, і мы вас абследуем, зробім аўдыяграму. Магчыма, вам можна нечым дапамагчы. Папярэдне трэба ўзяць накіраванне па месцы жыхарства ад лор-урача або прыехаць на платную кансультацыю, якая каштуе каля 20 тысяч рублёў.

— У свой час мне выдалілі паліпы. Аднак я пастаянна чхаю, хаджу з насмаркам, не чую пахаў. Што гэта магло б быць?

— Таксама з гэтым трэба абследавацца. Магчыма, у вас зноў выраслі паліпы, і яны закрываюць тую вобласць, дзе размешчаны нюхальныя рэцэптары. Можа быць, трэба зноў выдаляць паліпы ці проста пралячыць нос. Але па тэлефоне гэтага не ўбачыш. Прыязджайце, паглядзім, што можна зрабіць. Папярэдне трэба запісацца на кансультацыю. Тэлефоны рэгістратуры: 200 85 24, 200 84 50.

☎— Званю з Клецка па просьбе суседа. Ён інвалід II групы, ужо 10 гадоў амаль не чуе. Як яму можна дапамагчы?

— У яго ёсць слыхавы апарат?

— Не.

— У такім выпадку, калі ён мае інваліднасць і яму паказаны слыхавы апарат, то апошні ён атрымае бясплатна. Для гэтага трэба звярнуцца ў Мінскую абласную бальніцу ў Бараўлянах. Папярэдне няхай возьме накіраванне ад свайго лор-урача да сурдолага. І яму падбяруць апарат.

☎— Салігорск на провадзе, Валянціна Пятроўна. Скажыце, як трапіць да вас на прыём?

— Вазьміце ў сваёй паліклінікі накіраванне ў Рэспубліканскі цэнтр паталогіі слыху, голасу і маўлення, які знаходзіцца ў Мінску на вул. Сухая, 8. Папярэдне запішыцеся па тэлефоне: 200 856 24. Званіце ў рабочыя дні з 8.00 да 11.00 ці з 16.00 да 18.00. Вас запішуць на прыём да ўрача-сурдолага. Можна трапіць на кансультацыю і без накіравання, платна. Але запісацца ўсё роўна трэба.

☎— Навагрудскі раён на провадзе, Марыя Іванаўна. Мне 78 гадоў. Пяць гадоў таму перанесла інсульт. Цяпер дрэнна чую. Урач кажа, што гэта з-за ўзросту. Што рабіць?

— Вельмі верагодна, што гэта праявы сасудзістых парушэнняў пасля інсульту. Але нельга выключыць і тое, што ў вас ёсць нейкія захворванні з боку вушэй, бо слых, як вы кажаце, зніжаецца. Трэба абследавацца ў сурдолага ў Гродне або ў Мінску, высветліць прычыну вашага стану, каб падабраць лячэнне.

☎— Добры дзень, тэлефаную з Гомеля. Завуць Ніна, мне 19 гадоў. Скажыце, калі ласка, ці можа праслухоўванне музыкі з дапамогай плэера прывесці да зніжэння слыху?

— Так, можа, калі гучную музыку слухаць працяглы час. Ёсць два варыянты, пры якіх можа пацярпець унутранае вуха. Пры першым гаворка ідзе аб кароткачасовым, але моцнай інтэнсіўнасці гуку. Напрыклад, калі падчас рок-канцэрта стаяць побач з калонкай, можа адбыцца вострае зніжэнне слыху. Пры другім варыянце працяглае карыстанне плеерам на вялікай гучнасці таксама паступова выклікае зніжэнне слыху.

☎— Тэлефаную з Брагінска га раёна. Мне была зроблена двухбаковая ніжняя канхатамія. Цяпер вельмі дрэнна дыхаць. Кажуць, што ў мяне злева ўтварыліся сінехіі. Як быць?

— Адразу пасля аперацыі добра дыхалі?

— Так.

— Цяперашні ваш стан можа быць звязаны з тым, што пасля аперацыі ў носе ўтварыліся спайкі — сінехіі. У такім выпадку, калі дыхаць цяжка, даводзіцца рабіць паўторную аперацыю. Пры ёй рассякаюцца сінехіі. Аперацыя невялікая, але рабіць яе трэба.

☎— Валерый, званю з Мінска. Мне 60 гадоў. Апошнім часам пачаў зніжацца слых. Тры гады таму абследаваўся, але адхіленняў не знайшлі. Што параіце рабіць?

— Вам трэба прайсці паўторнае абследаванне ў сурдолага, праверыць слых. Калі ў вас захаваліся вынікі папярэдняга абследавання, іх трэба прынесці, каб параўнаць з сённяшнім станам. Доктар вырашыць, які курс лячэння трэба прызначыць: падтрымліваючае ці ў больш пашыраным варыянце. Бярыце накіраванне да нас на Сухую, 8. Папярэдне запішыцеся па тэлефоне.

☎— Званю з Бабруйска, завуць Іван Фёдаравіч. У мяне пастаянны шум і свіст у вушах. Што гэта — праблема сасудаў галавы ці праблема вушэй?

— Гэта можа быць і тое, і другое. Трэба абследавацца. І пачаць з сурдолага, каб ён паглядзеў, ці ёсць праблемы са слыхам. Сасуды таксама неабходна праверыць. Зацягваць не трэба, бо чым раней чалавек звяртаецца да спецыялістаў, тым больш шанцаў развітацца з гэтым шумам. Можаце звярнуцца ў Мінск, у нашу бальніцу. Вазьміце накіраванне ад лор-урача ў Бабруйску і прыязджайце. Без накіравання можна абследавацца платна.

☎— Тэрэза Браніславаўна, Шчучын. Ужо тры гады ў мяне шум і звон у вушах. Дыягназ — неўрыт. Лячылася па месцы жыхарства. Прымала розныя прэпараты, а толку няма. Як быць?

— У вас хранічнае захворванне, але абследавацца трэба, магчыма, вы не ўсе рэзервы вычарпалі. Можа быць, вам ёсць сэнс яшчэ раз прайсці абследаванне ў нашым цэнтры ў Мінску. Па яго выніках мы зможам прызначыць вам лячэнне.

☎— Званю з Любані, завуць Галіна. Паўтара года ў мяне шум і звон у левым вусе, невялікае зніжэнне слыху. Прымала фезам, іншыя прэпараты, нічога не дапамагае. Была на прыёме ў лор-урача, ён сказаў, што з вухам усё нармальна. Што параіце?

— Вам трэба абследавацца ў сурдолага. Кансультацыі толькі лор-урача недастаткова. Бо ёсць шмат захворванняў, пры якіх у знешнім вусе, быццам бы, усё нармальна — і запалення няма, і перапонка ў норме. Аднак праблемы могуць хавацца ва ўнутраным вусе. А гэта можна выявіць з дапамогай спецыяльнай апаратуры. Яна ёсць у Мінскай абласной бальніцы ў Бараўлянах і ў нашым цэнтры паталогіі слыху, голасу і маўлення. Абследавацца трэба абавязкова, бо праблемы могуць быць вельмі сур'ёзнымі, тым больш, што шум і зніжэнне слыху ў вас аднабаковыя. Бярыце накіраванне і прыязджайце.

☎— Тэлефаную з Лагойска, Леаніда Пятроўна. Скажыце, ці можна вылечыць неўрыт слыхавога нерва?

— На жаль, не. Гэта хранічнае захворванне.

— А ці можна неяк аблегчыць стан пры гэтай хваробе?

— У гэтым выпадку прызначаецца падтрымліваючае лячэнне. Можна прымаць прэпараты тыпу бетастын, бетасерк. Аднак калі хвароба існуе доўгі час, то, на жаль, слых аднавіць нельга, і шум не заўсёды праходзіць. Але калі слых стабільны і не зніжаецца, паказана падтрымліваючае лячэнне раз у год. І два разы, калі працэс прагрэсуе. Цяпер прымяняецца шмат метадаў лячэння: іголкарафлексатэрапія, баракамера і г.д. Спрабаваць можна. Можаце пад'ехаць на кансультацыю ў наш цэнтр.

☎— Станіслаў, Пухавічы. Чуў, што некаторыя антыбіётыкі могуць уздзейнічаць на слыхавы нерв як яд. Ці так гэта?

— Так, такія антыбіётыкі ёсць. Гептаміцын, напрыклад, можа выклікаць неўрыт. Акрамя таго, на зніжэнне слыху можа ўздзейнічаць аспірын у вялікіх дозах, мачагонныя прэпараты, той жа фурасеміт.

☎— Я тэлефаную з Салігорска па просьбе сваёй мамы. У яе нейрасэнсорная тугавухасць II ступені. Пастаянны шум у вушах. Яна носіць слыхавы апарат, а калі здымае яго, то горш чуе, чым да таго, як апарат прызначылі.

— Нейрасэнсорная тугавухасць — захворванне хранічнае, якое, на жаль, цяжка лечыцца, і шум не заўсёды праходзіць нягледзячы на нашы намаганні. У асноўным выкарыстоўваецца падтрымліваючае лячэнне, каб слых не пагаршаўся. Яго прызначаюць раз на год. Калі працэс прагрэсуе — 2 разы на год. Што да слыхавога апарата, то ў прынцыпе ён не зніжае слых. Гэта, хутчэй за ўсё, супадзенне. Дзе вам падбіралі апарат?

— У Салігорску.

— Рэкамендую вашай маці абследавацца ў Мінскай абласной бальніцы ў Бараўлянах ці ў нас на Сухой, 8. Справа ў тым, што там, куды вы звярталіся, толькі падбіраюць слыхавыя апараты, а лячэннем не займаюцца. Вашай маці трэба звярнуцца па кваліфікаваную дапамогу. Бярыце накіраванне і прыязджайце.

☎— Званю са Смаргонскага раёна. Завуць Алена Мікалаеўна. Мужу ў кастрычніку зрабілі аперацыю з прычыны гнойнага атыту, выдалілі перапонку. Цяпер у яго вельмі кружыцца галава. Ці можа гэта быць наступствам аперацыі, ці гэта ціск? Якія вы можаце даць нам рэкамендацыі?

— Трэба, каб яго яшчэ раз паглядзелі. Магчыма, праблемы звязаны з вухам. Калі вуха аперыравалі, значыць, там быў хранічны гнойны працэс. У выніку гэтага працэсу, магчыма, быў разбураны лабірынт, які адказвае за раўнавагу. У гэтым выпадку галава можа кружыцца. Трэба высветліць, з чым сімптомы звязаны. Можаце прыехаць на кансультацыю да нас у Мінск.

— А ці трэба хворае вуха закрываць?

— Калі холадна і вецер, то лепш закрыць. А ўвогуле ўвесь час хадзіць з ватай у вусе не трэба, вуха павінна вентыляванца. Дома лепш яго адкрываць.

☎— З Салігорска турбуе Галіна Пятроўна. Мне 60 гадоў. Апошнім часам раптоўна знізіўся слых, з'явіўся шум у правым вуху. Што гэта можа быць і што мне рабіць?

— Трэба тэрмінова ісці да ўрача. Гэта можа быць усё, што хочаце, пачынаючы ад звычайнай сернай пробкі, якую дастаткова прамыць, заканчваючы нейрасэнсорнай тугавухасцю ці неўрытам. У апошнім выпадку чым раней чалавек звернецца да спецыяліста, тым лепш. Калі пацыент прыходзіць да доктара ў першыя тры дні, то ў 70 працэнтах выпадкаў слых удаецца аднавіць. Калі звяртаецца да канца месяца з моманту зніжэння слыху і развіцця неўрыту, то толькі ў 5 працэнтаў пацыентаў слых аднаўляецца. А праз месяц мы не бяромся лячыць, гэта бессэнсоўна. Справа ў тым, што вуха сілкуе ўсяго адна артэрыя. Дапусцім, у ёй адбыўся спазм. Прычын таму нямала: стрэс, падняўся ціск, утварыўся тромб на фоне атэрасклерозу, іншыя хваробы праявілі сябе. Дык вось у першыя дні ёсць шанц, што нервовыя клеткі не загінуць, што наладзяць гэта сілкаванне, спазм знімецца, кроў будзе паступаць, і вуха запрацуе... А калі не аказаць дапамогу на працягу месяца, то нервовыя канчаткі загінуць, і ўжо нічога нельга будзе зрабіць.

☎— Званю з Мінска, завуць Соф'я Іванаўна. Якія прэпараты вы змаглі б парэкамендаваць для зніжэння вушнога шуму?

— Перш за ўсё трэба абследавацца. Пачынайце з кансультацыі ўрача-сурдолага. Гэта можна зрабіць у Гомелі, а таксама можаце прыехаць у Рэспубліканскі цэнтр паталогіі слыху, голасу і горла ў Мінск. Вазьміце накіраванне па месцы жыхарства. Без накіравання можна пракансультавацца платна. Папярэдне запішыцеся па тэлефоне рэгістратуры: 200 85 24.

— Дзякуй вам.

«Прамую лінію» правялі Святлана БАРЫСЕНКА і Вольга ШАЎКО.

Добрая справа

Гэта асаблівая школа, у якой дзеці, як правіла, вучацца толькі год. Падобныя школы былі створаны ў 60-х гадах мінулага стагоддзя па ўсім Савецкім Саюзе, але толькі на тэрыторыі Беларусі цалкам захаваліся ўсе шэсць установаў адукацыі — па адной на кожную вобласць. Мэта іх — навучыць дзяцей, хворых на скаліёз, жыць з гэтай хваробай, прытармазіць там, дзе гэта магчыма, яе развіццё, і нават прымусіць трошкі адступіць. Скаліёз — сур'ёзная і невылечная хвароба, выкліканая дэфектам злучальных тканак, пры якой пакутуе не толькі пазваночнік, але і ўвесь арганізм чалавека. Яна праяўляецца ў перыяд росту дзіцяці і ў цяжкіх выпадках прыводзіць да інваліднасці.



У санаторнай школе-інтэрнаце № 9 для хворых на скаліёз дзяцей адзначылі лаўрэатаў года

Школа, у якой вучаць быць шчаслівым

Спецыяльныя фізічныя практыкаванні пры дыягназе «скаліёз» павінны стаць часткай жыцця.

Санаторная школа-інтэрнат № 9 за 40 гадоў свайго існавання напрацавала значны вопыт па рэабілітацыі дзяцей, хворых на скаліёз. Тут ёсць свой басейн, дзе вучні да пяці гадзін на тыдзень займаюцца спецыяльным лячэбным плаваннем. Некалькі кабінетаў лячэбнай фізкультуры, дзе з дзецьмі таксама па адметнай методыцы займаюцца высокапрафесійныя інструктары. Нават спартыўная зала тут мае асаблівую разметку, а настаўнік фізкультуры Сяргей Сяргейчык распрацаваў уласныя методыкі гульняў, якія дазваляюць навучыць хворых дзяцей добра і правільна рухацца, павысіць іх самаадзнаку і даць ім адчуць сябе такімі ж, як астатнія.

Унікальнасць гэтай школы яшчэ і ў тым, што ўсе тры кампаненты: лячэбны, адукацыйны і выхавальны тут непарыўныя і пастаўлены на высокі ўзровень. У гэтым безумоўная заслуга кіраўніцтва школы і Ўпраўлення адукацыі Кастрычніцкага раёна горада Мінска. За год, пакуль дзіця знаходзіцца ў сценах школы, яму трэба дапамагчы ў скарочаныя тэрміны пераадолець перыяд адаптацыі, не проста пазнаёміць з вельмі строгім артапедычным рэжымам, але і ўпэўніць ў неабходнасці яго трымацца, зрабіць гэты рэжым звыклым — гэта галоўная ўмова паспяховай рэабілітацыі пры скаліёзе. Пры гэтым нельга не ўлічваць, што дзецям сёння важна не згубіць навучальны год у плане адукацыі. І тут яны не толькі не губляюць, але і вырываюцца наперад: педкалектыў, здаецца, робіць немагчымае, бо за такі кароткі тэрмін многія дзеці з заціснутых, няўпэўненых у сабе хлопчыкаў і дзяўчынак ператвараюцца ў сапраўдных зорачак і лідараў, пераможцаў школьных, раённых і гарадскіх алімпіяд і навуковых канферэнцый. Яны пачынаюць пець, танцаваць, ствараць калекцыі адзення, самі выходзяць на подыум. Жыццё санаторнай школы-інтэрната насычана актыўным жыццём: сцежкі здароўя, святы, гурткі, сустрэчы, сумесная праца з Мінскім гарадскім палацам дзяцей і моладзі. І фінальнае свята напрыканцы мая — вызначэнне лаўрэатаў года, лепшых з лепшых. Сёлета такіх дзяцей было пяць. Ім, акрамя дыпломаў і падарункаў, уручаны сертыфікаты на бясплатнае наведванне басейна і гурткоў лячэбнай фізкультуры яшчэ на працягу года.

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.
Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Адна з важных умоў змагання са скаліёзам — разгрузка пазваночніка. Таму ў школе-інтэрнаце № 9 асаблівыя парты.

КАНФІСКАЦЫЯ КОЛАЎ...

(Заканчэнне.
Пачатак на 1-й стар.)

— Ці вывучалі вы аналагічны замежны вопыт барацьбы з п'янствам за рулём?

— Увогуле, нейкага стандартнага падыходу да гэтай праблемы ў свеце няма. Напрыклад, Украіна таксама вырашыла канфіскоўваць у безнадзейных п'яніц транспартныя сродкі. Але нашы паўднёвыя суседзі вырашылі выплачваць кампенсацыю ўладальнікам канфіскаваных аўтамабіляў, матацыклаў і г.д. Праўда, адмысловы закон украінскім парламентам яшчэ не прыняты, бо падчас яго абмеркавання ўзнікла шмат спрэчных момантаў наконт ацэнкі кошту канфіскату, памераў і механізму выплат. Не думаю, што нам трэба гэты вопыт пераносіць на беларускую глебу. Хоць, такая практыка існавала ў Беларусі ў савецкія часы. Неабходна ўлічваць нашу цяперашнюю спецыфіку і рэаліі.

— А таксама магчымыя спрэчныя моманты... Напрыклад, як быць, калі п'яны чалавек паўторна кіраваў чужым транспартным сродкам?

— Гэта адно з самых складаных пытанняў. З аднаго боку, непасрэднай віны гаспадара аўтамабіля ці матацыкла няма. Разам з тым, калі зрабіць выключэнне для такіх выпадкаў, то выпівохі пачнуць бессаромна карыстацца гэтым пралазам у заканадаўстве. Распрацоўшчыкі і эксперты прапануюць наступнае выйсце з падобных сітуацый. Пры першым затрыманні выпівохі за рулём чужой машыны ці матацыкла, накіроўваць законнаму ўладальніку афіцыйнае папярэджанне з напамінам: калі ён зноў даверыць ключы неблаганадзейнаму вадзіцелю, то страціць свой транспартны сродак. Упэўнены, што ў наступны раз гаспадар «жалезнага каня» будзе больш абачлівы.

— Але ж магчымасці выправіць памылку можа і не быць. Першы раз нецвярозы вадзіцель кіраваў транспартным сродкам аднаго гаспадара, а потым узяў «напракат» аўтамабіль у другога. Крайнім апынецца менавіта другі ўладальнік.

— Падобныя неадназначныя сітуацыі зусім верагодныя. Іх зараз абмяркоўваюць спецыялісты, шукаюць аптымальнае выйсце.

— Наколькі часта могуць узнікаць такія выпадкі?

— Гэтая праца яшчэ не завершана. Калі выходзіць толькі з сёлетніх звестак па Брэсцкай вобласці, то прыкладна кожны дзесяты вадзіцель-выпівоха кіраваў транспартным сродкам іншай фізічнай асобы, кожны дваццаты — тэхнікай прамысловых і сельскагаспадарчых прадпрыемстваў. Астатнія парушальнікі знаходзіліся за рулём уласных аўтамабіляў і матацыклаў.

— Ці будзе прымяняцца практыка канфіскацыі транспартных сродкаў, якія належаць не прыватнікам, а прадпрыемствам, арганізацыям, установам і ўвогуле юрыдычным асобам?

— Не. На юрасобаў гэтую меру не плануецца распаўсюджваць. Мяркуйце самі, які сэнс дзяржаве канфіскоўваць у самой сябе аўтамабіль?

— Якія транспартныя сродкі могуць трапіць пад канфіскацыю?

— Зноў жа, прааналізуем сітуацыю на падставе звестак з Брэстчыны. Дык вось, 63 працэнты нецвярозых вадзіцеляў падчас затрымання кіравалі іншамаркамі, 16,5 працэнта — легкавымі аўтамабілямі савецкай і расійскай вытворчасці, 11 працэнтаў — мапедамі, 4 працэнты — грузавікамі, па 3 працэнты — матацыкламі і трактарамі.

— Хто і як будзе распараджацца гэтым канфіскатам?

— Пакуль яшчэ невядома. Распрацаваць адмысловы механізм павінна Міністэрства ўнутраных спраў.

— Кіраўнік МУС выказаў прапанову бясплатна перадаваць такія транспартныя сродкі шматдзетным сем'ям. Ці падтрымліваюць ідэю распрацоўшчыкі адмысловага законапраекта?

— Гэту прапанову афіцыйна яшчэ не абмяркоўвалі. На маю думку, яна вельмі слушная.

— Калі завершыцца праца над законапраектам і пачне працаваць «канфіскацыйны механізм»?

— Дакладныя даты мне невядомыя. Скажу толькі, што «шліфоўка» дакумента вядзецца вельмі актыўна, прынцыповых рознагалоссяў сярод распрацоўшчыкаў няма, усе зацікаўленыя ў тым, каб як мага хутчэй унесці законапраект на разгляд парламента. А там усё будзе залежаць ад дэпутатаў. Спадзяюся, што адмысловы закон пачне дзейнічаць ужо сёлета. За першы квартал гэтага года па віне п'яных вадзіцеляў загінулі 47 чалавек. За ўвесь мінулы год ахвярамі п'яных кіроўцаў сталі 200 чалавек. Тэндэнцыя, як бачна, даволі трывожная. І гэта менавіта той выпадак, калі прамаруджванне — да смерці падобна.

Мікола ДЗЯБЁЛА.

ТЭАРЭТЫК І ПРАКТЫК У АДНОЙ ЛОДЦЫ.
КУДЫ ЗАПЛЫВУЦЬ?

Апошнія падзеі на палітычным Алімпе Расійскай Федэрацыі, адносіны паміж ёю і Беларуссю, а таксама іншыя актуальныя тэмы абмяркоўваюць карэспандэнт «Звязды» і незалежны беларускі эканаміст, кіраўнік аналітычнага цэнтра «Стратэгія» *Леанід* ЗАІКА.

— Леанід Фёдаравіч, ці не занадта два лідары для адной краіны, нават такой вялікай, як Расія? І ці не пагражае ёй гэта ў будучыні нейкімі моцнымі ўзрушэннямі?

— Як ні парадаксальна, сітуацыя з двума лідарамі вельмі сімвалічная, яна адпавядае выяве двухгаловага арла на гербе Расіі. А наконт узрушэнняў... Я не думаю. У Расіі ўжо амаль няма палітычнай барацьбы за ўладу. Так, засталіся і Зюганаў, і Жырыноўскі, але іх уплыў на падзеі ў краіне нязначны.

Пытанне ў іншым: наколькі такая мадэль двух лідараў будзе эфектыўнай? Адразу адзначу, што ў гісторыі гэта ўжо было. Успомнім Візантыю, дзе ў свой час адзін імператар пакідаў трон, а другі займаў яго. Нешта падобнае мы назіраем цяпер у Расіі. Паглядзім, што з гэтага атрымаецца.

— Дзмітрый Мядзведзеў ужо акрэсліў кола сваіх прэзідэнцкіх прыярытэтаў ці трэба трохі пачакаць?

— Па яго першых кроках можна меркаваць аб тым, над чым ён будзе працаваць у першую чаргу. У агульных рысах, Мядзведзеў як выдатна адукаваны ўніверсітэцкі юрыст з вучонай ступенню, на мой погляд, зоймецца паглыбленнем і пашырэннем дэмакратыі ў краіне, забеспячэннем правоў чалавека, пабудовай прававой дзяржавы, сацыяльнай абаронай пэўных катэгорый грамадзян і г. д. Ён возьме на сябе ролю тэарэтыка ці канцэптуаліста расійскай дзяржаўнасці, будзе прымаць адпаведныя ўказы і рашэнні.

— Аднак Расіі сёння не менш, калі не больш, патрэбны вопытныя практыкі?

— У гэтым сэнсе Уладзіміру Пуціну абъектыўна самой логікай апошніх палітычных падзей накананавана роля практыка № 1 у Расіі. Ён гэта выдатна разумее і таму будзе сябе праяўляць (і ўжо актыўна праяўляе) пераважна на ніве эканамічнага адраджэння і паскоранага развіцця краіны, ажыццяўлення амбіцыйных праектаў з астранамічнымі бюджэтамі — такіх, як днямі аб'яўленая ў Сочы праграма кардынальнай мадэрнізацыі дарог і транспарту. Справа наколькі пачэсная, настолькі і адказная. У выпадку правалу на палітычнай кар'еры Пуціна можна ставіць чорны крыж.

Калі меркаваць па першых заявах, указаннях і прапановах Пуціна, то ён не збіраецца, як яго папярэднікі на пасадзе кіраўніка ўрада, быць «тэхнічным» прэм'ерам. Безумоўна, цэнтр улады паступова будзе перасоўвацца ва ўрад.

— Як вы думаеце, што стаіць за эксперыментамі з колькасцю віцэ-прэм'ераў у расійскім урадзе. Яшчэ адносна нядаўна ў кіраўніка ўрада быў толькі адзін намеснік — Жукаў. Цяпер ва ўрадзе РФ зноў аж сем віцэ-прэм'ераў. Навошта?

— Каб вызваліць Пуціна ад неабходнасці займацца хай і дзяржаўнымі, але ўсё ж шматлікімі паўсядзённымі справамі, не даць ім зацягнуць яго ў дрыгву няспыннай «бягучкі». На мой погляд, за гады прэзідэнцтва Пуцін прывык да агульнага палітычнага кіраўніцтва і ад гэтага, відаць, не збіраецца адмаўляцца.

— У Расіі сёння многія схільныя лічыць цяперашні ўрад моцным. А як вы думаеце?

— Я не з тых аптымістаў. На маю думку, гэтаму ўраду бракуе высокага прафесіяналізму. У мяне, прызнаюся, ёсць сумненні ў кампетэнцыі кіраўнікоў асобных міністэрстваў, напрыклад, эканамічнага развіцця і некаторых іншых. Я не разумею, навошта было ствараць прэзідыум урада. У Маскве зрабілі ж сапраўдныя ленінцы. Гэта пры Леніне, нагадаю, існавалі вялікі і малы Саўнаркамы. Але тады бальшавікі толькі вучыліся кіраваць новай Расіяй.

— Барацьбу з інфляцыяй, якая за першыя чатыры месяцы гэтага года склала 6,3 працэнта, Пуцін акрэсліў як адну з галоўных мэтаў урада. Чаму гэта задача адна з самых цяжкіх у Расіі?

— Я ўпэўнены, што па гэтай жа самай прычыне. Ва ўрадзе Расійскай Федэрацыі пакуль няма дастаткова кваліфікаваных спецыялістаў. А прагнозы росту інфляцыі несуцяшальныя. Калі яны спраўдзяцца, то гучна разрэкламаваныя захады Пуціна па вырашэнні сацыяльных праблем дзесяткаў мільёнаў звычайных расіян, паляпшэнні іх жыцця будуць моцна мінімізаваныя, а магчыма і скампраментаваныя.

— Сённяшняя Расія істотна адрозніваецца ад Расіі ельцынскай па ўзроўні даходаў насельніцтва. Пуцін увогуле аб'явіў аб планах давесці сярэднюю зарплату ў 2011 годзе да 1200 дол. ЗША ў эквіваленце штомесяц. З аднаго боку, можна і парадавацца за расіян, а з іншага, узнікае небяспека значнага адтоку з Беларусі на заробкі ў Расію працоўнай сілы?

— Так, у Расіі цяпер ёсць усе фінансавыя рэсурсы для павышэння зарплаты, і Пуцін слова стрымае. Адначасова там не першы год назіраецца і востры дэфіцыт кадраў высокакваліфікаваных рабочых спецыяльнасцяў, асабліва будаўнікоў. І попыт на працоўную сілу няўхільна на расце. З гэтай нагоды ў Расіі распрацоўваецца новая міграцыйная палітыка, мэта якой — з выгадай для сябе прыцягнуць працоўныя рэсурсы краін СНД, Азіі і нават Афрыкі. Без гэтага заяўленыя ўрадам Пуціна эканамічныя паказчыкі і мэты не будуць дасягнутыя.

Зразумела, тысячы і тысячы беларусаў выкарыстаюць магчымасць добра падзарабіць у саюзнай Расіі, дзе яны змогуць адчуваць сябе амаль як дома. Узнікае пытанне: што нам рабіць з гэтым новым выклікам? Узнімаць паралельна зарплату да памераў расійскай? Верагодна, але дзе толькі грошы ўзяць? Я, напрыклад, не бачу шанцаў выйграць гэту канкурэнцыю. Таму ўжо цяпер трэба пралічваць варыянты прыцягнення ў нашу краіну рабочых-будаўнікоў з Таджыкістана і Узбекістана, у сельскую гаспадарку — з В'етнама, Кітая, Паўночнай Карэі і г. д. Жыццё прыспешвае — нам трэба рэзка памяняць адносіны да замежнай працоўнай сілы. Без гэтага мы хутка сутыкнёмся з вялікімі праблемамі.

— Магчыма памыляюся, але нешта я не заўважыў, каб два расійскія лідары праяўлялі, ва ўсякім разе хоць бы публічную цікаўнасць да Саюзнай дзяржавы. Рукі пакуль не даходзяць ці ёсць іншыя прычыны?

— Расія, як мне здаецца, у сілу шэрагу прычын імперскага характару мыслення яе палітычнай эліты страчвае інтарэс да пабудовы паўнацэннай Саюзнай дзяржавы. Мы ж не пагадзіліся на прапановы ўваходжання ў склад Расійскай Федэрацыі, на ўвядзенне расійскага рубля ў якасці адзінай валюты. Расія сёння заклапочана аднаўленнем свайго статусу вялікай дзяржавы, стратэгічнага панавання ў асобных рэгіёнах планеты, выртання вядучых пазіцый у спорце. Звярніце ўвагу, першы замежны візіт Мядзведзева — у Казахстан і суседні Кітай, а не ў Беларусь. А ці не таму, што не атрымліваецца наскокам вырашыць свае пытанні ў Еўропе? Азіяцкі вектар у Крамлі сёння бачыцца як самы перспектыўны.

Нам таксама важна не забываць, што гістарычна ў Расіі ніколі не было сяброў, а толькі інтарэсы. Нам гэта трэба абавязкова ўлічваць і не засяроджвацца толькі на партнёрстве з Расіяй. Безумоўна, з ёй варта ўсямерна развіваць эканамічнае супрацоўніцтва і ўзаемны гандаль. У прыватнасці, ствараць сумесныя магутныя холдынгі і прамысловыя групы ў галінах машына- і станкабудаванні, будаўнічых матэрыялаў і г. д.

Але ў сферы сельскай гаспадаркі пра нас больш выгадны партнёр Украіна. Там і зямля ўрадлівая, і працоўнай сілы дастаткова, і багаты вопыт земляробства. Тэндэнцыя такая, што хутка Украіна зойме ў Еўропе лідзіруючыя пазіцыі ў вытворчасці прадуктаў харчавання па цэнах і якасці. Мы можам ва Украіну пастаўляць калійныя ўгнаенні, тэхніку, наладжваць сумесную перапрацоўку сыравіны.

— Эгаізм Расіі асабліва відавочна праяўляецца ў няспынным росце цэнаў на пастаўкі энерганосьбітаў у нашу краіну. Тарыфы на газ неўзабаве будуць такія, як і для Заходняй Еўропы.

— Я не дэманізаваў бы фактар росту тарыфаў на газ. Ён, вобразна кажучы, «папяровы тыгр». Мы з гэтай праблемай справіліся адной левай. Тут спрацаваў эфект бумеранга. Наша экспартная прадукцыя ў Расію таксама расла ў цане і нават больш шпарка, чым газ для нас. Нам сёння проста неабходна хуткая пераарыентацыя эканомікі на максімальную вытворчасць аграрнай прадукцыі і інвестыцыйных тавараў, якія карыстаюцца попытам у Расіі. І мы будзем упэўнена сябе адчуваць.

— Ці пераможная ў сённяшняй Расіі карупцыя, якая, паводле слоў Мядзведзева, перарасла ў сістэмную праблему і пагражае бяспецы краіны?

— Шчыра кажучы, моцна сумняваюся. Карупцыя там расквітнела пасля таго, як у краіну пайшлі сотні мільярдаў нафтадалараў. Расійскія чыноўнікі ну не маглі прайсці міма такой выдатнай магчымасці пагрэць рукі. І паступова Расія ператварылася ў карупцыйную дзяржаву. Тым не менш хочацца пажадаць расіянам перамогі ў гэтай барацьбе.

— А ці можна сказаць, што расійскія карупцыянеры разбэшчваюць і дрэнна ўплываюць на асобных прадстаўнікоў нашага чыноўніцтва?

— Думаю, тут ёсць праблема. У Расіі ў пэўных колах склалася свая заганная практыка «вырашэння» складаных пытанняў з дапамогай лёгка зароблены грошай. Яе ўплыў аб'ектыўна адбіваецца і на Беларусі. Увогуле прасоўванне сваіх інтарэсаў з дапамогай хабару — сусветная з'ява. Напрыклад, урад ЗША даволі мякка ставіцца да хабару як сродку прасоўвання тавараў сваіх фірмаў на замежных рынках. Таму поспехі расіян у барацьбе з карупцыяй будуць нам на карысць.

— Сёння ў свеце многія аналітыкі задаюцца пытаннем: як будуць складвацца адносіны паміж новымі расійскімі прэзідэнтам і прэм'ерам? Многія не выключаюць, што Пуцін шляхам законных палітычных хадоў вернецца ў крэсла галавы дзяржавы.

— Хутчэй за ўсё так і будзе. Не хачу пакрыўдзіць Мядзведзева, але ў Пуціна большы патэнцыял асобы і палітыка, ён тая фігура, якая запатрабаваная ў Расіі. Хоць менавіта пры Пуціне значна выраслa карупцыя, колькасць доларавых мільярдэраў, розніца ў даходах насельніцтва. Тым не менш сярод палітыкаў у Пуціна самы высокі рэйтынг. Расія...

Гутарыў Леанід ЛАХМАНЕНКА.

Фота Марыі ЖЫЛІНСКАЙ.

Надзенное

Хораша там, дзе мы ёсць

Людскія перамяшчэнні — адзін з найбольш рэальных і эфектыўных спосабаў вырашэння дэмаграфічных праблем у сучасных умовах. Калі кіраваць ім па-майстэрску

Паведамленнем пра тое, што колькасць насельніцтва скарачаецца, а само яно няўхільна старэе, узмацняючы пры гэтым нагрузку на працуючых, сёння ўжо нікога не здзівіш. Праблемы гэтыя знаёмыя як спецыялістам, так і абывацелям не толькі ў нас — у многіх краінах свету.

У Беларусі для рэгулявання гэтых працэсаў прынятая Нацыянальная праграма дэмаграфічнай бяспекі на 2007—2010 гады. У Год здароўя больш увагі — да той часткі праграмы, што скіраваная на фарміраванне здаровага ладу жыцця і паляпшэнне сістэмы аховы здароўя жыхароў краіны. Міграцыя таксама не застаецца ў цені. Тым больш, што прыток імігрантаў для многіх краін — адзінае рашэнне праблемы дэпапуляцыі (устойлівага змяншэння колькасці насельніцтва) і недахопу працоўных рук ва ўмовах, калі натуральным прыростам выправіць становішча немагчыма. Як справы з людскімі перамяшчэннямі ў Беларусі, высвятляем разам з **Лідзіяй ІВАНЧЫКАВАЙ — начальнікам Дэпартамента па грамадзянству і міграцыі Міністэрства ўнутраных спраў Беларусі**. У кампетэнцыі ведамства — выкананне падпраграмы «Аптымізацыя міграцыйных працэсаў», у прыватнасці той яе часткі, што датычыцца знешняй міграцыі.

— Сярод асноўных задач падпраграмы — не толькі скараціць эмігрmaцыю кваліфікаваных спецыялістаў, але і стымуляваць зварот на радзіму тых з іх, што доўгі час працавалі за мяжой па кантракту. Варта забяспечыць станоўчае сальда знешняй міграцыі — да 5 тыс. чалавек штогод. Запланаваны падпраграмай штогадовы прырост насельніцтва разлічаны на падставе існуючай статыстыкі з улікам верагоднага прытоку імігрантаў у краіну ў наступныя гады. Такая колькасць не з'яўляецца максімальнай. Тым не менш неабходнасці ў квотах імігрантаў пакуль не было. Міністэрства ўнутраных спраў актывізавала працу па знешняй міграцыі яшчэ ў 2006 годзе. Па яго ініцыятыве было ўдасканалена заканадаўства ў адпаведных сферах. Пашыраны пералік падстаў для атрымання дазволу на пастаяннае пражыванне ў Беларусі спецыялістаў, у якіх краіна мае патрэбу, а таксама этнічных беларусаў. Іншаземцы, якія маюць падставы для атрымання беларускага грамадзянства, і нашы суграмадзяне, што вяртаюцца на радзіму, могуць афармiць дакументы для ўезду на пастаяннае пражыванне ў спрошчаным парадку. Прымяненне новага заканадаўства прынесла плён: у 2006 годзе дазвол на пастаяннае пражыванне ў Беларусі атрымалі 5 626 іншаземцаў і асобаў без грамадзянства. Летась пазітыўную тэндэнцыю ўдалося захаваць — пастаяннымі жыхарамі нашай краіны сталі яшчэ 4 676 чалавек. Акрамя таго, ёсць і людзі, якія афармляюць дазвол на часовае пражыванне ў краіне — яго потым можна падаўжаць.

Як высветлілася, колькасць такіх «часовых» жыхароў Беларусі апошнім часам істотна павялічылася: параўнайце, 8930 чалавек — у 2006 годзе і ажно 20 295 — у 2007-м. Тлумачыцца ўсё проста: у адпаведнасці з новай рэдакцыяй закона аб прававым становішчы іншаземных грамадзян і асобаў без грамадзянства яны могуць атрымаць дазвол на часовае знаходжанне (да 90 сутак), часовае пражыванне (да аднаго года) і пастаяннае пражыванне. Дагэтуль жа было толькі часовае і пастаяннае пражыванне.

— У адпаведнасці з міжнароднай статыстыкай міграцыі асоба, якая перазджае ў другую краіну на год і больш, з'яўляецца доўгатэрміновым мігрантам і ўлічваецца пры статыстычным даследаванні, — даводзіць Лідзія Іванаўна. — У нас жа статыстычнаму ўліку падлягаюць толькі тыя, хто атрымаў дазвол на пастаяннае пражыванне. Таму Міністэрства ўнутраных спраў сумесна з Міністэрствам статыстыкі і аналізу прымаюць меры па ўхіленні гэтых прабелаў у заканадаўстве.

Прымяненне новага заканадаўства прынесла плён: у 2006 годзе дазвол на пастаяннае пражыванне ў Беларусі атрымалі 5 626 іншаземцаў і асобаў без грамадзянства. Летась — 4 676 чалавек.

Зразумела, гэта далёка не адзіная праблема, з якой сутыкаюцца ведамствы падчас рэалізацыі праграмы. На думку Лідзіі Іванчыкавай, адзін з важных недахопаў — па-ранейшаму недастатковы ўзровень узаемадзеяння паміж дзяржаўнымі органамі ў кіраванні міграцыйнымі патокамі. Аднак гэта не азначае, што супрацоўніцтва наогул няма.

Паводле ініцыятывы Міністэрства замежных спраў, замежныя ўстановы Беларусі (дыпмісіі і консульствы) скіраваныя на тое, каб прыцягнуць у дзяржаву працоўную сілу з іншых краін і вярнуць на радзіму суайчыннікаў. Пры гэтым падраздзяленні па грамадзянстве і міграцыі актыўна супрацоўнічаюць з камітэтамі занятасці, каб новыя грамадзяне краіны запаўнялі вакантныя працоўныя месцы ў тых раёнах Беларусі, што не карыстаюцца попытам у карэнных жыхароў. А каб быў стымул — ахвотнікам працаваць у аграпрамысловым комплексе Беларусі плануецца прадастаўляць жыллё. Міністэрства ўнутраных спраў таксама праводзіць шырокую растлумачальную працу сярод мігрантаў аб прававым становішчы іншаземных грамадзян у Беларусі з улікам новага заканадаўства.

У 2004—2006 гадах у навуковыя арганізацыі НАН Беларусі вярнуліся 14 высокакваліфікаваных даследчыкаў, якія доўгі час працавалі за мяжой. На жаль, пра масавую рэпатрыяцыю беларускіх вучоных і спецыялістаў з-за мяжы гаварыць пакуль рана.

— На жаль, вопыт у сферы кіравання міграцыйнымі патокамі ў нашай краіне пакуль вельмі нязначны, — падкрэсліла Лідзія Іванаўна. — Найбольшая ўвага надаецца нацыянальнай бяспецы, у прыватнасці, процідзеянню незаконнай міграцыі і кантролю за знаходжаннем замежных грамадзян на тэрыторыі Беларусі. Справа ў тым, што незаконная міграцыя ўскладняе крымінагенную сітуацыю ў грамадстве, а значыць, пагражае бяспецы дзяржавы.

Органы міграцыйнага кантролю дзейнічаюць настолькі актыўна, што «злачынцы змушаны ствараць каналы нелегальнай міграцыі ў абход Беларусі», — адзначыла Лідзія Іванчыкава. На фоне таго, што «нелегалаў» становіцца ўсё менш, агульная колькасць іншаземцаў у Беларусі расце. Летась у органах унутраных спраў было зарэгістравана больш як 170 тыс. іншаземцаў (пры тым, што ў 2005 годзе іх было каля 106 тыс.).

Цяпер, калі экалагічная міграцыя ўжо не такая актуальная для Беларусі, як адразу пасля аварыі на Чарнобыльскай атамнай электрастанцыі ў 1986 годзе, на першы план выйшла міграцыя інтэлектуальная.

Праблема інтэлектуальнай міграцыі закранула як развітыя краіны свету, так і тыя, што развіваюцца. Павышаная міграцыйная актыўнасць высокакваліфікаваных спецыялістаў і навуковых супрацоўнікаў характэрная і для Беларусі. У эпоху эканамічнай глабалізацыі гэтыя працэсы натуральныя. Разнастайнасць меркаванняў па ацэнцы маштабаў і наступствaў інтэлектуальнай імігрaцыі з Беларусі надзвычай шырокая. Гэта звязана, перш за ўсё, з тым, што ў краіне адсутнічала дакладная афіцыйная інфармацыя аб колькасці беларускіх вучоных і спецыялістаў, якія выехалі за мяжу на пастаяннае пражыванне ці знаходзяцца там часова, аб геаграфіі іх выезду і працаўладкавання. Мэтанакіраваныя даследаванні пачаліся з 1996 года. Іх рэгулярна праводзяць у Цэнтры маніторынгу міграцыі навуковых і навукова-педагагічных кадраў (цэнтр гэты — структурнае падраздзяленне Інстытута сацыялогіі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі). Створаны банк даных, які пастаянна абнаўляецца. Вядзецца ўлік людзей, якія паехалі за мяжу для працы па кантракце ці на доўгачасовую стажыроўку. Вынікі даследаванняў паказалі, што апошнім часам адбываюцца значныя змены ў характары знешніх міграцыйных працэсаў у навуковай сферы. Змяняецца і сама структура міграцыйнага патоку. Расце колькасць беларускіх грамадзян, якія праходзяць навучанне ў замежных універсітэтах. Многія з іх арыентаваныя на далейшую працу за мяжой. Сумарная колькасць эмігрантаў-вучоных і выкладчыкаў ВНУ за 1996—2006 гады склала 767 чалавек (з іх 52 доктары навук, 295 кандыдатаў навук). Каб спыніць страты высокакваліфікаваных кадраў, прымаецца шэраг мераў, накіраваных на якаснае паляпшэнне іх дзейнасці. Гэта пачало прыносіць плён: адзначаны выпадкі вяртання беларускіх вучоных. Так, у 2004—2006 гадах у навуковыя арганізацыі НАН Беларусі вярнуліся 14 высокакваліфікаваных даследчыкаў, якія доўгі час працавалі за мяжой. На жаль, пра масавую рэпатрыяцыю беларускіх вучоных і спецыялістаў з-за мяжы гаварыць пакуль рана.

Кажуць, рыба шукае, дзе глыбей, а чалавек, дзе лепей. Таму перамяшчэнне з краіны ў краіну ў пошуках лепшай долі — безумоўна, працэс натуральны. Які пры гэтым яшчэ і шмат плюсоў мае: беларускія спецыялісты за мяжой перайма-

Жыхарамі Беларусі часцей за ўсё становяцца расіяне, украінцы і казахі (прыблізна 90 працэнтаў). Дарэчы, на іх радзіму таксама выязджае пераважная большасць беларускіх эмігрантаў. Што да далёкага замежжа, то ў фаворы ў беларусаў — ЗША, Ізраіль, Канада, Германія, Польшча.

юць самыя перадавыя тэндэнцыі, набываюць карысны вопыт, павышаюць кваліфікацыю. Ды і праца іншаземцаў у нашай краіне (у тым ліку і ў такіх сферах, якія не карыстаюцца асаблівым попытам у беларусаў), безумоўна, будзе карыснай. Варта толькі аптымізаваць гэтыя працэсы дзяржаўным рэгуляваннем.

А якая была дынаміка руху ў Беларусь і з яе раней — 10, 20 гадоў таму?

— У 1990-я гады XX і ў пачатку XXI стагоддзя асноўны па аб'ёму міграцыйны паток складаў абмен насельніцтвам Беларусі з краінамі СНД і Балтыі, — расказвае Лідзія Іванчыкава. — Сальда міграцыі жыхароў з былых рэспублік СССР было найвялікшым у 1992 годзе, калі яно склала амаль 66 тыс. чалавек, пасля паступова зніжалася, і міграцыйны прырост скараціўся да 4 676 чалавек у 2007 годзе. У 1990-я гады ў Беларусь масава вярталіся тыя, хто раней выехаў на працу ці вучобу ў другія рэспублікі былога СССР, і за гэтыя гады не згубіў сваёй сувязі з ёй. Дынаміка міграцыйных патокаў гэтага перыяду была абумоўленая шэрагам разнапланавых фактараў: распад СССР, абвастрэнне канкурэнцыі на рынках працы краін з насельніцтвам тытульных нацыянальнасцяў, узнікненне нацыянальных канфліктаў у многіх рэспубліках былога СССР. Беларусь жа карысталася асаблівай папулярнасцю ў мігрантаў, паколькі была адзінай з рэспублік, дзе не было сур'ёзных міжнацыянальных канфліктаў. Усё ж такі беларуская талерантнасць — не пусты гук. Акрамя таго, эканамічны спад у Беларусі быў меншым у параўнанні з іншымі краінамі былога СССР, да таго ж, у некаторых раёнах рэспублікі былі свабодныя працоўныя месцы. З 2000 года, калі выехалі ўсе, хто быў цвёрда настроены на выезд, дадатнае сальда міграцыі стала змяншацца. Зніжэнню прытоку людзей з краін СНД і Балтыі садзейнічала таксама спыненне ваенных дзеянняў у асноўных зонах узброеных канфліктаў, спад нацыяналістычных настрояў, стабілізацыя сацыяльна-эканамічнага развіцця і адаптацыя насельніцтва да новых умоў жыцця ў большасці краін постсавецкай прасторы.

Як высветлілася, у 1990 годзе свайго піку дасягнула беларуская эмігрaцыя — тады адмоўнае сальда міграцыі склала каля 34 тыс. чалавек (гэта найвялікшая колькасць за ўсю гісторыю суверэннай дзяржавы). У наступныя гады аб'ёмы эміграцыі рэзка скараціліся.

— Гэта звязана з тым, што значная частка сем'яў, цвёрда арыентаваных на выезд, выехала адразу пасля зняцця абмежаванняў, — тлумачыць начальнік Дэпартамента па грамадзянству і міграцыі. — У выніку ў апошнія 10 гадоў у міграцыйным абароце насельніцтва Беларусі колькасць тых, хто выязджае ў іншыя краіны, раўнамерна зніжаецца да адносна стабільнага ўзроўню ў 8—11 тысяч чалавек за год.

Жыхарамі Беларусі часцей за ўсё становяцца расіяне, украінцы і казахі (прыблізна 90 працэнтаў з тых, хто прыбывае ў наш край). Дарэчы, на іх радзіму таксама выязджае пераважная большасць беларускіх эмігрантаў. Такі вось узаемны абмен атрымліваецца. Што да далёкага замежжа, то ў фаворы ў беларускіх эмігрантаў — ЗША, Ізраіль, Канада, Германія, Польшча. З-за асаблівасцяў геаграфічнага становішча ў Беларусь прыбывае яшчэ мноства транзітных мігрантаў.

Пры тым, што ў Беларусі падтрымліваецца атмасфера міжкультурнага дыялогу, міжнацыянальнай прыязнасці, усё ж прасцей інтэгравацца ў наша грамадства, на думку Лідзіі Іванчыкавай, імігрантам з краін СНД і Балтыі:

— У дэмаграфічным плане менавіта яны з'яўляюцца тым міграцыйным патэнцыялам, на які наша краіна можа разлічваць у перспектыве і які адначасова з'яўляецца найбольш пажаданым з пункту гледжання сацыяльна-эканамічных і геапалітычных інтарэсаў.

Ала МАЧАЛАВА.

ОАО «МИНСКОБЛХЛЕБОПРОДУКТ»

Бухгалтерский баланс
на 1 января 2008 г.

(млн руб.)

АКТИВ	Коды строк	На начало года	На конец отчетного периода
1	2	3	4
I. ВНЕОБОРОТНЫЕ АКТИВЫ			
Основные средства	110	**29 204**	**40 277**
Нематериальные активы	120	**15**	**8**
Вложения во внеоборотные активы	140	**2 021**	**7 491**
В том числе: незавершенное строительство	141	**305**	**621**
ИТОГО по разделу I	190	**31 240**	**47 776**
II. ОБОРОТНЫЕ АКТИВЫ			
Запасы и затраты	210	**48 834**	**60 568**
В том числе: сырье, материалы и другие активы	211	**23 262**	**28 829**
животные на выращивании и откорме	212	**4 074**	**3 852**
незавершенное производство и полуфабрикаты	213	**49**	**53**
расходы на реализацию	214	**55**	**96**
готовая продукция и товары для реализации	215	**6 699**	**8 137**
товары отгруженные	216	**11 254**	**15 624**
расходы будущих периодов	218	**3 441**	**3 977**
Налоги по приобретенным активам	220	**1 834**	**3 156**
Дебиторская задолженность	230	**6 283**	**4 834**
В том числе: покупателей и заказчиков	231	**1 104**	**262**
поставщиков и подрядчиков	232	**2 021**	**858**
разных дебиторов	233	**947**	**1 646**
прочая дебиторская задолженность	234	**2 211**	**2 068**
Расчеты с учредителями	240	**35**	**35**
В том числе: по вкладам в уставный фонд	241	**35**	**35**
Денежные средства	250	**766**	**1 007**
В том числе: денежные средства на депозитных счетах	251	**—**	**1**
Финансовые вложения	260	**1 007**	**772**
Прочие оборотные активы	270	**—**	**15 433**
ИТОГО по разделу II	290	**58 759**	**85 805**
БАЛАНС	300	**89 999**	**133 581**

ПАССИВ	Коды строк	На начало года	На конец отчетного периода
1	2	3	4
III. КАПИТАЛ И РЕЗЕРВЫ			
Уставный фонд	410	**15 473**	**15 473**
Резервный фонд	420	**216**	**319**
резервы, созданные в соответствии с учредительными документами	422	**216**	**319**
Добавочный фонд	430	**23 787**	**26 257**
Нераспределенная прибыль (непокрытый убыток)	450	**2 534**	**3 728**
Целевое финансирование	460	**840**	**6 250**
Доходы будущих периодов	470	**403**	**432**
ИТОГО по разделу III	490	**43 253**	**52 459**
IV. ОБЯЗАТЕЛЬСТВА			
Долгосрочные кредиты и займы	510	**21 867**	**41 982**
Краткосрочные кредиты и займы	520	**6 886**	**9 579**
Кредиторская задолженность	530	**17 928**	**14 487**
В том числе: перед поставщиками и подрядчиками	531	**10 710**	**9 673**
перед покупателями и заказчиками	532	**570**	**44**
по оплате труда	533	**370**	**440**
по расчетам с персоналом	534	**1**	**2**
по налогам и сборам	535	**1 068**	**1 115**
по социальному страхованию и обеспечению	536	**168**	**188**
разных кредиторов	537	**3 296**	**2 480**
прочая кредиторская задолженность	538	**1 745**	**545**
Задолженность перед учредителями	540	**60**	**181**
В том числе: по выплате доходов, дивидендов	541	**5**	**181**
прочая	542	**55**	**—**
Резервы предстоящих расходов	550	**5**	**3**
Прочие виды обязательств	560	**—**	**14 890**
ИТОГО по разделу IV	590	**46 746**	**81 122**
БАЛАНС	600	**89 999**	**133 581**
Долгосрочная кредиторская задолженность	601	**267**	**970**
Краткосрочная кредиторская задолженность	602	**17 661**	**13 517**

АКТИВЫ И ОБЯЗАТЕЛЬСТВА, УЧИТЫВАЕМЫЕ ЗА БАЛАНСОМ	Коды строк	На начало года	На конец отчетного периода
1	2	3	4
Арендованные (в том числе полученные в пользование, лизинг) основные средства	001	**472**	**1 313**
Товарно-материальные ценности, принятые на ответственное хранение	002	**2 060**	**2 632**
Материалы, принятые в переработку	003	**—**	**388**
Бланки строгой

ПОСПЕХІ АЙЧЫННЫХ БУДАЎНІКОЎ ЦЭМЕНТУЕ СУЧАСНАЯ НАВУКА

За апошняе дзесяцігоддзе ў нашай краіне зроблены значныя крокі ў прымяненні маналітнага бетону. Паўсюднае ўжыванне яго ў будаўніцтве сучасных каркасных і бескаркасных жылых дамоў стала рэальнасцю і паказвае высокую тэхналагічную эфектыўнасць пры вядзенні работ круглы год. Радуе тое, што псіхалагічны бар'ер у праекціроўшчыкаў і будаўнікоў у адносінах да маналітнага бетону, яго якасці і ўласна зімняга бетанавання практычна зняты. Гэта адбылося ў першую чаргу дзякуючы навукова-даследчым і ўкараняльным работам рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства па будаўніцтве «Інстытут БелНДІС» па стварэнні айчынных канкурэнтаздольных апалубачных сістэм, апалубачных тэхналогій інтэнсіўнага будаўніцтва розных будынкаў, тэхналогій маналітнага бетону, якія выкарыстоўваюцца пры любым надвор'і, энергазберагальных тэхналогій бетанавання, што забяспечвае высокую якасць і неабходныя тэмпы будаўніцтва.

Кіраўнік інстытута Міхаіл МАРКОЎСКІ лічыць: сёння будаўнікі атрымалі канкурэнтаздольныя тэхналогіі будаўніцтва з маналітнага бетону, што забяспечвае тэмпы ўзвядзення жылых будынкаў — 2—3 паверхі, а ў шэрагу выпадкаў і да 4 паверхаў у месяц. Зараз у інстытуце назапашаны значны вопыт распрацоўкі і ўкаранення апалубачных тэхналогій узвядзення маналітных канструкцый на будоўлях Беларусі і Расіі.

Маналітны «ізумруд ведаў»

Пры ўзвядзенні складаных па канфігурацыі будынкаў без новых тэхналогій не абысціся. Невыпадкова ў апошнія часы позіркі архітэктараў і праекціроўшчыкаў скіраваны да канструкцый з маналітнага жалезабетону, які дазваляе рэалізаваць любыя смелыя ідэі. Яркім прыкладам гэтага з'яўляецца будынак Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, дзе архітэктурныя ідэі канструкцыйна цалкам увасоблены ў маналітным жалезабетоне.

У замежнай практыцы да будаўніцтва складаных і ўнікальных аб'ектаў з маналітнага бетону прыцягваюцца выключна лепшыя фірмы, якія займаюцца тэхналогіямі будаўніцтва з ужываннем сучасных апалубачных сістэм. У свой час Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва РБ упершыню даручыла спецыялістам РУП «Інстытут БелНДІС» весці навуковае суправаджэнне такога складанага аб'екта, як Нацыянальная бібліятэка Беларусі. Мэтай суправаджэння былі распрацоўка і ўкараненне новых тэхналогій узвядзення маналітных канструкцый, якія забяспечваюць заканчэнне будаўніцтва ўсяго комплексу ў зададзеныя кароткія тэрміны.

Каркас будынка з 27 паверхаў вышыннага кнігасховішча сумесна з лесвічна-ліфтавым блокам з'яўляецца самым складаным з пункту гледжання тэхналогіі ўзвядзення. Вызначаныя дырэктыўныя тэрміны ўзвядзення аб'екта разам з аддзелкай — 32 месяцы пры нарматыўным тэрміне 71 месяц — патрабавалі выкарыстання хуткасных тэхналогій будаўніцтва маналітных канструкцый і круглагадовага вядзення бетонных работ.

Бадай самым складаным момантам у будаўніцтве бібліятэкі стала ўзвядзенне маналітных канструкцый, якія расшырыліся ўверх з 4 па 10 паверхі з адмоўным ухілам пад 45 градусаў. Сцены з вялікім вуглом нахілу практычна немагчыма апалубіць з дапамогай рыштаванняў, якія навешваюцца на сцены. Вядучыя фірмы прапаноўвалі сваю тэхналогію з закупкай спецыяльнага абсталявання за мяжой. Беларускія тэхнолагі ўзяліся за вырашэнне гэтай задачы без закупкі замежнага абсталявання.

РУП «Інстытут БелНДІС» была распрацавана і рэалізавана тэхналогія ўзвядзення нахіленай сцяны па тэхнічных, тэхналагічных і эканамічных паказчыках, якія намнога перавышалі замежныя аналагі. Такая тэхналогія толькі на гэтай сцяне дазволіла цалкам адмовіцца ад імпарту дарагіх рыштаванняў, што прынесла эканамічны эфект ад імпартазамяшчэння каля 4—5 мільёнаў еўра.

Увогуле ж пры ўзвядзенні маналітнага бетоннага каркаса Нацыянальнай бібліятэкі выкарыстоўваліся сістэмы апалубкі айчыннай і замежнай вытворчасці. Разам з тым было прыменена шмат індывідуальных рашэнняў спецыялістаў інстытута, бо для гэтага аб'екта ўвогуле не існавала пэўных гатовых сістэм апалубкі. У асобных выпадках да апалубачных сістэм былі прыменены нестандартныя падыходы, якія на першы погляд здаваліся нават авантурнымі, але былі дасканала разлічаны і на практыцы прынеслі станоўчы вынік.

Тэхналагічнасць маналітных канструкцый на працягу ўсяго будаўніцтва неаднаразова разглядалася і карэкціравалася сумеснымі намаганнямі навукоўцаў, праекціроўшчыкаў і будаўнікоў, бо яна звязана не толькі з тэрмінамі будаўніцтва, але і цалкам паўплывае на эканамічнасць і якасць маналітных канструкцый. Экспертамі падлічана, што сумарны эканамічны эфект толькі ад укаранення апалубачных тэхналогій і імпартазамяшчэння апалубкі дасягнуў 10 мільёнаў еўра. Мінбудархітэктуры адзначыла, што будаўнічая навука на гэтым аб'екце ў рамках навуковага суправаджэння прадэманстравала сваю высокую кваліфікацыю пры вырашэнні складаных тэхналагічных праблем.

Міхаіл Маркоўскі родам з Драгічынскага раёна. Пасля заканчэння Брэсцкага інжынерна-будаўнічага інстытута працаваў канструктарам стальных металаканструкцый на адным з заводаў Мінска. Незаменную практыку будаўнічай пляцоўкі атрымаў у ваенна-будаўнічым атрадзе Балтыйскага флоту. Пасля службы пачалася праца ў інстытуце, дзе Міхаіл Піліпавіч прайшоў усё прыступкі службовай лесвіцы, пачынаючы ад старшага інжынера. Займаў пасады загадчыка лабараторыі, намесніка дырэктара па навуковай рабоце. Кандыдат тэхнічных навук. Аўтар больш за 230 навуковых прац. Прымаў непасрэдны ўдзел у падрыхтоўцы нарматыўных дакументаў, напісаў некалькі кніг і падручнік, прысвечаныя тэхналогіі маналітнага бетанавання.

Разам з тым пераход да вышыннага будаўніцтва ў нашай краіне абавязкова б вызначыў істотны скачок у тэхнічным прагрэсе па ўсіх напрамках — у праектнай справе, архітэктуры, інжынерных камунікацыях, тэхналогіях і г.д. У суседніх Расіі і Украіне гэты напрамак зараз бурна развіваецца. Паводле апошніх даных, Кіеў наладзіць у хуткім часе будаўніцтва да 100 хмарачосаў. Там адшукваюцца для гэтага і фінансавыя сродкі, і арганізацыі-забудоўшчыкі. Аднак для ўзвядзення вышынных будынкаў у нашай краіне трэба спачатку вырашыць шэраг праблемных момантаў, якія будуць узнікаць пры ажыццяўленні такога будаўніцтва. Адна з актуальных задач датычыцца тэхналогіі ўзвядзення вышынных пабудоў. Калі пры ўзвядзенні збудаванняў да 100 метраў яшчэ магчыма выкарыстоўваць бетон класаў В-40 і В-50, то для будынкаў вышынёй каля 200 метраў неабходна мець бетон В-80, В-90 і вышэйшага класа. Маскоўскія спецыялісты асвоілі выраб бетону В-80 і В-90, дзе розных дабавак прысутнічае амаль столькі, колькі самога цементу. Такі бетон мае асаблівыя ўласцівасці, патрабуе спецыяльных метадаў кантролю.

Увогуле ў свеце існуе ўсяго каля дзесятка буйных арганізацый, якія практыкуюць узвядзенне вышынных будынкаў. Яны валодаюць карпаратыўнай інфармацыяй, якая пільна захоўваецца.

У хмарачосаў вельмі складаныя інжынерныя сістэмы. Напрыклад, выкарыстанне звычайнага для нашых дзевяціпавярховак смеццепровода робіцца немагчымым, таму прапануюцца спецыяльныя затворы або кантэйнеры. Нельга ў такіх будынках наладжваць па ўсёй вышыні традыцыйны водаправод і каналізацыю. Вельмі вынушальныя габарыты: даўжыня 308 м, шырыня — ад 88 да 94 м, глыбіня — ад 13 да 16 м, плошча тыповага паверха — 23 тыс. кв. м.

Пры навуковым суправаджэнні інстытута імкліва будуецца «Мінск-Арэна».

Будаўніцтва гэтага складанага аб'екта было даручана ААТ «Мінскпрамбуд». Творчае супрацоўніцтва работнікаў трэста і спецыялістаў інстытута БелНДІС дазволіла рэалізаваць на практыцы новыя інтэнсіўныя апалубачныя тэхналогіі.

Сціслыя тэрміны ўзвядзення падземнага збудавання патрабавалі сумяшчэння земляных работ па выкопванні катлавана і бетонных на фундаментнай пліце. У сувязі з гэтым навукоўцамі інстытута яшчэ на стадыі распрацоўкі апалубачных тэхналогій было прапанавана адмовіцца ад усіх элементаў, якія выступаюць, рэкамендавана выкарыстоўваць суцэльную маналітную пліту замест рабрыстых пліт і паўсюдна гладкую столь. Гэта дазволіла паскорыць тэмпы будаўніцтва і павысіць якасць узвядзення аб'екта. Усе базавыя канструкцыі падземнага горада былі выкананы з маналітнага жалезабетону без ніводнага зборнага элемента.

Пры будаўніцтве гэтага аб'екта агульны аб'ём выкарыстанага бетону дасягнуў 66 тысяч кубаметраў. Трэба адзначыць, што пры ўзвядзенні маналіту ў першую чаргу былі задзейнічаны айчынныя канкурэнтаздольныя апалубачныя тэхналогіі, якія былі створаны ў інстытуце БелНДІС пад кіраўніцтвам кандыдата тэхнічных навук Міхаіла Маркоўскага.

Вынікам паточнага будаўніцтва гэтага аб'екта, якое вялося практычна «з колаў», стала тое, што зямлю пад катлаван капалі сучаснымі механізмамі і грунт вывозілі машынамі год і тры месяцы, а каркас з маналітнага жалезабетону ўзвялі менш чым за год. Тэрміны будаўніцтва ўсяго аб'екта наогул былі скарочаны амаль у два разы.

Узвядзенне ўнікальных помнікаў — па сілах

Па даручэнні кіраўніцтва Мінска РУП «Інстытут БелНДІС» распрацаваў апалубачную тэхналогію ўзвядзення маналітных канструкцый шатра «Храма-помніка ў гонар Усіх Святых у памяць бязвінна забітых у Айчыне» ў сталіцы па вуліцы Каліноўскага. У саборах такога тыпу выкарыстоўваецца самая складаная архітэктура па геаметрыі. Унушальныя памеры збудавання па вышыні (67 метраў да асновы крыжа) і складанасць геаметрычных формаў маналітных канструкцый храма патрабавалі смелых і нестандартных тэхналагічных рашэнняў. Распрацаваная інстытутам тэхналогія дазволіла весці будаўнічыя работы з мінімальнымі затратамі працы і выдаткамі, і адмовіцца ад набыцця дарагой замежнай апалубачнай тэхнікі. Усе работы па маналітным бетанаванні былі выкананы прадпрыемствам «Маналіт» дзякуючы распрацаваным інстытутам тэхналогіям усяго за 2 месяцы. Узвядзенне гэтага аб'екта паказала, што маналітны бетон можа паспяхова «сябраваць» з усімі архітэктурнымі формамі.

Апалубачная тэхналогія ўзвядзення маналітнага перакрыцця шматпавярховага жылога дома на скрыжаванні праспекта Ракасоўскага і вуліцы Пляханава.

Сучасныя хмарачосы ў горадзе Шанхаі ў Кітаі.

Будучыня за вышынным будаўніцтвам

Сёння сістэма вышыннага будаўніцтва ў нашай краіне патрабуе самай пільнай увагі на ўсіх узроўнях. Вядома, што ўзвядзенне будынкаў, вышэйшых за 75 метраў, адносіцца да вышыннага будаўніцтва. Аднак, паводле інфармацыі дырэктара Беларускага навукова-даследчага інстытута будаўніцтва Міхаіла Маркоўскага, у Беларусі па такім будаўніцтве пакуль няма амаль ніякіх нарматыўных дакументаў.

Сёння мінчане і госці сталіцы ўжо маюць магчымасць ацаніць канчатковыя вынікі будаўніцтва падземнага цэнтра «Сталіца».

сокія патрабаванні да ліфтавага абсталявання. Як будзе функцыянаваць сістэма геадэзічнага кантролю і маніторынгу? На якім узроўні і якім чынам будзе падтрымлівацца сістэма проціпажарнага забеспячэння? Пытанняў без дакладных адказаў застаецца пакуль даволі шмат, але яны ўзнімаюцца і паступова вырашаюцца. Зараз ідзе напрацоўка нарматыўных дакументаў па гэтым накірунку. Да іх распрацоўкі сёння прыцягваюцца вядучыя спецыялісты і калектывы практычна ўсіх навуковых і праектных інстытутаў краіны. Праект нарматыўных дакументаў па вышынным будаўніцтве на стадыі распрацоўкі атрымлівае шмат заўваг з боку айчынных і замежных спецыялістаў. Гэтыя заўвагі будуць абавязкова разглядацца і ўлічвацца. Трэба адзначыць, што ў Кіеве, Маскве і ў многіх краінах замежжа за аснову ўзвядзення вышынных будынкаў пакладзены менавіта маналітны жалезабетон, з якім беларускія будаўнікі «сябруюць» усё часцей. На дадзеным этапе беларускія эксперты вывучаюць вопыт будаўніцтва вышынных будынкаў на прыкладзе розных навуковых распрацовак у іншых краінах свету.

Вянец супрацоўніцтва будаўнікоў і навукі

На гэты час бадай самай галоўнай будоўляй краіны лічыцца ўзвядзенне ў сталіцы грандыёзнага комплексу «Мінск-Арэна». Культурна-спартыўны комплекс складаецца з чатырох самастойных збудаванняў: цэнтральнай арэны на 15 тысяч гледачоў, канькабежнага стадыёна, велатрэку і паркінгу. Генеральным падрадчыкам аб'екта з'яўляецца адна з лепшых будаўнічых арганізацый — ААТ «Мінскпрамбуд». Карэспандэнту «Звязды» пашчасціла наведаць гэты аб'ект разам з намеснікам тэхнічнага дырэктара «Мінскпрамбуда» Сяргеем МАРАЛІНЫМ і дырэктарам БелНДІСа Міхаілам МАРКОЎСКІМ.

— Дапамога навукоўцаў заключаецца ў падборы відаў бетону, распрацоўцы канфігурацый і тыпаў апалубкі, вызначэнні і распрацоўцы сістэм, якія падтрымліваюць канструкцыі пры маналітным будаўніцтве і гэтак далей, — расказвае Сяргей Маралін.

— Ці справіліся б вы без навуковага суправаджэння па маналітным жалезабетоне з боку інстытута БелНДІС пры ўзвядзенні аб'ектаў такой складанасці?

— Усё магчыма зрабіць і ўласнымі сіламі, але... Пры навуковым суправаджэнні многія нават каверзныя задачы вырашаюцца значна лягчэй і хутчэй. Акрамя гэтага, навуковыя ноў-хаў, што прапануюцца інстытутам і ўкараняюцца намі на такіх буйных аб'ектах, дазваляюць атрымліваць істотны эканамічны эфект. Гэта даволі вялікія грошы, якія эканоміць і наша арганізацыя, і дзяржава.

— Калі мы толькі пачыналі будаўніцтва комплексу «Мінск-Арэна», то па стартавым праекце разлічвалі ўкласціся ў 50 тысяч кубічных метраў бетону, — працягвае распавядаць Сяргей Маралін. — Пасля сур'ёзнай дадатковай распрацоўкі ўжо зараз на ўзвядзенні задзейнічана амаль 70 тысяч кубічных метраў такога бетону. Вы чуеце, як зямля вакол гудзе? Дзякуючы прапановам навукоўцаў працэс узвядзення «Мінск-Арэны» не спыняецца ні на хвіліну на ўсіх будаўнічых пляцоўках комплексу.

ДАВЕДКА:

Эксперты-будаўнікі канстатуюць, што як і пры будаўніцтве Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, так і на комплексе «Мінск-Арэна» пры рэальным праектаванні адбываецца ўскладненне маналітных канструкцый у параўнанні з першапачатковымі архітэктурнымі чарцяжамі. Тэмпы будаўніцтва ў гэтым выпадку істотна скарачаюцца. Відавочна, што пры сціслых тэрмінах будаўніцтва і высокіх тэмпах узвядзення тэхналагічнасць маналітных канструкцый робіцца галоўным фактарам. Спецыялісты адзначаюць, што ўпершыню ў айчыннай практыцы ўзвядзенне такога маштабнага комплексу ажыццяўляецца практычна адначасова па ўсіх чатырох самастойных збудаваннях.

— Пры будаўніцтве комплексу «Мінск-Арэна» супрацоўнікі нашага інстытута не толькі навукова суправаджаюць узвядзенне аб'екта, але і рэальна распрацоўваюць у рабочым парадку тэхналогіі, схемы і карты па будаўніцтве аб'ектаў, дзе выкарыстоўваецца маналітны бетон, — паказвае «кухню» супрацоўніцтва дырэктар Беларускага навукова-даследчага інстытута будаўніцтва Міхаіл Маркоўскі. — Якія схемы расстаноўкі апалубкі, як яе ўмацоўваць, як перасоўваць, дзе рабіць індывідуальную апалубку, як яе выкарыстоўваць? На гэтыя і іншыя больш складаныя спецыфічныя пытанні мы даём дакладныя адказы і прапануем слушныя рэкамендацыі. Часам даводзіцца рабіць прапановы па канструкцыях. Так, раней праекціроўшчыкі збіраліся рабіць ступеньчатую столь, але нашы спецыялісты запэўнілі, што лепш выкарыстоўваць гладкую паверхню, і гэта будзе хутчэй і танней. У выніку якасць збудавання ад гэтага толькі выйграла. Даволі паспяхова працуем па мадыфікаванаму бетону, дзе прапануем розныя саставы, рэжымы, умовы і правілы бетанавання зімой ад летам, кантралюем трываласць бетону. Шмат прапаноў па комплексу зроблена інстытутам на стадыі праектных рашэнняў з улікам тэхналогіі ўзвядзення аб'екта.

— Міхаіл Піліпавіч, на ваш погляд, будаўніцтва трэба весці сумесна з навуковым суправаджэннем на ўсіх буйных аб'ектах?

— Нас запрашаюць для супрацоўніцтва амаль заўсёды ў тых выпадках, калі будуецца сапраўды складаны аб'ект, калі патрэбна выкарыстоўваць незнаёмую тэхналогію, смелыя метады і іншыя неардынарныя рашэнні — усё тое, што робіцца ў Беларусі ўпершыню.

Я цалкам упэўнены: няхай лепш навукоўцы здзейсняць рацыянальны экспромт на паперы, чым рызыкаваць экспромтам непасрэдна пры будаўніцтве. Эксперыментаваць у будаўніцтве заўсёды атрымліваецца сабе даражэй. Апошнім часам навука сапраўды робіцца вытворчай сілай, бо тое, што мы прапануем, і тое, што робім (пакуль не ў масавым парадку) прыносіць пэўны эканамічны эфект. Менавіта таму нам будаўнікі і давяраюць, усё часцей кансультуюцца. Цяпер ужо ўсім бачны вынікі нашага супрацоўніцтва, калі ў гарадах узводзяцца сапраўды ўнікальныя аб'екты пры навуковым суправаджэнні інстытута.

— Усе будтрэсты гэта разумеюць?

— Раскрыю вам адзін сакрэт. Існуе адна заканамернасць: менавіта перадавыя будаўнічыя арганізацыі даволі актыўна сябруюць з нашым інстытутам, а вось тыя, якія адстаюць... Мабыць, у іх не хапае часу ці няма жадання супрацоўнічаць з навукоўцамі. Мы адкрыты для ўсіх.

Сапраўдны ўзор плённага супрацоўніцтва з навукай паказвае генеральны падрадчык грандыёзнага комплексу «Мінск-Арэна» — славутае прадпрыемства ААТ «Мінскпрамбуд». Першы маналітна-каркасны жылы дом быў узведзены гэтай арганізацыяй. І першыя складаныя аб'екты з маналітнага бетону былі зроблены таксама імі. Падземны грамадска-гандлёвы цэнтр «Сталіца» быў узведзены калектывам зноў жа Мінскпрамбуда. Узведзеныя ўнікальныя аб'екты гавораць аб сур'ёзных прафесійных напрацоўках прадпрыемства. Менавіта гэтае будаўнічае аб'яднанне дэманструе дастойнае і ўзаемавыгаднае супрацоўніцтва навукі і вытворчасці і атрымлівае станоўчыя вынікі. Інстытут разам з ААТ «Мінскпрамбуд» дасягнулі зараз такога ўзроўню супрацоўніцтва, што ўспрымаюць праблемы і прапановы адзін другога амаль інтуітыўна. Сёння ўсе навінкі па маналітным бетоне выкарыстоўваюцца першымі менавіта спецыялістамі Мінскпрамбуда. Упэўнены, што галоўнай прыкметай канкурэнтаздольнасці будаўнічых арганізацый у сучасных умовах з'яўляецца саюз з навукай.

«Храм-помнік у гонар Усіх Святых» на вуліцы Каліноўскага ў Мінску.

Пасля наведвання «Мінск—Арэны» карэспандэнт «Звязды» больш грунтоўна пагутарыў з дырэктарам навукова-даследчага рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства па будаўніцтве «Інстытут БелНДІС» Міхаілам МАРКОЎСКІМ.

— Летась інстытут адзначыў сваё 50-годдзе. Ці ўдаецца вам захоўваць накопленыя за гэты час багатыя традыцыі?

— Станаўленне калектыву ішло ў пасляваенныя гады і, па сутнасці, адтуль і пачалася прыкладная беларуская будаўнічая навука. Да слова сказаць, у інстытуце і сёння працуе нямала ветэранаў, якія аддалі будаўнічай навуцы ўсё жыццё. У нас і зараз працуюць два спецыялісты, якія працягваюць сваю прафесійную дзейнасць з дня заснавання інстытута. Адзін з іх — доктар тэхнічных навук, прафесар Мікалай Паўлавіч Блешчык, заслужаны дзеяч навукі, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі. Гэты чалавек і зараз у страі і з'яўляецца прыкладам для калег, у тым ліку і для мяне. Яшчэ некалькі супрацоўнікаў прыйшлі ў інстытут фактычна школьнікамі, потым скончылі ВНУ і з'яўляюцца вядучымі спецыялістамі. Ёсць цэлыя дынастыі — працуюць ужо дзеці і ўнукі. Не дзіва, што БелНДІС стаў сапраўднай кузняй навуковых кадраў. У нас цудоўны прафесійны калектыў, які складаецца з унікальных спецыялістаў, яны дакладна ведаюць сваю справу. За кожным накірункам стаіць канкрэтны чалавек або група людзей, ім даверяюць у міністэрстве і ў будаўнічых арганізацыях. Захоўваецца пераемнасць лепшых традыцый. Маладым дапамагае трывала станавіцца на ногі ўласная аспірантура, самы надзейны спосаб узрасціць вучонага — праз аспірантуру, якая так блізка, як наша, стаіць да вытворчасці.

— Якія новыя накірункі будаўнічай навукі сёння разглядаюцца ў інстытуце?

— У бліжэйшай перспектыве нас чакае складаная, але і цікавая праца ў сферы вышыннага будаўніцтва. Пачынаем з распрацоўкі ўсіх неабходных нарматыўных дакументаў. Паралельна будзем энергічна займацца распрацоўкай тэхналогіі хуткаснага ўзвядзення аб'ектаў з выкарыстаннем новых высокатрывалых бетонаў, а таксама новымі канструкцыямі фундаментаў і спадарожнымі напрамкамі вышыннага будаўніцтва.

— Аб якой паверхавасці, на ваш погляд, пры вышынным будаўніцтве жылых дамоў можа ісці гаворка на першым этапе ажыццяўлення гэтага напрамку ў нашай краіне?

— Хутчэй за ўсё, гэта будуць будынкі па 40—50 паверхаў. Мне здаецца, што на першым этапе ў Беларусі трэба пачынаць будаваць хмарачосы вышынёй да 100 метраў. Для ўзвядзення такіх вышынных аб'ектаў неабходна спачатку наладзіць адпаведную тэхналогію будаўніцтва, атрымаць пэўны практычны вопыт будаўніцтва. Сёння мы не гатовыя ісці на рэкорды з большымі вышынямі як па фінансавых затратах, так і па тэхнічных параметрах. Хмарачосы больш за 100 метраў з'яўляюцца ўнікальнымі і вельмі адказнымі збудаваннямі, якія будуюцца не на 25 гадоў, а мінімум на стагоддзе. Толькі ўтрыманне такіх будынкаў мае найвышэйшую ступень складанасці, у сістэму якой уваходзіць ахова самога аб'екта, сучаснае пажаратушэнне, сістэма назірання за будынкам, навуковы маніторынг магчымых адхіленняў. Гэтай сістэмай трэба навучыцца кіраваць.

— Пры падрыхтоўцы макетаў будучых айчынных хмарачосаў будуць выкарыстоўвацца распрацоўкі сучасных перадавых «вышыннікаў»?

— Дакладна капіраваць ужо існуючыя тэхналогіі па гэтым накірунку мы не збіраемся. Сучасныя сусветныя напрацоўкі будуць абавязкова карэкціравацца з улікам беларускіх эканамічных і іншых умоў, спецыфікі падрыхтоўкі айчынных кадраў і г.д. Разам з тым, нягледзячы на міжнародны аўтарытэт, мы збіраемся прапаноўваць і шэраг уласных напрацовак, якія былі паспяхова выкарыстаны пры ўзвядзенні ўнікальных аб'ектаў з маналітнага жалезабетону.

— Наколькі вядома, яшчэ адным новым напрамкам інстытута стане падрыхтоўка да прымянення новай тэхналогіі поўназборных індывідуальных дамоў на аснове металічнага каркасу?

— Так, такія дамы магчыма будзе ўзводзіць не толькі ў вёсках і аграгарадках, але і ў якасці прыватных сядзібаў у прыгарадах сярэдніх і буйных гарадоў. Каркас такіх будынкаў будзе ўзводзіцца з ацынкаваных танкасценных профіляў таўшчынёй усяго да 2 міліметраў. Зборка будзе ажыццяўляцца простымі метадамі — шрубамі, гайкамі, без зваркі, у ручным рэжыме. Пасля гэтага ставіцца ацяпляльнік і арпацоўваецца сучаснымі матэрыяламі. Такая тэхналогія дазволіць узводзіць індывідуальныя жылыя дамы любой канфігурацыі з рознымі архітэктурнымі рашэннямі.

— Як хутка такія дамы могуць з'явіцца ў беларускіх населеных пунктах?

— На першым этапе будаўніцтва такіх дамоў будзе ажыццяўляцца ў якасці эксперыменту сумесна з Маладзечанскім заводам лёгкіх металаканструкцый. Сёння завадчане закупілі ў Расіі неабходную колькасць профіляў для зборкі аднаго такога дома. Пасля будаўніцтва дома такой канструкцыі будзем падлічваць усе магчымыя плюсы і мінусы пабудовы. Трэба дакладна ведаць, колькі такі дом рэальна каштуе, якая якасць выгод; будзе вымерана цеплатэхніка і акустыка. Пасля гэтага з'явіцца рашэнне аб будаўніцтве такога жылля ў вялікіх маштабах, або аб тым, што пакуль варта крыху пачакаць. З улікам таго, што кошт асноўных будаўнічых матэрыялаў сёння хутка павялічваецца і маецца дэфіцыт кваліфікаваных будаўнікоў, магчыма, што новая тэхналогія, якая дазваляе ўзводзіць дамы з мінімальнай працаёмкасцю, будзе запатрабавана нават у тых выпадках, калі сабекошт такога жылля будзе крыху большым за цэннік існуючых традыцыйных аб'ектаў.

— Заказчыкамі на навуковае суправаджэнне вашага інстытута з'яўляюцца буйныя будтрэсты. Наколькі выгадна ім карыстацца вашымі паслугамі?

— Перадавыя будтрэсты і арганізацыі ўкараняюць сучасныя навуковыя распрацоўкі, якія прапаноўвае наш інстытут, і такім чынам значна павялічваюць сваю канкурэнтаздольнасць. Калі б у нашай краіне з'явіўся магутны эканамічны стымул укаранення будаўнічых ноў-хаў, тады мы разам дасягнулі б яшчэ большых поспехаў.

Зараз супрацоўніцтва з навукай дазваляе арганізацыям эканоміць, але рэальна будтрэсты ад гэтай эканоміі атрымліваюць мінімальны эфект. Пакуль такое супрацоўніцтва з навукоўцамі падтрымліваецца амаль на голым энтузіязме. Так, у перадавых арганізацыях энтузіясты-прафесіяналы займаюцца новымі распрацоўкамі не столькі для атрымання сённяшняй выгады, але галоўным чынам для перспектывы будучага развіцця вытворчасці.

— Міхаіл Піліпавіч, на ваш погляд, па якім шляху павінна развівацца будаўнічая навука ў Беларусі бліжэйшым часам?

— Адразу заўважу, што фінансаванне навуковых распрацовак галоўным чынам ажыццяўляецца з боку Мінбудархітэктуры. Без цэнтралізаванага фінансавання новыя распрацоўкі ажыццявіць было б немагчыма. Зараз супрацоўнікі інстытута актыўна займаюцца распрацоўкай па многіх навуковых напрамках: канструкцый будынкаў, матэрыялаў і тэхналогій хуткаснага будавання з давядзеннем распрацовак да нарматыўнай базы РБ. У Расіі і ва Украіне ў будаўнічым заканадаўстве існуе блытаніна і часам беззаконне. Айчынныя ж спецыялісты зараз распрацоўваюць вельмі шмат неабходных дакументаў. Трэба добра ўсведамляць, што новыя нарматывы — гэта новыя тэхналогіі і новыя будаўнічыя матэрыялы, якія раскрываюць дарогу ў будучыню.

У бліжэйшай будучыні будаўнічая навука абавязкова скажа сваё важкае слова ў рэалізацыі маштабных задач па жыллёвым будаўніцтве. Зніжэнне яго тэрмінаў, павышэнне якасці і ўтрыманне нізкага сабекошту — сапраўдная прастора для ўкаранення навуковых даследаванняў.

Публікацыю падрыхтавалі Сяргей КУРКАЧ і Вераніка ХІЛЬКЕВІЧ. Здымкі прадастаўлены БелНДІСам.

УНП 100230600

Каркас з маналітнага жалезабетону быў прыменены пры будаўніцтве жылога дома на вуліцы Дзянісаўскай.

Матывацыя вялікая, а шанцы?

Беларуская жаночая зборная па баскетболе рыхтуецца да кваліфікацыі ў Мадрыдзе, дзе будзе змагацца за пропуск на Алімпіяду ў Пекіне

Фота Вольгі ЛАСКІ.

У чэрвені ўвага беларускіх балельшчыкаў будзе прыцягнута, вядома, да футбола. Аднак не варта забывацца, што ў гэты ж час — гарачая пара і ў беларускіх баскетбалістак. На адборачным турніры ў Мадрыдзе бронзавыя прызёры Еўра-2007 паспрабуюць здабыць пропуск на Алімпійскія гульні. Як каманда рыхтуецца да такіх адказных спаборніцтваў, расказаў **галоўны трэнер Анатоль БУЯЛЬСКІ.**

— 25 мая мы адлятаем на таварыскі матч у Чэхію, потым — у Латвію, дзе таксама правядзём спарынгі, — паведаміў ён. — 3 чэрвеня мы вяртаемся ў Мінск, а 7-га адпраўляемся на кваліфікацыйны турнір у Іспанію. Хто канкрэтна паедзе ў Мадрыд, мы вызначым пасля кантрольных гульняў, на якія бяром 14 ігракоў.

— Ці дапамогуць спарынгі з чэшкамі і латышкамі змадэляваць гульні з саперніцамі па алімпійскай кваліфікацыі?

— Гэта лепшы варыянт, бо Чэхія і Латвія зараз — самыя арганізаваныя, баяздольныя зборныя Еўропы, іншыя каманды пакуль знаходзяцца не ў поўным складзе. Чэшкі неаднойчы ўдзельнічалі ў Алімпіядзе. Акрамя таго, таварыскія матчы мы праводзім у гасцях (у нас жа няма ніводнай залы, дзе можна было б прыняць зборныя), і расходы на сябе бяруць гаспадары. Да нас паступалі прапановы згуляць яшчэ з Аўстраліяй і Кітаем, але навошта нам ехаць так далёка?

— Якія праблемы вас хвалююць?

— Тры баскетбалісткі трэніруюцца па індывідуальнай праграме, бо яны адпачываюць ад напружаных чэмпіянатаў. Аднак наша асноўная праблема — недахоп часу. Да чэмпіянату Еўропы мы рыхтаваліся два з паловай месяцы, а зараз у нас часу амаль не застаецца. У ідэале патрэбна было б дазволіць ігракам аднавіцца, а мы вымушаны адразу пачаць працаваць.

— Пасля жараб'ёўкі адборачнага турніру вы казалі, што засталіся незадаволеныя яе вынікамі. Якія козыры будзеце выкарыстоўваць, каб справіцца з камандамі-саперніцамі ў групе «D»?

— Мы вымушаны змяніць тактыку гульні, якую выкарыстоўвалі на чэмпіянаце Еўропы, бо сапернікі пра яе ўжо ўсё ведаюць. А незадаволены вынікамі жараб'ёўкі я таму, што нам дастаўся самы горшы варыянт — другая і трэцяя каманды Амерыкі, дзе баскетбол — спорт № 1. Аднак мы ўжо звыклася з гэтым, ды і матывацыя ў зборнай вялікая. Індывідуальны спартсмен можа «стрэліць» і на наступны год, а каманда — больш складаны арганізм. Цяжка захаваць той жа склад, ды яшчэ, каб усе ігракі былі ў нармальнай форме. Акрамя таго шанц — паехаць зборнай на Алімпіяду — выпадае, можа, толькі раз. Мы адзіныя з беларускіх зборных, хто рэальна можа паехаць на летнія Гульні ў Пекіне.

— Калі наша каманда выйдзе з папярэдняга этапу кваліфікацыі, адны з патэнцыяльных саперніц — іспанкі. У іх будзе дадатковы бонус дзякуючы статусу гаспадынь. Акрамя таго на Еўра вы так і не змаглі выйграць у гэтай каманды...

— Усё залежыць, якое мы месца зоймем у групе. Калі 1-е, то мы выходзім на Бразілію, трэцюю каманду Амерыкі. Калі ж 2-е, то, сапраўды, на Іспанію. Сярэбраныя прызёры чэмпіянату Еўропы зараз на піку формы і выйграць у іх дома будзе цяжка, але мы ўжо не тая каманда, калі мы ехалі на Еўра ў Італію. У нас ёсць вопыт і аўтарытэт.

— У Мадрыд вы возьмеце на ўдачу нейкі талісман?

— Я не веру ў забабоны. Я галюся кожны дзень і адзенне штодня мяняю спакойна. Мой вопыт паказвае, што талісманы не ўплываюць на вынікі маёй каманды. Зразумела, у мяне існуюць свае сакрэты настрою каманды, але гэта, як кажуць, для службовага карыстання.

— Вы не так даўно вярнуліся са стажыроўкі ў Амерыцы. Якія ўражанні?

— Неверагодныя. Я працаваў і ў мужчынскай, і ў жаночых камандах. Хоць гэта быў і студэнцкі баскетбол, але ён у Амерыцы — творчая лабараторыя, дзе з'яўляюцца новыя зоркі гульні. Арганізавана там усё на найвышэйшым узроўні. Мне было цікава зазірнуць на «кухню» амерыканскага баскетбола.

Ірына ПРЫМАК.

«Еўрабачанне-2008»

НАСТУПНЫ ПРЫПЫНАК — МАСКВА

24 мая ў Бялградзе адбылася сапраўдная сенсацыя. Нягледзячы на прагнозы і прадраканні многіх скептыкаў, упершыню за 53 гады перамогу ў еўрапейскім песенным конкурсе заваявала Расія. Спявак Дзіма Білан з песняй «Believe» набраў 272 балы, захаваўшы пераканаўчы адрыў ад бліжэйшых сапернікаў — Ані Лорак з Украіны (230 балаў) і Каламіры з Грэцыі (218 балаў). Такім чынам, Білан не толькі ўзяў асабісты рэванш за другое месца ў «Еўрабачанні-2006», але і працягнуў «пераможную паласу» Расіі, пачатак якой паклалі некалькі спартыўных дасягненняў запар.

Фота БЕЛТА.

Увогуле фінальная дзесятка выглядае наступным чынам: Расія, Украіна, Грэцыя, Арменія, Нарвегія, Сербія, Турцыя, Азербайджан, Ізраіль, Боснія і Герцагавіна. Асобнай пахвалы ў гэтым спісе заслугоўвае азербайджанскі дуэт Эльнура і Саміра — краіна-дэбютант вельмі ўпэўнена трапіла ў спіс лепшых. Праўда, паводле новых правілаў, для ўсіх, акрамя пераможцы і «вялікай чацвёркі» (Вялікабрытанія, Германія, Іспанія, Францыя) барацьба налета пачнецца зноў з паўфіналам, але старт у Азербайджана атрымаўся ўдалы.

Галоўныя ж віншаванні, безумоўна, дасталіся камандзе «трох мушкецёраў», як паспела ахрысціць іх расійская прэса — скрыпачу Эдвіну Мартану, алімпійскаму чэмпіёну па фігурным катанні Яўгену Плюшчанку і самому спеваку Дзіму Білану. Ну і, безумоўна, рухавіку ідэі — прадзюсару Яне Рудкоўскай, якая ў шэрагу судовых іскаў усё ж адстаяла сцэнічнае імя свайго падапечнага і ўвогуле яго права прадставіць Расію на конкурсе. Аб гэтым выбары цяпер, напэўна, ніхто ў краіне не шкадуе. Адным з першых датэлефанаваўся да артыстаў і выказаў словы падзякі прэзідэнт РФ Дзмітрый Мядзведзеў, потым прыйшла чарга сяброў і калег па сцэне, а ўжо якая эйфарыя была ў Маскве па прылёце дэлегацыі, і ўявіць цяжка. У роднай для Дзімы Білана Карачаева-Чаркесіі яму збіраюцца прысвоіць званне народнага артыста, а таксама назваць яго імем музычную школу і вуліцу ў горадзе Усць-Джагут.

АКТУАЛЬНАЕ

Цяпер, натуральна, можна да хрыпаты спрачацца, што зрабіла большы ўнёсак у агульную перамогу — слава фігурыста або скрыпка Страдзівары, пастаноўка з лядовымі дэкарацыямі або ўласна песня. Можна даводзіць, што 10 балаў ад Венгрыі Расія зарабіла выключна дзякуючы нацыянальнасці Эдвіна Мартана, што былі куплёнымі аператары сотавай сувязі пры галасаванні, і што І месца «падарылі» свайміі баламі славянскія краіны (як быццам «сярэбраны» прызёр Украіна не належыць да славян)... А можна проста сесці і спакойна прааналізаваць сітуацыю. Напрыклад, у выніковай табліцы чорным па беламу бачна, што ўвогуле не далі Расіі балаў усяго 6 краін з 43. Там жа лёгка падлічыць, што постсавецкіх і балканскіх краін у «Еўрабачанні» ўдзельнічала амаль роўная колькасць — 9 і 7 адпаведна, — але чамусьці прыгожая балада Сербіі толькі на 5-м месцы. Больш за ўсіх найвышэйшых балаў, «дванаццатак», у галасаванні набрала Арменія — 8, у Расіі і Грэцыі — па 7, у Сербіі — 4, у той час як ва Украіны — усяго адна. Гэта чыстая матэматыка. Далей ідзе простае назіранне: нават без лупы відавочна, што ўладальніцы 2—4 месцаў, украінская, грэчаская і армянская спявачкі, надзвычай падобныя паміж сабой — магчыма, таму ніводная з іх і не паднялася вышэй. Зрэшты, канчаткова справядлівасць выбару Еўропы стане зразумелая пазней, па колькасці ратацый і выступленняў пераможцы. Пакуль жа, напэўна, варта ўзгадаць два даўнія пастулаты. Па-першае, пераможцаў не судзяць. Па-другое, конкурс — усякі, акрамя чыста тэхнічнага спартыўнага спаборніцтва — рэч суб'ектыўная і непрадказальная.

АСАБІСТАЕ

У якасці эксперыменту мы правялі міні-апытанне сярод калег. Вынікі былі ўзорна-паказальнымі: у двух дзесяткаў чалавек — 10 розных фаварытаў. Але найбольш яскрава незразумеласць крытэрыяў і непрадказальнасць вынікаў, пэўна, адлюстравалася ў выступленні нашага Руслана Аляхно, шанцы якога ў паўфінале практычна ўсе ацэньвалі як вельмі неблагія. Сталася ж зусім інакш — песня «Hasta la Vista» набрала толькі 27 балаў (сума ацэнак ад Украіны, Кіпра, Латвіі, Літвы і Грузіі) і аказалася на 17 месцы з 19 выступоўцаў. Але ж гэта не трагедыя. І Руслан Аляхно, заўважым, заняў абсалютна правільную пазіцыю — адказна рыхтаваўся, з максімальнай аддачай выступіў, не ўпаў у істэрыку і не стаў пасыпаць галаву попелам, але заўважыў, што гэта не апошні конкурс у жыцці. І асабіста мне за выступленне Руслана, у прынцыпе, не сорамна. Агрэхі ў вакале, маўленні, харэаграфію няхай ацэньваюць прафесіяналы — але ўражанне ў цэлым далёка не горшае.

Ніякавата ж стала пазней, пад уплывам ток-шоў на Першым нацыянальным тэлеканале. Столькі красамоўных пахвал самім сабе і негатыўных ацэнак іншым, столькі катэгарычных і разам з тым суб'ектыўных меркаванняў у адным месцы сустракаецца не часта. Прычым, што адметна — чым меншае дачыненне да «Еўрабачання» меў прамоўца, тым з большай гарачасцю і пафасам ён выступаў. І вось ад гэтага рабілася прыкра. І вось гэта, а не схему адбору, не педагогаў па мове, не мадэльераў і не стылістаў у першую чаргу хацелася б памяняць. Нездарма ўсё ж першы прадзюсар беларускай каманды на конкурсе Уладзімір Максімкаў паўтарае — трэба мяняць стаўленне да конкурсу, успрымаць яго не як «апошні бой», а як вясёлы фестываль, дзе магліва сябе паказаць. Бо перш чым выйграць і прывезці-такі «Еўрабачанне» ў Мінск, нам трэба навучыцца годна прайграваць і рабіць работу над памылкамі.

АДМЕТНАЕ

* З датай правядзення наступнага «Еўрабачання» арганізатары ўжо вызначыліся — 12—16 мая, а вось наконт месца такой дакладнасці няма. Разглядаюцца два варыянты — Масква або Санкт-Пецярбург (усё ж адзін з «трох мушкецёраў», Яўген Плюшчанка — пецярбуржац). Афіцыйнае рашэнне прэс-служба Крамля агучыць у бліжэйшы час.

* Міжнародны тур пераможцы «Еўрабачання» пачнецца літаральна праз тыдзень і пройдзе праз 8 краін — Фінляндыю, Швецыю, Нарвегію, Ірландыю, Вялікабрытанію, Бельгію, Францыю і Сан-Марына.

* Самым дарагім у плане пастаноўкі называюць шоў Ані Лорак — паводле меркаванняў спецыялістаў, кошт касцюмаў і дэкарацый з люстэркавай шафай-пакойчыкам складае не менш як 700 тысяч еўра. Зрэшты, падрыхтоўка Білана, па чутках, абышлася яшчэ даражэй — у 1 мільён еўра, пры тым, што Плюшчанка і Мартан працавалі бясплатна.

* Самай юнай удзельніцай конкурсу стала албанская спявачка Олта Бока — 16 гадоў, самы «ўзроставы» канкурсант — з каманды Харватыі, 75-гадовы Уладзіслаў, якога таксама называюць 75 cent.

* Самы нечаканы каментатар сёлетняга конкурсу — знакаміты мадэльер Жан-Поль Гацье, які быў вядучым ад Францыі. Ён жа заснаваў тры спецпрызы — за лепшую работу стыліста (Босніі і Герцагавіне), лепшы перформанс (Грэцыі) і лепшую дэлегацыю (Ізраілю). Дарэчы, французскі канкурсант Себасьян Пеле таксама трапіў у лік «самых» — ён стаў самым скандальным удзельнікам на радзіме, бо ўпершыню за ўсю гісторыю конкурсу спяваў на англійскай мове.

* Правы на правядзенне ўласнага «Еўрабачання» набылі Блізкі Усход і Паўночная Афрыка, ідуць перамовы таксама з ЗША, так што перспектыва пашырыць конкурс да сусветнага ўзроўню ўсё больш выразная.

* Сэнс, гісторыю, інтрыгі і казусы конкурсу Еўрапейскі вяшчальны саюз вырашыў адлюстраваць... у фільме. Карціну ў жанры камедыі плануюць зняць да канца года.

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.

P.S. Неўзабаве пасля конкурсу Руслан Аляхно збіраўся даць прэс-канферэнцыю, але ўчора стала вядома, што артыст выляцеў у Маскву і ў Беларусі з'явіцца не хутка.

ШАХМАТЫ

Пад рэдакцыяй майстра спорту Уладзіміра СЫЧОВА

ТВОРЫ ЧЫТАЧОЎ

Мікалай БЫКАЎ (Баранавіцкі раён)



Мат за 2 хады (8+10).
Павел РАДЗЮК (Мінск)



Мат за 3 хады (9+4).
Чакаем вашых адказаў!

КАРОТКІЯ ПАЯДЫНКІ

Прыводзім дзве партыі, якія былі згуляныя на супертурніры ў Сафіі (Балгарыя) і ў Празе, дзе праходзіў матч паміж У. Крамнікам і Д. Навараем па хуткіх шахматах.

В. Тапалаў — І. Чэпарынаў
АБАРОНА ГРУНФЕЛЬДА
1. d4 Kf6 2. c4 g6 3. Kc3 d5 4. cd5 Kd5 5. Cd2 Kb6 6. Kf3 Cg7 7. e3 0-0 8. Лc1 K8d7 9. a4 a5 10. e4 e5 11. d5 c6 12. Cg5 Cf6 13. Ce3 Фe7 14. d6 Фe6 15. b3 Cg7 16. h4 f5 17. Kg5 Фf6 18. b4 f4 19. C:b6 K:b6 20. ba5 Kd7 21. a6 Kph8 22. Kb1 Ch6 23. Kf3 ba6 24. Лc6 Cb7 25. Лc7 C:e4 26. Лd7 Фf5 27. Лc7 C:b1 28. Kg5 Cg7 29. Cc4 Cc2 30. Фd5 h6 31. Лf7 Фc8 32. Л:g7 і чорныя здаліся.

У. Крамнік — Д. Навара
КАТАЛОНСКІ ПАЧАТАК
1. Kf3 Kf6 2. c4 e6 3. g3 d5 4. d4 dc4 5. Cg2 Cb4+ 6. Cd2 a5 7. 0-0 0-0 8. Cg5 b5 9. Ke5 Лa6 10. a4 ba4 11. K:c4 Kbd7 12. Kc3 c5 13. K:a4 h6 14. Cd2 Фc7 15. Cf4 Фa7 16. Kd6 Kd5 17. Kb5 Фb7 18. Kc7 Лa7 19. Kd5 ed5 20. Cd6 Лe8 21. dc5 Kf6 22. Kb6 Cg4 23. Фd4 C:e2 24. Лfc1 Cb5 25. Ce5 Л:e5 26. Ф:e5 C:c5 27. Л:c5 Ф:b6 28. Лc8+ Kph7 29. Лb8 Фc6 30. Фf5 g6 31. Фe5 Cc4 32. b3 Cd3 33. C:d5 і чорныя здаліся.

ДЛЯ ВАС, СКЛАДАЛЬНІКІ ЗАДАЧ!

Аб'яўляем рэспубліканскі конкурс складання шахматных задач — дзвюхходавых, трохходавых і шматходавых. Кампазіцыі ў двух экзэмплярах з поўным рашэннем, а таксама прозвішчам, ініцыяламі і поўным адрасам аўтара (усё гэта адным баку аркуша) дасылайце да 1 кастрычніка гг. на адрас рэдакцыі газеты «Звязда» (220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а) з паметкай на канверце «Шахматы».

Пераможцы будуць адзначаны прызамі, ганаровымі і пахвальнымі граматамі. Чакаем вашых твораў на конкурс складання!

НАРКАДЗЯЛКОЎ УЗЯЛІ Ў ВОРАНАХ

Паводле звестак упраўлення інфармацыі і грамадскіх сувязяў МУС, чарговы канал пастаўкі наркотыкаў быў перакрыты праваахоўнікамі нашай краіны сумесна з праваахоўнымі органамі ФРГ.

Аўтамабіль «БМВ», у якім знаходзіліся беларускі кур'ер, нямецкі пастаўшчык і расійскі вадзіцель, затрымалі ў вёсцы Вораны Віцебскага раёна. Паўкіло высокаякаснай галандскай марыхуаны, што перавозілася ў машыне, знайшоў спецыяльна абучаны сабака. Пасля таксама быў затрыманы 27-гадовы беларус — арганізатар гэтай злачыннай групы. Кошт канфіскаванага наркотыку на «чорным рынку» складае больш за 15 тысяч долараў ЗША. Наркадзялкі займаліся не толькі пастаўкай марыхуаны, але і какаіну, амфетаміну і гашышу.

Ігар ГРЫШЫН, Аляксандр ПУКШАНСКІ.

ШАШКІ

Пад рэдакцыяй майстра спорту Мікалая ГРУШЭЎСКАГА

РАЗВЯЖЫ, КАЛІ ДУЖЫ

Вашу сілу гульні ў шашкі дапаможа праверыць камбінацыйная праблема Міхаіла Стэфановіча (Гродна):



БЕЛЫЯ: a1, c3, c5, d2, d4, e3, e5, g1, h2 (9). ЧОРНЫЯ: a3, a5, a7, b8, f2, f6, g5, g7 (8). Выйгрыш.

Адначасова прапануем яе ў якасці задання № 1 бліцконкурсу-38. Усяго ў ім будзе 6 заданняў. Пераможцаў чакаюць сюрпрызы ад нашага бескарыслівага чытача Анатоля ПЯРХАЛЬСКАГА (Глыбокае) — яго зборнікі звяздоўскай шашачнай рубрыкі за 2005 і 2006 гады. Тэрмін для адказаў традыцыйны — два тыдні. Накіроўвайце іх на адрас рэдакцыі газеты «Звязда»: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а) з паметкай на канверце «Шашкі».

Па-за конкурсам разгледзьце яшчэ некалькі задумак М. Стэфановіча:

№ 1. БЕЛЫЯ: b6, c7, d6, g1, g3, h4 (6). ЧОРНЫЯ: a7, b4, d2, d4, f6, g5 (6).

1. cd8 2. gf4 3. hg5 4. d:e1 ba3 5. ef2 ed2 6. fg3x.

№ 2. БЕЛЫЯ: c7, d6, e5, e7, f2, f4, f6 (7). ЧОРНЫЯ: b2, b4, b8, c5, h2, h4 (6).

1. fg3 2. ef8 3. f:h6 4. h:g1#.

№ 3. БЕЛЫЯ: a7, b2, e7, f6, g7, h6 (6). ЧОРНЫЯ: c5, c7, d4, e3, e5, f2, f8, h2 (8).

1. ab8 2. gf8 3. bc3 4. fe7 5. b:e7 6. h:g1#.

№ 4. БЕЛЫЯ: c5, c7, d6, e1, e5, h2, h6 (7). ЧОРНЫЯ: b2, b8, f2, f4, g3, g5, h4 (7).

1. ef6 2. d:f8 3. f:g5 4. h:f4 fg5 A 5. e:g3 6. gf4x. A 4 ... fg1 5. ef2x.

№ 5. БЕЛЫЯ: a7, b6, d4, e3, e5, f2, g5 (7). ЧОРНЫЯ: b2, b4, c5, d8, f8, h2, h6 (7). Перавага белых. Пашукайце яе самастойна. Таксама будзем рады вашым рашэнням.

ДАР'ІНЫ ШЧАМЛЁТКІ

У Калінінградзе адбыўся маладзёжны чэмпіянат Еўропы па шашках-64. У агульнакамандным заліку зборная Беларусі заваявала «бронзу». Сярод нашых прадстаўнікоў у сваіх узроставых катэгорыях вызначаліся: чэмпіёнкай кантынента стала Маша Міронава, а сярэбраныя ўзнагароды атрымалі Уладзіслаў Валюк, Вера Хвашчынская і Дар'я Федаровіч.

Апошняя паспяхова выступае і ў дарослых турнірах, з'яўляецца чэмпіёнкай жаночага першынства рэспублікі па шашках-64. Яна спрабуе сябе і ў стоклетках. Паглядзіце, як мінская гімназістка ўзяла ў шчамлёткі двойчы віцэ-чэмпіёнку свету, міжнароднага гросмайстра Ірыну Пашкевіч, якой багаты вопыт гульні на вялікай дошцы ўсё ж такі дапамог выратавацца:



БЕЛЫЯ (Д. Федаровіч): 23, 24, 27, 28, 29, 31, 32, 34, 43 (9). ЧОРНЫЯ (І. Пашкевіч): 7, 8, 12, 13, 14, 15, 17, 18, 25 (9).

Гэта здарылася на чэмпіянаце краіны 2008 года сярод жанчын: 1 ... 17-22! 2. 28:17 12:21 3. 23:3 14-19=.

РАШЭННІ

ПАДЗАРАДЗІМ МАЗГІ. Бліц-37: № 6 (П. Шклудай, М. Грушэўскі). 1. cd8 2. d:b8 3. bf4! 4. da5 5. a5:d2:e7 6. h:g1#.

З СШЫТКАЎ ЧЫТАЧОЎ-ЗВЯЗДОЎЦАЎ: № 3 (Д. Камчыцкі). 1. dc3 2. ed2 3. gh8 4. h:f8 5. h:g3! 6. f:b4x.

АМАТАРАМ СТАКЛЕТАК (Л. Вітошкін): № 1. 11 (46) 2, 10, 24x; № 2. 9, 3, 48 (42) 25, 36x.

«Мурка» на развітанне

Артыстаў на гастролі ў сталіцу прывезлі пад канвоем... Я яшчэ ніколі так у тэатр не хадзіла: шмат аховы, людзей у форме, якія сачылі за тым, каб не здарылася нічога надзвычайнага. Але надзвычайны быў сам момант, які сабраў публіку ў зале: артыстамі былі выхаванцы калоній для непаўналетніх злачынцаў.

Яны напачатку здаваліся падобнымі адзін на другога — магчыма, з-за голеных галоў. З-за аднолькавай змрочнай вопраткі. З-за нейкай засяроджанасці на сабе. Ці гэта было хваляванне за тое, што будзе адбывацца далей?

Хлопцы, не надта гаваркія, на першы погляд нават ціхія, рыхтаваліся да сваёй сталічнай прэм'еры. На чужых людзей пазіралі крыху насцярожана. Пакуль не чулі пытанняў да сябе: як яны патрапілі ў спектакль «Вяртанне» паводле Антуана дэ Сент-Экзюперы? Вочы ажыўляліся, плечы распраўляліся. Быў кастынг!.. Іх выбралі сярод усіх выхаванцаў калоніі № 1 Віцебска, ім пашчасціла. Гучала гэта так, нібыта ім пашчасціла стаць іншымі людзьмі. Яны нават прадстаўляліся імёнамі герояў, якіх іграюць.

І вось сам Сент-Экз, самы высокі хлопец з кампаніі, разважае, што са сцэны яму давядзіцца прамаўляць шмат слоў пра тое, што значыць чалавечы шлях. А што ён значыць? Ён сам, Антон Макуцкі, пра гэта раней не задумваўся. І нават пасля таго, як ён патрапіў у калонію, баяўся думаць, што будзе з ім далей. А тут тэатр, нейкі нерэальны Экзюперы са сваім фантастычным Маленькім Прынцам. Антон гаварыў пра тое, што яму гэта вельмі падабаецца і ён хоча іграць яшчэ. Яму выходзіць на волю толькі ў 2011-м годзе. А за што трапіў у калонію?.. Антон сказаць не захацеў. Таксама як і 18-гадовы Расціслаў Несін, сумны хлопец з чуллівым голасам і неверагодна светлымі вачамі — выліты «Маленькі прынц». Ён прымусіў палову заплы аблівацца слязамі. Ды ўсе яны прымусілі — у кожнага з артыстаў былі нейкія словы, з-за якіх станавілася асабліва балюча за іх.

«Самае галоўнае вачыма не ўбачыць», — сцвярджаў Ліс, адзін з герояў Экзюперы. Але нешта галоўнае ўбачыла ў гэтых хлопцах актрыса тэатра імя Коласа Ніна Обухава. Маладая прыгожая дзяўчына прыйшла ў калонію не вучыць жыццю і не асуджаць за тое, што здарылася. Яна прыйшла рабіць тэатр, які вельмі падобны на жыццё. Знайшла і прапанавала хлопцам п'есу пра тое, як пачынаецца «Вяртанне».

Вячаслаў ГРУШОЎ, заслужаны артыст Беларусі:

— Галоўнае, правільна падабраць матэрыял, угадаць, пра што яны будуць гаварыць са сцэны. А тут матэрыял, які прымушае пазнаваць самога сябе. У іх было вялікае жаданне, але вельмі закрытыя душы. Зразумела, чаму: яны знаходзяцца ў замкнёнай прасторы са сваімі праблемамі і законамі. І калі пачыналі знаёміцца з матэрыялам, працаваць, то патроху яны раскрываліся. Гаварылі пра свае ўчынкі, а калі чалавек выгаворваецца, яму становіцца лягчэй. Яны станавіліся самі сабой. А гэта дарагога каштуе. Яны раскрываліся ў палёце, падняліся на іншы ўзровень. Гэта тая вышыня, з якой лёгка вяртацца дадому, да блізкіх. Хлопцы іграюць самі сябе, пра сябе самі. Яны з добрым настроем ехалі на гастролі, бачылі дарогу, сонейка, свет і адчуваюць, дзе апынуліся. Яны кажуць, што толькі цяпер адкрываюць для сябе новы, іншы свет, ад якога яны адступілі.

Таццяна САФРОНЕНКА, дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, каардынатар праекта «Тэатр у калоніі»:

— Калі мы пачыналі гэты праект у жаночай калоніі горада Гомеля тры гады таму, то галоўным было памкненне — мабілізаваць жанчын задумацца, як ім жыць далей. Гэта спрацавала, першы вопыт аказаўся ўдалым, і праект «Тэатр у калоніі» рушыў далей. Цяпер мы бачылі пастаноўку «Ён і яна», якая створана ў калоніі № 2 і спектакль «Вяртанне» калоніі №1 г. Віцебска. Усім зразумела, пра якое вяртанне ідзе гаворка... Толькі дрэнна тут адно: калі таленты праяўляюцца ў калоніі. Гэта ж вельмі балюча, што такі прыгожы тэнар Дзяніс Барткоў зараз знаходзіцца ў калоніі Бабруйска, ці Ігар Парэлка — сапраўдны Джо Дасэн. Безумоўна, пакуль у хлопцаў больш запальваючай атрымліваецца «Мурка». Але ж якое пачуццё яны ўкладваюць у песні пра каханне! Усе хлопцы паводзілі сябе як сапраўдныя прафесіяналы, яны разумелі, што робяць на сцэне і выстрымалі складанае выпрабаванне, калі трэба было іграць на сцэне, у той час, калі ў зале сядзелі і дэпутаты, і прадстаўнікі МУС, і самае галоўнае — іх родныя. І мне здаецца, што раўнадушных не было, а многія пасля спектакля выціралі слёзы на вачах. Усе ўбачылі, наколькі дзеці таленавітыя, наколькі трапяткія ў іх душы, якім вельмі патрэбна наша разуменне. Але самае галоўнае, што дае ім гэты праект — адчуць сябе раўнапраўнымі членамі грамадства. І грамадства павінна па-іншаму паглядзець на тых, хто аднойчы заблукаў. Тое, што яны там апынуліся — наша віна: напэўна ж, дарослыя недзе недаглядзелі, некага, магчыма, і недалюбілі. Цяпер яны рыхтуюць сябе да жыцця ў нармальным свеце, калі вернуцца ў сем'і. Але ёсць і такія, хто не мае бацькоў. Грамадства іх павінна падтрымаць.

Віталь СТУКАНАЎ, намеснік старшыні Дэпартамента выканання пакаранняў:

— Удзельнікі пастановак былі асуджаны за ўчыненне цяжкіх і асабліва цяжкіх гвалтоўных парушэнняў — крадзяжоў, згвалтаванняў, забойстваў. Натуральна, выконваюцца пэўныя ахоўныя патрабаванні, калі мы прадстаўляем гэтыя спектаклі. Ці апраўдвае сябе гэты праект — «Тэатр у калоніі»? Выхаванне праз мастацтва сапраўды можа мяняць чалавека. Пачуццё шчасця, закаханасці, якое яны імкнуцца спасцігнуць і ўвасобіць, дазваляе зразумець, што ў жыцці нашмат больш прыгожага. Што радасць можна атрымліваць не тады, калі парушаеш закон, а тады, калі з'яўляюцца новыя каштоўнасці. Калі чалавек адчувае стан шчасця ад нечага іншага, то ён будзе думаць пра тое, як сумленна зарабляць, як не падвесці сваіх блізкіх. Нам здаецца, што праект прыносіць карысць.

Тата Дзмітрыя ГАРМАЗЫ, выканаўцы ролі Паэта ў спектаклі «Вяртанне»:

— Калі я першы раз ехаў на спатканне з сынам у калонію, мне было і страшна, і сорамна: як да мяне там паставяцца? Я ж адчуваў сваю віну за тое, што адбылося з сынам. Калі здарылася бяда, шмат думаў пра тое, дзе яго ўпусціў, калі яму прысвяціў мала часу, калі ўвогуле не ведаў, дзе ён і чым займаецца?.. Баяўся гэтых пытанняў да сябе. Але ніхто мяне не папракнуў, і я адчуў палёгку, ад таго, што паўсюдна людзі, якія могуць зразумець твой боль. І сыну казаў заўсёды: у любым месцы, дзе б ні апынуўся, ты можаш навучыцца чалавечнасці, калі вельмі гэтага захочаш, ты можаш стаць чалавекам. Сёння я на яго паглядзеў іншымі вачыма.

Многія бацькі праехалі не адну сотню кіламетраў, каб патрапіць на спектакль, у якім удзельнічалі іх дзеці. Здалёк паглядзець, як яны мяняюцца. Але самае галоўнае для іх здарылася пасля. Юных артыстаў было вырашана заахвоціць — згодна з крымінальным кодэксам. Але першае заахвочванне зоркі калоніі адчулі, калі сышлі са сцэны ў залу, дзе іх чакалі родныя. У мяне ком падступіў да горла...

У беларускіх калоніях для непаўналетніх знаходзяцца 830 выхаванцаў.

Ларыса ЦІМОШЫК.

БЕЛАГРАПРАМБАНК — МАЙСКІМ ІМЯНІННІКАМ

Дванаццаць самых маленькіх кліентаў ААТ «Белаграпрамбанк» — удзельнікаў акцыі «Расці вялікі!» атрымалі віншаванні і падарункі з нагоды сваіх дзён нараджэнняў, якія прыпалі на май. Урачыстая цырымонія адбылася ў філіяле Мінскай гарадской дырэкцыі банка.

Як адзначыў начальнік Мінскай гарадской дырэкцыі Сяргей ЛУНЕГАЎ, падзея не дарэмна атрымала назву «Белаграпрамбанк — банк падарункаў!». Правядзенне акцыі «Расці вялікі!» скіравана не толькі на павышэнне цікавасці насельніцтва да захавання зберажэнняў у айчынных банках, але і на аказанне пэўнай увагі і падтрымкі новаму пакаленню. Зараз удзельнікамі акцыі з'яўляюцца звыш 5 тысяч дзяцей ва ўзросце ад некалькіх месяцаў да 16 гадоў. Усе дзеці, на чыё імя клапатлівыя бацькі адкрылі ўклад, атрымліваюць падарункі да кожнага свайго дня нараджэння. Майскіх імяніннікаў Мінскай гарадской дырэкцыі Белаграпрамбанка дадаткова павіншаваў ТАА «Белсаюзопт».

Святлана БАРЫСЕНКА.

АДСПЯВАЛІ, АДШУМЕЛІ...

ці Суб'ектыўныя разважанні тэлегледача

Песенны конкурс «Еўрабачанне-2008» у Бялградзе — вялікае шоў, на якім можна паглядзець на чужых і сябе паказаць. І калі ў першым выпадку з гэтым праблем няма, то вывесці свайго спевака хоць бы ў фінал не ўсім удаецца.

Першы паўфінал конкурсу паглядзець не выпала, а вось другі — адсядзеў ад пачатку да канца. Будучы не вялікім прыхільнікам эстрады, зрабіў гэта для таго, каб убачыць, як будзе глядзецца на еўрапейскай сцэне прадстаўнік Беларусі.

На мой погляд Р. Аляхно выканаў песню так, як мог. Да такога ўзроўню глядач ужо прывык і здзівіць яго такім выступленнем было цяжка. Хоць у цэлым наш спявак мала ў чым уступаў большасці паўфіналістаў.

Нумар праваліла кампазіцыя, пастаноўчая частка не вытрымлівае ніякай крытыкі. І з гэтай прычыны ў выступленні Аляхно не было элемента навізны. У параўнанні з 2007 годам, калі Беларусь прадстаўляў Калдун, выступленне ў Бялградзе было значна слабейшым. А ўся справа ў тым, што фон у нумары Калдуна быў больш эфектным і ўся пастаноўка на высокім прафесійным узроўні. Нездарма Кіркораў элементы той кампазіцыі ўключыў у нумар для ўкраінскай спявачкі, якая ў фінале заняла другое месца.

Для чаго на сцэну выпусцілі грудастых дзяўчат, якія не ведалі, што там рабіць? Якую ролю яны там выконвалі? Дарэчы, на іх фоне спявак глядзеўся драбнаватым.

Горшая кампазіцыя была бадай што ў прадстаўнікоў Чэхіі. Там стаўку зрабілі на сэксапільнасць танцоўшчыц. А гэтым гледачоў ужо не возьмеш.

Седзячы з сям'ёй перад тэлевізарам, мы беспамылкова вызначылі большасць пераможцаў другога паўфіналу.

Успомнім, якім яркім у тым паўфінале было выступленне харваты. Іх нумар атрымаўся размерна тэатралізаваным, але гэта дапамагло раскрыць агульную задуму, падтрымала мелодыю. Хоць харватам у фінале нічога не свяціла, бо іх нумар найбольш кранае старэйшае пакаленне, а ў масе сваёй больш актыўна галасуюць маладыя.

Незразумела, якой канцэпцыі прытрымліваліся тыя, хто рыхтаваў наша выступленне для «Еўрабачання-2008», зрабіўшы стаўку на міфічную сучаснасць, яны згубілі самае важнае — адметнасць. І нумар у цэлым — учарашні дзень, нешта падобнае мы ўжо бачылі.

Выкананне песні на англійскай мове не гарантуе перамогі. Успомнім, летась перамагла сербская спявачка, якая выконвала песню на роднай. Жаданне пад кагосьці «легчы» на конкурсе, дзе галасуе ўся Еўропа — справа ненадзейная.

Уся праблема ў тым, што мала сёння мець добрага спевака — трэба яго яшчэ ўмела паказаць свету. А як гэта зрабіць, нашы прастаноўшыкі не ведаюць. Не хапае звычайнага прафесіяналізму і, безумоўна, таленту. І калі правалілі нумар на англійскай мове, то праваляць і на беларускай.

* * *

Фінал конкурсу «Е

Хэнлан увайшоў у адну раку двойчы

Менавіта пад кіраўніцтвам Хэнлана, які спрабаваў стварыць з каманды сям'ю, хакеісты нашай краіны занялі на чэмпіянаце свету самае высокае месца — шостае. Было гэта на лядовым форуме ў Рызе ў 2006-м. Цікава, што канадзец, які цяпер з'яўляецца галоўным трэнерам фінскага клуба «Йокерыт», зноў будзе трэніраваць нашу дружыну, не атрымліваючы зарплату. Нагадаю, што пасля ўходу з пасады главкома настаўнік не губляў сувязь са зборнай Беларусі: ён цікавіўся справамі каманды, жадаў хакеістам удачы, а сёлета дапамагаў у падрыхтоўцы варатароў і абаронцаў, бо сам у мінулым быў галкіперам.

Менавіта Глен Хэнлан парэкамендаваў кандыдатуру новага настаўніка, Курта Фрэйзера, калі сам не мог працягнуць работу ў зборнай з-за занятасці ў «Вашынгтон Кэпіталс». Аднак амерыканскі спецыяліст не змог наблізіцца да дасягненняў свайго папярэдніка ні на турніры ў Расіі (беларусы сталі 11-мі), ні ў Канадзе (9-мі). Асабліва крыўдна за сёлетні вынік, бо ў Квебеку ў распараджэнні Фрэйзера былі ўсе наймацнейшыя беларускія ігракі з НХЛ і расійскай суперлігі (да каманды далучыліся нават Калюжны і Салей). Безумоўна, беларусы выканалі галоўную задачу — заваявалі пропуск на Алімпіяду ў Ванкувер. Аднак нельга заплюшчыць вочы на слабую рэалізацыю большасці, а гэты кампанент гульні павінен быць у кожнай каманды топ-узроўню.

Між тым, старшыня федэрацыі хакея Уладзімір Навумаў заверыў на выканкаме ФХРБ, што назначэнне Фрэйзера на пасаду галоўнага трэнера зборнай не было памылкай, бо на чэмпіянаце ў Канадзе беларусы практычна гулялі на роўных з грандамі сусветнага хакея. Акрамя таго, каманда дэманстравала ігравую дысцыпліну і вялікую самаадданасць. Уладзімір Навумаў заўважыў, што пры жаданні Фрэйзер можа працягнуць супрацоўніцтва з беларусамі ў далейшым, і падкрэсліў: «Федэрацыя працягне рабіць стаўку на заакіянскіх спецыялістаў». Адна з прычын такой пазіцыі, на яго думку, заключаецца ў «комплексе слабых». Маўляў, у беларускіх трэнераў ён ёсць, а вось заакіянскія настаўнікі не пасуюць перад моцнымі сапернікамі і смела вядуць ігракоў супраць шведаў, чэхаў, расіян і г.д.

Хэнлан далучыцца да зборнай напярэдадні чэмпіянату свету-2009 у Швейцарыі. У час выступлення на іншых спаборніцтвах («Еўравыклік», «Кубку Палесся») каманда будзе пад наглядам 57-гадовага канадскага спецыяліста Уэйна Флемінга. Менавіта яго назначылі на пасаду галоўнага трэнера «Дынама», што ў гэтым сезоне дэбютуе ў Кантынентальнай хакейнай лізе. Флемінг вядомы па працы ў клубах НХЛ і асабліва ў трэнерскім штабе зборнай Канады, якая стала алімпійскім чэмпіёнам у 2002 годзе. Дапамагаць Хэнлану і Флемінгу будуць беларускія спецыялісты Эдуард Занкавец і Уладзімір Цыплакоў.

Дарэчы, трэнерскі штаб зборнай ужо сфарміраваў прыблізны спіс ігракоў «Дынама», якое павінна стаць базавым клубам нацыянальнай каманды. Цяпер вядуцца перамовы з хакеістамі, сярод якіх Віталь Коваль, Аляксей Угараў, Дзмітрый Мялешка, Сяргей Задзялёнаў, Канстанцін Кальцоў, Яраслаў Чупрыс.

Ірына ПРЫМАК.

Праз два гады перапынку канадскі спецыяліст зноў узначаліў нацыянальную зборную Беларусі

Р. S. Агучаны лаўрэаты хакейнага сезона: лепшы галкіпер — Віталь Коваль («Нёман», Гродна), лепшы абаронца — Аляксандр Макрыцкі («Керамін», Мінск), лепшы нападаючы — Раман Сальнікаў («Керамін», Мінск), лепшы нападаючы абарончага плана — Арцём Волкаў («Юнацтва-Мінск»), лепшы малады ігрок — Дзмітрый Корабаў («Гомель»), лепшы арбітр — Уладзімір Налівайка, лепшая арэна — «Металург» (Жлобін), лепшы трэнер — Андрэй Гусаў («Керамін», Мінск).

Royal

РЕЗУЛЬТАТЫ ПРОВЕДЕНИЯ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ

«Платиновая лихорадка 3»

В период **с 17 марта 2008 года по 22 мая 2008 года** (включительно) в казино «Royal» по адресу: Республика Беларусь, 220030, г. Минск, пр-т Независимости, 11, корп. 1 проводилась рекламная игра «Платиновая лихорадка 3».

Игра проводилась в составе комиссии рекламной игры «Платиновая лихорадка 3»:

- Магеров Сергей Федорович (Место работы — ООО «Дакарай», должность — начальник смены)

Члены комиссии:

- Курленя Алексей Иванович (Место работы — ООО «Дакарай», должность — начальник смены)
- Умецкий Станислав Александрович (Место работы — ООО «Дакарай», должность — заместитель начальника смены)

Призовой фонд игры в размере **57 780 000** (пятьдесят семь миллионов семьсот восемьдесят тысяч) белорусских рублей разыгран полностью, между следующими участниками:

В **1-ом этапе** розыгрыша, который проводился 24 марта 2008 года, денежные призы, согласно протокола проведения 1 этапа рекламной игры, получили:

- Шевцов Андрей Федорович — денежный приз в размере 428 000 (четыреста двадцать восемь тысяч) белорусских рублей;
- Семененя Николай Михайлович — денежный приз в размере 642 000 (шестьсот сорок две тысячи) белорусских рублей;
- Семененя Николай Михайлович — денежный приз в размере 1 070 000 (один миллион семьдесят тысяч) белорусских рублей.

Во **2-ом этапе** розыгрыша, который проводился 27 марта 2008 года, денежные призы, согласно протокола проведения 2 этапа рекламной игры, получили:

- Семененя Николай Михайлович — денежный приз в размере 1 070 000 (один миллион семьдесят тысяч) белорусских рублей;
- Науменко Анатолий Григорьевич — денежный приз в размере 1 070 000 (один миллион семьдесят тысяч) белорусских рублей;
- Конон Михаил Ростиславович — денежный приз в размере 2 140 000 (два миллиона сто сорок тысяч) белорусских рублей.

В **3-ем этапе** розыгрыша, который проводился 31 марта 2008 года, денежные призы, согласно протокола проведения 3 этапа рекламной игры, получили:

- Борисенко Дмитрий Анатольевич — денежный приз в размере 428 000 (четыреста двадцать восемь тысяч) белорусских рублей;
- Дубовик Анна Михайловна — денежный приз в размере 642 000 (шестьсот сорок две тысячи) белорусских рублей;
- Борисенко Дмитрий Анатольевич — денежный приз в размере 1 070 000 (один миллион семьдесят тысяч) белорусских рублей.

В **4-ом этапе** розыгрыша, который проводился 3 апреля 2008 года, денежные призы, согласно протокола проведения 4 этапа рекламной игры, получили:

- Ярмолик Юрий Владимирович — денежный приз в размере 1 070 000 (один миллион семьдесят тысяч) белорусских рублей;
- Редько Михаил Петрович — денежный приз в размере 1 070 000 (один миллион семьдесят тысяч) белорусских рублей;
- Крискевич Николай Федорович — денежный приз в размере 2 140 000 (два миллиона сто сорок тысяч) белорусских рублей.

В **5-ом этапе** розыгрыша, который проводился 07 апреля 2008 года, денежные призы, согласно протокола проведения 5 этапа рекламной игры, получили:

- Шестакович Николай Михайлович — денежный приз в размере 428 000 (четыреста двадцать восемь тысяч) белорусских рублей;
- Ковальков Игорь Иванович — денежный приз в размере 642 000 (шестьсот сорок две тысячи) белорусских рублей;
- Ковальков Игорь Иванович — денежный приз в размере 1 070 000 (один миллион семьдесят тысяч) белорусских рублей.

В **6-ом этапе** розыгрыша, который проводился 10 апреля 2008 года денежные призы, согласно протокола проведения 6 этапа рекламной игры, получили:

- Кунец Сергей Владимирович — денежный приз в размере 1 070 000 (один миллион семьдесят тысяч) белорусских рублей;
- Шестакович Николай Михайлович — денежный приз в размере 1 070 000 (один миллион семьдесят тысяч) белорусских рублей;
- Конон Михаил Ростиславович — денежный приз в размере 428 000 (четыреста двадцать восемь тысяч) белорусских рублей;
- Байдуков Иван Петрович — денежный приз в размере 642 000 (шестьсот сорок две тысячи) белорусских рублей;
- Шестакович Николай Михайлович — денежный приз в размере 1 070 000 (один миллион семьдесят тысяч) белорусских рублей.

В **8-ом этапе** розыгрыша, который проводился 17 апреля 2008 года, денежные призы, согласно протокола проведения 8 этапа рекламной игры, получили:

- Шестакович Наталья Владимировна — денежный приз в размере 1 070 000 (один миллион семьдесят тысяч) белорусских рублей;
- Шестакович Николай Михайлович — денежный приз в размере 1 070 000 (один миллион семьдесят тысяч) белорусских рублей;
- Кунец Сергей Владимирович — денежный приз в размере 2 140 000 (два миллиона сто сорок тысяч) белорусских рублей.

В **9-ом этапе** розыгрыша, который проводился 21 апреля 2008 года, денежные призы, согласно протокола проведения 9 этапа рекламной игры, получили:

- Кунец Сергей Владимирович — денежный приз в размере 428 000 (четыреста двадцать восемь тысяч) белорусских рублей;
- Шестакович Николай Михайлович — денежный приз в размере 642 000 (шестьсот сорок две тысячи) белорусских рублей;
- Науменко Анатолий Григорьевич — денежный приз в размере 1 070 000 (один миллион семьдесят тысяч) белорусских рублей;
- Козел Сергей Михайлович — денежный приз в размере 1 070 000 (один миллион семьдесят тысяч) белорусских рублей;
- Козел Сергей Михайлович — денежный приз в размере 2 140 000 (два миллиона сто сорок тысяч) белорусских рублей.

В **10-ом этапе** розыгрыша, который проводился 24 апреля 2008 года, денежные призы, согласно протокола проведения 10 этапа рекламной игры, получили:

- Козел Сергей Михайлович — денежный приз в размере 1 070 000 (один миллион семьдесят тысяч) белорусских рублей;
- Козел Сергей Михайлович — денежный приз в размере 1 070 000 (один миллион семьдесят тысяч) белорусских рублей;
- Козел Сергей Михайлович — денежный приз в размере 2 140 000 (два миллиона сто сорок тысяч) белорусских рублей.

В **11-ом этапе** розыгрыша, который проводился 28 апреля 2008 года, денежные призы, согласно протокола проведения 11 этапа рекламной игры, получили:

- Козел Сергей Михайлович — денежный приз в размере 428 000 (четыреста двадцать восемь тысяч) белорусских рублей;
- Козел Сергей Михайлович — денежный приз в размере 642 000 (шестьсот сорок две тысячи) белорусских рублей;
- Кунец Сергей Владимирович — денежный приз в размере 1 070 000 (один миллион семьдесят тысяч) белорусских рублей.

В **12-ом этапе** розыгрыша, который проводился 01 мая 2008 года, денежные призы, согласно протокола проведения 12 этапа рекламной игры, получили:

- Войтик Людмила Ивановна — денежный приз в размере 1 070 000 (один миллион семьдесят тысяч) белорусских рублей;
- Козел Сергей Михайлович — денежный приз в размере 1 070 000 (один миллион семьдесят тысяч) белорусских рублей;
- Козел Сергей Михайлович — денежный приз в размере 2 140 000 (два миллиона сто сорок тысяч) белорусских рублей.

В **13-ом этапе** розыгрыша, который проводился 05 мая 2008 года, денежные призы, согласно протокола проведения 13 этапа рекламной игры, получили:

- Черепович Тамара Викторовна — денежный приз в размере 428 000 (четыреста двадцать восемь тысяч) белорусских рублей;
- Черепович Тамара Викторовна — денежный приз в размере 642 000 (шестьсот сорок две тысячи) белорусских рублей;
- Науменко Анатолий Григорьевич — денежный приз в размере 1 070 000 (один миллион семьдесят тысяч) белорусских рублей.

В **14-ом этапе** розыгрыша, который проводился 08 мая 2008 года, денежные призы, согласно протокола проведения 14 этапа рекламной игры, получили:

- Кунец Сергей Владимирович — денежный приз в размере 1 070 000 (один миллион семьдесят тысяч) белорусских рублей;
- Козел Сергей Михайлович — денежный приз в размере 1 070 000 (один миллион семьдесят тысяч) белорусских рублей;
- Козел Сергей Михайлович — денежный приз в размере 2 140 000 (два миллиона сто сорок тысяч) белорусских рублей.

В **15-ом этапе** розыгрыша, который проводился 12 мая 2008 года, денежные призы, согласно протокола проведения 15 этапа рекламной игры, получили:

- Черепович Тамара Викторовна — денежный приз в размере 428 000 (четыреста двадцать восемь тысяч) белорусских рублей;
- Крук Инна Сергеевна — денежный приз в размере 642 000 (шестьсот сорок две тысячи) белорусских рублей;
- Черепович Тамара Викторовна — денежный приз в размере 1 070 000 (один миллион семьдесят тысяч) белорусских рублей.

В **16-ом этапе** розыгрыша, который проводился 15 мая 2008 года, денежные призы, согласно протокола проведения 16 этапа рекламной игры, получили:

- Козел Сергей Михайлович — денежный приз в размере 1 070 000 (один миллион семьдесят тысяч) белорусских рублей;
- Козел Сергей Михайлович — денежный приз в размере 1 070 000 (один миллион семьдесят тысяч) белорусских рублей;
- Козел Сергей Михайлович — денежный приз в размере 2 140 000 (два миллиона сто сорок тысяч) белорусских рублей.

В **17-ом этапе** розыгрыша, который проводился 19 мая 2008 года, денежные призы, согласно протокола проведения 17 этапа рекламной игры, получили:

- Науменко Анатолий Григорьевич — денежный приз в размере 428 000 (четыреста двадцать восемь тысяч) белорусских рублей;
- Шестакович Николай Михайлович — денежный приз в размере 642 000 (шестьсот сорок две тысячи) белорусских рублей;
- Шестакович Николай Михайлович — денежный приз в размере 1 070 000 (один миллион семьдесят тысяч) белорусских рублей.

В **18-ом этапе** розыгрыша, который проводился 22 мая 2008 года, денежные призы, согласно протокола проведения 18 этапа рекламной игры, получили:

- Ладутько Андрей Владимирович — денежный приз в размере 1 070 000 (один миллион семьдесят тысяч) белорусских рублей;
- Шестакович Николай Михайлович — денежный приз в размере 1 070 000 (один миллион семьдесят тысяч) белорусских рублей;
- Козел Сергей Михайлович — денежный приз в размере 2 140 000 (два миллиона сто сорок тысяч) белорусских рублей;

С момента получения приза, а также любого иного дохода в рамках Игры, вышеназванные Участники несут ответственность за уплату всех применимых налогов, установленных действующим законодательством Республики Беларусь.

Свидетельство о государственной регистрации правил проведения рекламной игры выдано Министерством торговли Республики Беларусь за № 968 от 04 марта 2008 года. УНП 190617507

Рыбка з... тату альбо Хавай палец

Рыбка з сапраўднай татуіроўкай — гэта не жарт. Гэты вельмі рэдкі і дарагі від рыб — папугаі з Усходняй Азіі можна ўбачыць у віцебскім заапарку, дзе прадстаўлена ўнікальная выстава трапічных рыб і іншых экзатычных насельнікаў вады. Татуіроўкі нанеслі разводчыкі.

Як расказаў «Звяздзе» дырэктар віцебскага заапарка Аляксей Андрэйкаў, ідэя прадставіць такую выставу гледачам належыць віцябчаніну Аляксею Бызылеўскаму. Ён прапанаваў знаёмым уладальнікам акварыумаў аб'яднацца і зрабіць гараджанам і гасцям такі нечаканы сюрпрыз. Усяго прадстаўлены больш за 30 відаў насельнікаў падводнага царства. Іх колькасць — некалькі сотняў.

Ёсць сярод іншых каралі акварыума — дыскусы (яны вельмі прыгожыя і «важныя»). Лабіатус, калі паднесці да шкла палец, адразу пачынае «паляванне» — вельмі агрэсіўны. Ёсць экзатычныя самы, якія могуць вырасці даўжынёй у некалькі метраў, рыба-зебра (псеўдатрафеус зебра), якая выношвае ікру ў роце, тэтраадоны, якія раздуваюцца, калі іх дастаць з вады, нават рыба нож і іншыя.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

Шчыры віншую з 50-годдзем **Валерыя Іванавіча ЗАХАРЭНКУ** і яго дачушку **Алёну** з днём нараджэння. Жадаю добрага здароўя, доўгіх гадоў жыцця, шчасця і дабрабыту.

Лідзія, г. Ляхавічы.

Усміхнёмся!

— Як твая жонка? Учора на канцэрце яна так моцна кашляла, што ўсе на яе азіраліся!

— Не варта турбавацца. Проста на ёй была новая сукенка.

☺

— За колькі зараз правы можна зрабіць?

— 500 баксаў.

— Дорага.

— Гаішніка, які танней рабіў, машына збіла...

☺

Чытаў кнігу «Займальная хімія».

Вельмі спадабаўся эфектны вопыт пад назвай: «Куды дзеўся спірт?».

☺

З выказванняў шэфа:

— У вас ёсць тыдзень на выкананне гэтай работы і сёння ён заканчваецца!

☺

— Прывітанне! А я думаў, што ты памёр!

— З чаго ты гэта ўзяў?

— Раніцай сустрэў Вавана, ён столькі добрага пра цябе нагаварыў...



Чытайце ў наступным нумары

Падаражанне прадуктаў харчавання будзе працягвацца?..

За апошнія гады мы адвыклі ад таго росту цэнаў, які назіраўся напрыканцы 2007 года, а сёлета працягваецца. У нашай краіне харчаванне летась падаражэла на 15,9 працэнта. Цэны на сельскагаспадарчую прадукцыю на сусветным рынку толькі растуць. У такім выпадку, якіх «сюрпрызаў» з цэнамі нам чакаць далей? Як паўплываюць тэндэнцыі на сусветных харчовых рынках на рынак Беларусі?

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	4.50	21.25	16.35
Віцебск —	4.32	21.22	16.50
Магілёў —	4.39	21.15	16.36
Гомель —	4.44	21.03	16.19
Гродна —	5.06	21.39	16.33
Брэст —	5.15	21.31	16.16

Месяц

Апошняя квадра.

Месяц у сузор'і Рыб.

Імяніны

Пр. *Максіма, Мікіты, Нікіфара, Сідара.*

К. *Магдалены, Аўгусціна, Юльяна, Яна.*

НАДВОР'Е на заўтра

...у суседзяў

ВАРШАВА	+11..+13°С	КІЕЎ	+12..+14°С	РЫГА	+15..+17°С
ВІЛЬНЮС	+16..+18°С	МАСКВА	+16..+18°С	С.-ПЕЦЯРБУРГ	+17..+19°С

Дзве даты

27 мая

1926 год — па ініцыятыве Змітрака Бядулі, Уладзіміра Дубоўкі, Кандрата Крапівы, Кузьмы Чорнага створана беларускае літаратурна-мастацкае аб'яднанне «Узвышша», у якое ўвайшлі многія вядомыя пісьменнікі. Выдаваўся часопіс «Узвышша», літаратурныя зборнікі. У 1931 годзе прынята рашэнне аб ліквідацыі аб'яднання.

1905 год — у Карэйскім праліве, ля вострава Цусіма, адбылася марская бітва паміж 2-й Ціхаакіянскай эскадрай і японскім флотам, якая стала ключавым момантам у ходзе руска-японскай вайны. У баі загінулі больш як 5 тысяч расійскіх маракоў, а з 28 караблёў эскадры ўцалелі толькі тры. Пасля гэтага Расія была вымушана пачаць мірныя перамовы, якія завяршыліся Портсмутскім мірам. У Санкт-Пецярбургу з гэтай нагоды быў пабудаваны храм «Спас на Водах».

Цытата дня:

«Няшчасці бываюць двух відаў: па-першае, нашы ўласныя няўдачы, па-другое, удачы іншых».

Амброз Бірс (1842—1914), амерыканскі пісьменнік.

Организация сдает в аренду

ТОРГОВО-ПРОИЗВОДСТВЕННОЕ ПОМЕЩЕНИЕ

в г. Молодечно (центр), 2-этажное, 1400 кв. м, охрана, стоянка, коммуникации по цене 3 евро кв. м.

Тел. 8 029 364 76 37. УНН 600414766

Рэпарцёр атрымаў заданне...

...ПАПЛАВАЦЬ З ПАВЕТРАНЫМ ЗМЕЕМ

Жыхар Віцебскага раёна Алег Кандратаў сам робіць самых розных паветраных змеяў і з вялікім задавальненнем вучыць гэтаму дзятву. А яшчэ ён можа... лятаць на вялікіх змеях. Але і гэта не ўсё. Нядаўна ён разам са школьнікамі зрабіў першы самы сапраўдны паветраны шар. Акрамя ўсяго пералічанага, Алег Віктаравіч яшчэ і яхтсмен. Ён вучыць кіраваць яхтамі ўсіх ахвотнікаў. Нават распрацаваў спецыяльную праграму падрыхтоўкі рулявых яхт.

Алег Віктаравіч па спецыяльнасці інжынер-механік. У свой час скончыў Віцебскі тэхналагічны інстытут лёгкай прамысловасці. Працаваў на заводзе. З дзяцінства займаўся мадэляваннем ракет — ужо тады пакараў нябёсы. Шмат гадоў кіруе гуртком у цэнтры дзіцячай творчасці. На заняткі прыходзяць як школьнікі малодшых класаў, так і навучэнцы каледжаў, студэнты. У групах па шэсць чалавек, што дазваляе шмат часу ўдзяліць кожнаму.

— Прыйдзіце на наш фестываль, ён на днях адбудзецца, убачыце шмат змеяў, шароў, ракет і г.д. Рабіць іх вельмі цікава не толькі дзецям, але і дарослым, — расказвае Алег Віктаравіч. — Дарэчы, я ведаю адну сям'ю, якая стварылася дзякуючы гэтым самым змеям. Ён і яна, раней не былі знаёмыя, прыехалі на фестываль паветраных змеяў. Пазнаёміліся там, дзялілі ся ўражаннямі. Пакахалі адно аднаго. Праз год, гляджу, ужо прыехалі разам і прывезлі з сабой змеяў, што зрабілі разам. Безумоўна, згодны з вамі, гэта вельмі добрая гісторыя: калі ў мужчыны і жанчыны адны інтарэсы, ім заўсёды будзе разам цікава.

Аказваецца, з дапамогай паветраных змеяў можна... хутка плаваць. Непаўторнае, напэўна, задавальненне. Безумоўна ж, калі вецер моцны будзе. Я, праўда, так і не рашыўся. Запускаюцца ў нябёсы адразу некалькі змеяў, якія звязаныя паміж сабой — так званы «змеевы цягнік», і ён цягне чалавека, які знаходзіцца ў вадзе.

— Алег Віктаравіч, а як можна лётаць на змеях?

— Для гэтага выкарыстоўваюцца вялікія спецыяльныя змеі — кайты. Плошча іх розная — 7 квадратных метраў (маленькі параплан), вялікага — 30 квадратных метраў. Існуе нават від спорту — кайтынг. З дапамогай кайтаў можна ўзлятаць як з зямлі, так і з вады, снегу.

Безумоўна, у двух апошніх выпадках для ног неабходная адпаведная спецыяльная дошка і лыжы. Для заняткаў на вадзе выкарыстоўваецца кайт, які надзімаецца, каб пры падзенні не зачэрпаў вады.

Вядома ж, без спецыяльных аксесуараў — сродкаў абароны ад траўмаў не абысціся. Дзякуючы вышэйшым сілам ніхто з маіх знаёмых сур'ёзна не быў параненны. Мы ж вельмі сур'ёзна рыхтуемся перад тым, як паляцець на кайтах.

На мае пытанні наконт таго, а як наогул ён у правінцыі пачаў займацца такім рэдкім спортам — кайтынгам, Алег Віктаравіч адказаў, што, наколькі ён ведае, самым першым у вобласці пачаў займацца кайтынгам віцебскі прадпрымальнік Віктар Дзегцяроў. Цяпер яму 57 гадоў. Паехаў бізнэсмен на адпачынак у замежжа, убачыў усё гэта, спадабалася. Заказаў кайт праз Інтэрнэт. Потым з'явіліся аднадумцы.

Любяць выязджаць на азёры ў вёску Янавічы, на Лосвіда. Каб палятаць на кайтах ды на яхтах прайсціся. Сіла ветру перад палётамі вымяраецца спецыяльным прыборам — анемометрам. І не толькі можна ляцець па ветру, але і супраць яго. Даўжыня строп кайта — 25 метраў. Лятаць можна на вышыні метраў 5 (больш, менш) і з вялікай хуткасцю — да 60 кіламетраў у гадзіну.

Алег КАНДРАТАЎ з сынам Дзмітрыем і змеем.

І ў іншых рэгіёнах Прыдзвінскага краю распаўсюджваецца гэты прыгожы спорт, напрыклад, у старажытным Полацку. Кайт, што надзімаецца, каштуе 1000 умоўных адзінак, звычайны — 400. Дарэчы, адна віцебская фірма вырабляе кайты і пастаўляе іх у Маскву.

Мяне вельмі здзівіў мой суразмоўца, калі расказваў пра паветраны шар, што зрабілі члены яго гуртка. Праўда, ён параўнальна маленькі — дыяметр шара толькі 2,5 метра. Вядома ж, на такім не палятаеш.

Але, як кажуць, гэта толькі пачатак. Энтузіясты плануюць зрабіць яшчэ некалькі шароў. Між іншым, ужо зроблены шар «№ 1» можа падняць у нябёсы груз вагой 50 кілаграмаў. Навошта? Праводзяцца нават міжнародныя спаборніцтвы сярод уладальнікаў такіх невялікіх шароў. Трэба абляцець акрэсленую траекторыю і, напрыклад, «скінуць груз» у зададзенай кропцы — прама ў цэль. Шары кіруюцца з зямлі з дапамогай радыё, такім чынам можна рэгуляваць работу газавай гарэлкі...

Як чалавек сціплы мой новы знаёмы не гаварыў пра праблемы. Не сакрэт, што плацяць кіраўнікам гуртком параўнальна няшмат. Ёсць цяжкасці з расходнымі матэрыяламі. Прыходзіцца самім многае знаходзіць. А калі рукі на месцы, з таго, што валяецца на вуліцы, можна зрабіць нешта цікавае. Было б толькі жаданне. Шкада, што мала такіх захопленых людзей. Будзе больш, у тым ліку і дзякуючы Кандратаву і яго калегам.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНЫ НУМАР 1.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, Т. ПАДАЛЯК, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, І. ШЧУЧЭНКА.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 24 31 92, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 74 13 92, Баранавічах: 7 26 02, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03; прыём рэкламы тэл./факс: 287 17 79, *e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by*, рэдактар рэкламнага аддзела — тэл./факс 292 04 52.

http://www.zviazda.by; www.zviazda.by/ru/main (*новая версія, якая тэсціруецца*)

e-mail: info@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».

Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.

Тыраж 33.840 Індэкс 63850. Зак. № 2755. Нумар падпісаны ў 19.30.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12